
Пятрусь Макаль



Пятрусь Макаль

ВЫБРАНЫЯ
ТВОРЫ
Ў ДВУХ
ТАМАХ



ТОМ
ПЕРШЫ



ВЕРШЫ

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ
ЛІТАРАТУРА»
1982

Бел 2
М 15

М $\frac{4702120200-108}{М\ 302(05)-82}$ 113—82

© Афармленне. Вершы, напісаныя пасля 1973 г.
Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1982.

АБСЯГІ СУЧАСНАСЦІ

Паэт немагчымы па-за сучаснасцю, але сучаснасць у кожным паэце адлюстроўваецца па-свойму. Свой аспект — у Петруся Макаля. У яго адчуваннях пераважае матыў бегу, гонкі, хуткасці, дынамікі: час імкне, свет імкне, чалавек імкне... Куды?.. Нашто? Якая мэта? Што ён пры гэтым губляе і што набывае? — вось, на мой погляд, кола пытанняў, на якія паэт хоча знайсці адказ. Думаю, не перабольшу, калі скажу, што творчасць Петруся Макаля, які працуе ў літаратуры ўжо больш трыццаці год, будучы сама па сабе з'явай самабытнай і непаўторнай, па якой можна меркаваць аб духоўных і эстэтычных пошуках цэлага пакалення.

Вакол кнігі «Акно» ў 1968 годзе на старонках штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» завязалася адна з вастрэйшых дыскусій 60-х гадоў. Паэта і некаторых яго літаратурных равеснікаў папракалі ў неарганічнасці майстэрства, у раз'яднанасці эстэтычнага і маральнага ў паэзіі. Трэба сказаць, што крытыка ў некаторых закідах мела рацыю. Недастаткова ўлічвала яна адно: паэзія 60-х гадоў актыўна, напружана, часам залішне шумліва, экспрэсіўна шукала — шукала новы змест і новыя формы.

Пятрусь Макаль — асабліва.

І «Першы след» (так зваўся першы зборнік паэта — 1955 год) засведчыў прыкметныя творчыя магчымасці аўтара. Моцнае ўражанне, напрыклад, зрабіў верш «Сустрэча з братам» (1952). У Закарпацце да помніка брату, што загінуў у вайну, прыехаў разам з сябрамі паэт — з паклонам «ад далёкіх гродзенскіх прысад».

А ён рукой нас прывітаць не можа:
Трымае зброю воіна рука,
Бо чуе ён
За морам брэх варожы
І палец не адводзіць ад курка.

Логіка думкі — сапраўды паэтычная. Ужо ў той час Пятрусь Макаль выявіў парыў да мастацкага пошуку, да ідэйнага ўзбагачэння сваёй паэзіі. За фактам стаяла паэтычнае абагульненне.

Добры верш «Гамоняць калоссі», прасторны свет адкрываецца ў ім:

Гамоняць калоссі,
Шугаючы хвалямі,
З блакітнымі высямі,
З сінімі далямі...

Гэта ўбачана паэтам, сялянскім сынам...

Нарадзіўся Пятрусь Макаль 25 жніўня 1932 года ў вёсцы Крушыняны на Беласточчыне. «Калі я прыгадваю маленства,— успамінае ён,— здаецца, чытаю кнігу з часоў старажытнасці. Ціснуцца адна да адной драўляныя хаткі з саламянымі стрэхамі, парослымі мохам. Насупраць кожнай — гумно... Галоўны сродак асвятлення ў дамах — лучына. Газавыя лямпы мелі толькі некалькі з самых заможных гаспадароў. Агонь здабывалі крэсівам — крэмень аб крэмень...»

Пісаць ён пачаў, будучы студэнтам Гродненскага педагагічнага інстытута, на пачатку 50-х гадоў.

Найбольшая ўдача паэта чакала там, дзе ён не адступаў ад жыццёвай праўды, грунтаваўся на ўласным асабістым вопыце, як, скажам, у вершах «Маё маленства», «Святло», «На горным схіле». Ён успамінае сваю радзіму — даверасnёўскую Беласточчыну, плач пастуховага ражка, дарогу, «якая вяла з бацькоўскай хаты ў батракі...». Пакаленне Макаля абпалена вайной, загартавана цяжкім пасляваенным часам. Здавалася б, не да вершаў было, але талент, жаданне расказаць аб перажытым бралі сваё, следам за першай кнігай выходзіць другая («Вятрам насустрач» — 1958 год) і трэцяя («Вечны агонь» — 1960 год). Аўтар пісаў пра тое, што і іншыя паэты ў той час; ён імкнуўся раскрыць у вершах велічны поступ нашай дзяржавы, барацьбу за мір, апяваў каханне. Так, у вершы «У паход» па сапраўднаму паэтычна перададзена пачуццё адказнасці, глыбока ўсвядомленае савецкім салдатам:

«Не, не ад ранца прыліпае кашуля да плячэй маіх. Сягоння цэлы свет, я знаю, абапіраецца на іх». Які ёмісты, эстэтычна напоўнены вобраз!

Новыя якасці мастацкай думкі накапліваліся спакваля. Існавала памылковае пераконанне (тады, а часткова нават і цяпер), што ў лірыцы, у адрозненне ад эпасу і драматургіі, не можа быць канфліктнасці. Аказалася, што гэта не так. Жыццё прымушала задумвацца, ставіць нялёгкія пытанні: «Гранітныя камені кропля дробіць — чаму ж глядзяць на кроплю як на дробязь?» Не цяжка зразумець, што гаворка ідзе пра чалавечую асобу.

Сапраўдная грамадзянскасць і бесканфліктнасць у лірыцы — рэчы несумяшчальныя. Ісціна гэта ўсё глыбей пацвярджаецца творчай практыкай паэтаў.

Служба ў арміі (1954—1956) — у сэнсе набліжэння да жыцця, пашырэння грамадскіх даляглядаў — дала паэту вельмі шмат. Пра гэта сведчаць вершы, што перадаюць «адчуванне локця», ідэйную і маральную вышыню абавязку, калектывізм, пяшчоту салдацкай суровасці. Паступова фарміравалася свая, унутраная тэма паэта, звязаная з павелічэннем адказнасці лірычнага героя, узбуйненнем яго асобы. Выспяванне паэтычнага майстэрства ішло адначасова з тымі сацыяльна-эканамічнымі зрухамі, якія адбываліся ў нашай краіне і якія выклікалі хвалю незвычайнай творчай актыўнасці савецкіх людзей.

Паэт праз асабістае імкнуўся перадаць грамадзянскі і духоўны рост савецкага чалавека, рост, якому спрыялі пашырэнне сацыялістычнай дэмакратыі, палітычныя, вытворчыя і навукова-тэхнічныя поспехі краіны. «Сёння нас да нябёс усё вышай зямля узнімае. Неба — мошчаны зорамі брук — хутка ляжа пад ногі прахожым...» Гэта — з кнігі «Вечны агонь» (1960). Былі там і такія радкі:

А я...
Я на зямлі стаю,
Зусім маленькі ростам,
Ды галавою дастаю
Да яснай зоркі проста!

Гэта былі першыя гады асваення космасу, пачатак «касмічнай эры», актывізацыя навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. У святле гэтых маштабных з'яў па-іншаму сталі бачыцца праблемы чалавека. Яны запатрабавалі ўнутранай перабудо-

вы, новай паэтыкі, больш таго — новай пазіцыі. І паэт пайшоў на гэта!

Пятрусь Макаль, дарэчы, валодае пахвальным уменнем маўчаць, не друкавацца, калі адчувае, што напісанае яго не задавальняе, што па-ранейшаму працаваць нельга, ці, правільней, не трэба. Ён, відаць, адчуў вычарпанасць ранейшай сваёй творчай манеры.

Станоўчы ўплыў на яго творчасць зрабіла вучоба на Вышэйшых літаратурных курсах у Маскве ў пачатку 60-х гадоў...

Новае ў яго не адразу было зразумета. Паэта, які спрабаваў асэнсоўваць складаныя падзеі часу, папракалі ў рацыяналізме. А сам ён думаў пра новыя дарогі сваёй творчасці... Яго адносіны да сусвету станавіліся ўсё больш зацікаўленымі, радок рабіўся больш энергічным.

Поспехі маладых літаратараў канца 50-х — пачатку 60-х гадоў у многім залежалі не толькі ад вывучэння самога жыцця, але і ад інтэнсіўнасці мастацкіх пошукаў, арганічнага засваення і ўдалага выкарыстання разнастайных формаў і прыёмаў раскрыцця ўнутранага свету чалавека. Паэзія асвойвае асацыятыўную вобразнасць, сімволіку, умоўнасць. Маякоўскі некалі казаў, што ў паэзіі ён змагаўся за канструкцыю замест стылю. «Канструкцыйны» пачатак не чужы і Макалю: ён можа гэта сабе дазволіць, паколькі абапіраецца на цікавую думку, на шчырае пачуццё.

Пасля выхаду чацвёртай кнігі «Круглы стол» (1964) крытыка ў адзін голас сказала: «Макаль стаў пісаць інакш». Яна мела рацыю. Шмат у чым змяніўся характар вобразнасці, узрасла яе канкрэтнасць, пластычнасць, больш ёмкімі сталі метафары паэта.

Адзін з арыгінальных вершаў кнігі — «Футбол» верш-прытча, узор шматпланавай лірыкі, з пэўным асацыятыўным напаўненнем. Перапоўнены стадыён паэт параўноўвае з раскроеным кавуном («і вось-вось, здаецца, як зярняткі, выпырснуць балельшчыкі з трыбун»), футбольны мяч нагадвае зямны шар. Ідзе гульня. І паэт выступае супраць бяздумнасці. Падобныя матывы хораша чыталіся ў кантэксце кніг Э. Межэлайціса, А. Куляшова, М. Танка, А. Вазнясенскага.

Узмацненне лірычнага «я» вяло за сабой паскораны працэс станаўлення яго творчай індывідуальнасці. З сённяшняга паэт рабіўся сучасным, бо выходзіў на важныя, сацыяльна важкія праблемы народнага жыцця, грамадскай свядомасці, на тое, што найбольш хвалявала чалавека.

Хацелася б выказаць адно назіранне: нягледзячы на характэрную для некаторых вершаў маналагічную форму, лірычнае «я», лірычны герой у паэзіі Макаля не заўсёды надзелены біяграфічнымі рысамі. Яго «я» ўвасабляе найбольш істотнае ў духоўным жыцці сучасніка, імкнецца змясціць у сабе турботы ўсёй планеты. У адным з артыкулаў пачатку 60-х гадоў паэт назваў наш век векам думкі. Такі вывад вынікаў з сацыяльнага аблічча часу: «Рэактыўныя хуткасці скарацілі адлегласці паміж кантынентамі і народамі. Аднак яшчэ больш акрэсліўся водападзел паміж двума сусветнымі лагерамі, паміж двума светамі. З аднаго боку — праграма небывалага росквіту грамадства. З другога — пагроза ядзернай катастрофы. У гэтым адна з галоўных супярэчнасцей эпохі. У гэтым крык часу. Быць ці не быць?..»

Праз своеасаблівасць часу паэт хоча зразумець яго веліч, поступ наперад, перадаць яго ўнутраныя працэсы, зрабіць іх сваім асаблівым адчуваннем. Так ён асэнсоўвае тэму кубінскай рэвалюцыі — свабоды, свята «з кабурой па пояску» («Кубінскі танец»).

Гаворачы ў адным са сваіх артыкулаў пра творчасць Аляксея Пысіна, П. Макаль перш за ўсё адзначыў маштабнасць яго паэтычнага мыслення, якая вынікае не з моды, а грунтуецца на імкненні асэнсаваць складанасць часу, памагчы чалавеку «адказаць на пытанне, як жыць, каб быць вартым свайго прызначэння». І ў самога Макаля ўсё мацней гучыць тэма чалавечага сумлення, тэма праўды («Сікейрас»), рэзка павышаецца каэфіцыент мастацкага абагульнення.

У гэты час быў напісаны цікавы па думцы верш «Мера», у якім аўтар беглым штрыхом робіць накід сучаснай панарамы свету, імкнецца ўлавіць адметнасць нашага «безразмернага» веку, як ён яго называе. Новым у зборніку «Круглы стол» было і тое, што ў ім поруч з творамі лірычнымі прагучалі вершы сатырычна завостраныя. Паэт узнімае голас супраць мяшчанскага быту, які скоўвае творчыя магчымасці чалавека (вершы «Хатні рай», «Абутнікі», «Юбілейнае», «Жалезны Адам»). Гэта тэма будзе замацоўвацца і паглыбляцца ў наступных кнігах і ў першую чаргу — у «Акне» (1966).

Кніга «Акно» (не зборнік, а менавіта кніга!) — рэч надзвычай цэласная, праблемная, падкрэслена антрапалагічная. Яе эпіцэнтр — чалавек, яго зямное існаванне, яго сучаснасць і будучыня. Вышыня крытэрыяў, ідэйны маштаб, мастацкая значнасць і маральная насычанасць абагульненняў,— усё гэ-

та тут было. Кніга гаварыла пра інтэнсіўнасць паэтычнага інтэлекту аўтара.

Жыццё, жыццё, кароткі твой рэгламент.
Як разгарнуцца тут на ўвесь размах?
Няўжо мы — толькі камяні ў фундамент,
Каб іншыя дабудавалі гмах,
Каб здолелі вышынны дах пакласці?
Але ж і мне
не потым, а цяпер
Таварыш бог,
адрэж акраец шчасця
І долю чалавечую адмер!

Міжвольна спыняешся на радках, якія, здаецца выдыхнуты паэтам адразу, за адзін раз: «Яснасці, яснасці, яснасці! — хочацца па-цвярозаму. Яснасці — чэснай уласнасці незакілзанага розуму». Або «Сплю ў каменным сховішчы кватэры. Але што там бухае, як цэп? Хто так гулка стукае ў дзверы? Гэта ты, пасланнік поля — хлеб». У індывідуальным вопыце паэта адлюстроўвалася душэўная прага яго сучаснікаў, «грамадзян XX стагоддзя». У кнізе «Акно» ён вядзе страсную спрэчку з сабой учарашнім. І выйграе яе паэт сённяшні! Свет наш не настолькі ўладкаваны, хоча сказаць ён, каб сядзець склаўшы рукі. На гэтым грунтуецца яго душэўная актыўнасць: «Я, сапёр, спяшаю, каб у час абясшкодзіць беды, як тарпеды, што здаля нацэлены на нас». Інтымнае і грамадскае ў кнізе нельга размежаваць, настолькі яны сплаўлены.

Што П. Макаль выдатны майстар верша — несумненна. Ён, скажам, бездакорна валодае самай разнастайнай і багатай рыфмай:

Хвала напятай хвалі, што пяе!
Хвала ўзбярэжным дзюнам,
што як горы!
На пляжы спляжу немачы свае
І змору патаплю ў бяздонным моры.

Рыфмуюцца не толькі паралельныя радкі, але і словы ўнутры радка, верш набывае выключную гнуткасць і музычнасць. Прадметы паўстаюць пластычна, аб'ёмна, і, хаця аўтар амаль не адмаўляецца ад строгіх класічных рытмаў, верш яго не выглядае старамодна, бо само душэўнае багацце

мастака, яго паэтычнае мысленне ў аснове сваёй вельмі сучаснае.

У 60—70-я гады можна было назіраць, як пашыраўся творчы дыяпазон Петруся Макаля. Ён звяртаецца да драматургічнага жанру: п'есы П. Макаля «Адчыніце, казляняткі!», «Дай вады, калодзеж», «На ўсіх адна бяда» (яны напісаны ў вершах паводле фальклорных матываў) з поспехам былі пастаўлены на сцэне Беларускага тэатра юнага гледача і іншых тэатраў краіны. Супрацоўнічае паэт з кампазітарамі: разам з Я. Глебавым створаны араторыя «Запрашэнне ў краіну маленства», шэраг песень.

Мастацкае майстэрства надта спатрэбілася Макалю ў перакладчыцкай працы. Буйнейшыя яго работы — анталогія вершаў сучасных славацкіх паэтаў «Татры пяюць» (1976) і кніга Міраслава Валека «Крылы» (1979), якія атрымалі станоўчую ацэнку ў друку: Макаль як перакладчык умее глыбока пранікнуць у дух першакрыніцы, перадаць яе мастацкую своеасаблівасць.

У 1979 г. яму прысуджана Літаратурная прэмія імя Аркадзя Куляшова. І невыпадкова: сёння ён працуе асабліва інтэнсіўна. Вельмі сучаснымі і таленавітымі кнігамі ўяўляюцца мне зборнікі «Дотык да зямлі» (1975), «Поле» (1978), «Смак яблыка» (1981), якія сведчаць, што паэт трымае руку на пульсе жыцця. Яны нагадваюць мне адно са шматлікіх метафарычных вызначэнняў паэзіі, якое сцвярджае, што паэзія — гэта «адчуванне зямлі босай нагой».

«Дотык да зямлі» — выраз гэты ўзяты паэтам у яго вобразным, полівалентным значэнні, але абапіраецца ён на свой пачатковы, самы непасрэдны сэнс, укладзены ў звычайныя словы:

Есць словы, што прасцей, чым двойчы два:
Зямля,
Вада,
Паветра
І трава...

Што ж гэта — паэзія простых слоў, простых рэчаў?

Так. Але паэт — як і яго сучаснікі — па-новаму адчуў гэтыя «рэчы», іх каштоўнасць і значнасць у святле вядомай супярэчнасці нашых дзён:

Ракеты і аўтамабілі
У нас адлегласць узялі,

А мы, здаецца, разлюбілі
Хадзіць нагамі па зямлі.

Паэзія гэтых радкоў падказана і нашым днём і памяццю. Нельга не заўважыць, што найбольш удалыя вершы Макаля будуюцца на арганічным сінтэзе сучаснага і мінулага, калі час паўстае, як частка яго жыццёвай і духоўнай біяграфіі. «Я з вёскі» — прызнаецца ён у адным з вершаў: «Я выйшаў з вёскі, выйшаў з баразны,— і ворывам мае далоні пахнуць». Паэт вяртаецца да зямных вытокаў свайго лёсу. Памяць праз гады захавала пах сырадою, што быў хлебам дзіцячых год. Але разважанні паэта не абмяжоўваюцца аднымі ўспамінамі. Сёння, калі «трава жылплошчу аддае бетону» і гудок глушыць галасы птушак, калі штучным шляхам сінтэзуецца нават малако, ён сцвярджае першапачатковую натуральнасць і свежасць быцця, яго неабходнасць у светаадчуванні сучасніка. У паэзію прыходзяць вобразы нівы, баразны, плуга, хлеба, нават вобраз каровы, з якой ён звязвае «млечны шлях» свайго лёсу. Але гэта толькі адна з граней вялікай тэмы «дотыку да зямлі» ў асэнсаванні паэта. Грань вясковая, звязаная з яго духоўна-«экалагічным» роздумам над «фатальнай» цвёрдасцю бетону, які бярэ ў свой шэры палон планету. Гэта думка мае шмат адценняў, матываў, якія гучаць па-грамадзянску пераканаўча і наступальна. Матыў, так характэрны сучаснай паэзіі: «У травы забіраюць правы — хіба гэта не бачыце вы?»

Гаворачы пра першапачатковыя, так сказаць, каштоўнасці, бласлаўляючы «зялёны бунт», «зялёны ўзлёт травы», паэт далучае нас да духоўных крыніц эпохі. «Стаім у чарзе за небам, як у вайну за хлебам».

Свет «простых слоў» разглядаецца ў самых разнастайных планах, у спалучэнні, так сказаць, матэрыяльнага і духоўнага. Адкрываецца складанасць свету і сцвярджаецца яго гарманічнасць: «Калі б, зямля, ты не дала мне хлеба, ці змог бы дацягнуцца я да неба, аб зорны келіх губы апячы?»

«Дотык да зямлі!» — формула грамадзянскага мыслення паэта, формула яго рэалізму, скіраванага супраць «паветраных замкаў», супроць тых, хто «ману з туману лепіць». «Страцім сілу, адарваўшыся ад зямлі»,— турбуецца ён.

Думка аб несумяшчальнасці грамадзянскасці і бесканфліктнасці вельмі характэрна для сённяшняга Макаля. Ён — майстар канцэптуальнага верша, дзе выяўляецца не проста душэўны жэст паэта, а разуменне жыцця.

Сацыяльная-філасофская аснова яго паэзіі — шырокая. Ён — востра сучасны, праблемны. Дэталі і падрабязнасці вясковага побыту часцей за ўсё патрэбны яму для асэнсавання больш агульных з'яў жыцця. Паэта хвалюе чалавек, яго быццё і ўзаемаадносіны са светам, накіраванасць яго актыўнасці, яго будучыня. Якраз менавіта гэтыя матывы складаюць змест напружанага роздуму. Своеасаблівасць яго вершаў у тым, што яны спалучаюць публіцыстыку з філасафічнасцю. Гэта надае ім эстэтычную аб'ёмнасць, глыбіню. Часта звяртаецца ён да духоўнага вопыту народа.

«Шчаслівейшы не той, хто жне, а той, хто сее»,— нагадвае ён даўнюю сялянскую мудрасць, хаця і ведае, што адлегласць ад сяўбы да жніва іншы раз бывае даўжэй за чалавечы век. Але сеяць трэба. Паэт славіць урадлівасць зямлі, ніву, поле, якія насычаны для яго вялікім духоўным сэнсам.

Пластыка яму таксама не чужая. Але не ў ёй справа. Яна падпарадкавана больш агульным паэтычным ідэям. Макаль здольны ўзбуйняць рэчаіснасць, бачыць касмічныя рысы ў фарбах асенняга саду: «Адсвечвае галактыкаю сад, у барвы шчодрай спеласці адзеты». Ён — майстар ёмістай, маштабнай метафары. Славячы важкасць «пладоў, зярнят і дум, цяжкіх ад сонца», паэт бачыць, як

Сам космас,
быццам просьбіт,
басанож
Сыходзіць ноччу да Зямлі з паклонам,
Дрыготна падстаўляе зорны кош
Пад яблыкі, што падаюць са звонам.

Садовая груша — звычайная слуцкая бэра — уяўляецца яму малой планетай. Паэт настойліва імкнецца да маштабных вобразаў, смелых абагульненняў, у якіх сінтэзуецца дзень сённяшні з глыбокімі пластамі народнага вопыту.

Высокую паэзію адкрывае ён у вобразе свайго зялёнага друга — лесу. Наш лес — наша гісторыя. У ім адлюстроўваецца характар народа, яго мужнасць, высакародства. У вайну пад шматпавярховыя лясныя шаты лезлі з агнём чорныя карнікі. Але лес выстаяў. У ягонай жывіцы і дасюль стынуць кулі. «Мой лес — мой лёс»,— кажа паэт. У такой вось рэльефнасці вобразаў, метафары — аснова паэтыкі Макаля. Такія паняцці, як поле, лес, хлеб, бетон, трава — ён разглядае

буйным планам, у багацці іх сацыяльных сувязей і жыццёвага зместу.

Бачна вялізарная цяга паэта да падкрэсленай метафарычнасці, прытчавасці, мастацкай умоўнасці. Гэта вельмі відаць у вершах «Прас», «Маналог сабакі», «Песня заваднога салдаціка», «Пласцінка», «Кумір» і іншых. Умоўнасць вобразнасці паэта — пры ўсёй яе нечаканасці — не супярэчыць зместу, бо накіравана на асэнсаванне рэальных з'яў. Агульны напрамак яго творчых пошукаў, яго маштабнага паэтычнага мыслення — плённы. Сумяшчаючы малое з вялікім, звычайнае з незвычайным, ён па-свойму абжывае свет, дабіваецца жаданага выніку.

Майстэрства паэта пастаянна расце. Але яно — не самамэта, багацце сродкаў мастацкай выразнасці нараджаецца неабходнасцю перадаць паўнату зместу, драматызм жыцця:

— Вы адкуль?
— Мы — ад куль.
Мы — з вайны.
Мы — званы.
Мы — дамы.
Мы — дымы.
Каміны.
Камяні.

Прыкметай сучаснага мастацкага мыслення Петруся Макаля стала філасофскае пранікненне ў сэнс падзей, псіхалагічнае даследванне характару сучасніка. У светаадчуванні паэта спалучаецца сацыяльнае і асабістае, зямное і «нябеснае», матэрыяльнае і духоўнае, эмацыянальнае і інтэлектуальнае. Свет яго ідэй значна шырэйшы.

Не выпадкова, што паэзія Петруся Макаля знаходзіць сваіх прыхільнікаў не толькі ў нашай рэспубліцы, але і далёка за яе межамі. Творы паэта выдаваліся асобнымі кнігамі ў Маскве, Кіеве, Браціславе, перакладаліся на англійскую, балгарскую, мангольскую, польскую, французскую, чэшскую і іншыя мовы свету.

Пятрусь Макаль і сёння — у нястомным пошуку: ён паспяхова асвойвае абсягі сучаснасці, імкнецца заваёўваць усё новыя ідэйна-мастацкія вышыні.

Уладзімір Гніламёдаў

З кнігі «КРУГЛЫ СТОЛ»

(1961—1964)

* * *

Мае радкі —
не лесвіца ў вякі,
Што недзе за туманнай рысай неба.
Мае радкі —
працяг маёй рукі,
Якой мне столькі рук паціснуць трэба!

Усім, чыёю ласкай даражу,
Паспеў сказаць я толькі:
— Добры ранак!..
Мне не заснуць,
Пакуль я не скажу:
— Дзень добры!..
— Добры вечар!..
і
— Дабранач!..
Я тупаю
па лесвіцы радкоў —
Маёй адзінай лесвіцы службовай —
Да вас, як да братоў і дружбакоў...
Сяброўства,
Кожны дзень мой завярбоўвай!
Я твой — пакуль пульсуе ў словах кроў.
Да самай кроплі. Да апошняй рыскі.
А будучыня?..
Гэта — дом сяброў,
Дзе ворагі пазбаўлены прапіскі.

АДБІТАК ПАЛЬЦАЎ

Таму, хто ступіць на заморскі бераг,
Адолеўшы крутых стыхіяў плынь,
Загадваюць:
на дзесяці паперах
Адбітак пальцаў, як пячаць, пакінь...

З дрыготкіх зрэнкаў — прагавітых джальцаў
Здыміце акуляры, слепакі!
І перад вамі, як адбіткі пальцаў,
Паўстануць буйна ўсе мацерыкі.

Глядзіць у затуманеныя воды
З амерыканскіх тлумных берагоў
Адбіткам пальцаў статуя Свабоды,
Аглухлая ад звону ланцугоў...

Калі б была ў яе на выезд віза,
На востраў Кубу адплыла б даўно...
Адбітак пальцаў —
гэта Монна Ліза
І Рэмбрандта важкое палатно.

Адбітак пальцаў — гэта ўсё жывое:
І нот шматкроп'е. І ракет дымы...
І нават Млечны Шлях над галавою,
Куды ступаем па ступеньках мы.

Хай будзе ўсім дапытлівым вядома,
Адкуль да зор узлёт мы пачалі:
Мая далонь — пляцоўка касмадрома,
З якой увысь стартуюць караблі!

Мая далонь у стоме, бы ў затоне.
На ёй, нібы вяршыні, мазалі.
І, як па карце, па сваёй далоні
Прарочу я наступны лёс зямлі.

Калоціць страх сусветную арханку:
Ламаючы счарнелы лёд акоў,
Дзяржаўна ўздымуць золак сцяга ўранку
Пяць дружных пальцаў — пяць мацерыкоў!

РАДАСЦЬ

Радасці,
Нібыта радугі,
Хочацца кожнаму з нас.
Не той, што ў вясёлым градусе
Нехта знаходзіць падчас.
Хочацца радасці рознай —
Ад водару кветкі роснай,
Ад бохана свежага хлеба,
Ад сонца, што на паўнеба...
Стомленай радасці волата —
Ад частых і гучных сустрэч
Кавадла і цяжкага молата,
Што родзяць нарог і меч.
Радасці ад спаткання
Маёй і тваёй рукі,
Якое ў нябыт не кане,
Якое паўтораць вякі...
Радасці той, што не месціцца
Ў цесных цяснінах кватэр
І далятае да Месяца
Праз абцугі атмасфер!

КРУГЛЫ СТОЛ

Паклон табе, святочны круглы стол,
Калі цябе ў палон бяруць тварожнікі
І крэслы па арбіце наваколл
Абступяць, як планету спадарожнікі.
Хвалю тваё паседжанне, радня!
І хто з нас за сталом не пасталее,
Дзе маці — самым мудры старшыня?..
Такога б Генеральнай Асамблеі!
Сыны, нявесткі, дочкі і зяці —
Пасламі Наднямоння і Чукоткі.
Клубок праблем разблытвайце ў жыцці,
Не апячыце губ — бярыце сподкі!
Адна сям'я і зблізку і здаля,

Яднае Ўсход і Захад форум братні.
Ці ж не магла б вось так і ты, Зямля?
Ты ж круглая —
амаль як стол мой хатні!
І хто з людзей не ахаў,
з-за крыла
Убачыўшы зямную сервіроўку,
Нас да свайго вялікага стала
З любых вышынь яна пацягне зноўку.
Як з місак, дым з вулканаў паўстае,
Бунтуе хмель у гронках — шклянак просіць.
Сурвэтак снежных пікі на стале
Яго высокасць сам Каўказ узносіць...
Эх, страсянуць бы так
За каўняры
Тых, што гатовы ў хцівасці зубастай
Перакульнуць нагамі дагары
Цябе, наш стол, каб толькі больш зграбастаць!
Ты ж не ўпадзеш ад добрых спраў і страў
Пад вечнаю сваёй лампадай-поўняй.
І слодычы і гаркаты прыпраў
Усім землянам выдай мерай поўнай.
Сям'я людская, думай жа пра стол,
Які прыбраць па-гаспадарску трэба.
Няхай штодзень на стол,
як на прастол,
Каронаю ўзыходзіць бохан хлеба!

ДАРОГА ДА ЗОР

Гэта не сон летуценны,
Не казка,
Гэта не мроя старога фантаста.
Недзе ў бяздонных глыбінях сусвету
Вымпел чырвоны праносіць ракета.
Мы сонцы, што згублены ў змроку, знаходзім.
Дык будзь жа ласкавым, халодны прастор!
Не дні і не месяцы —

Тысячагоддзі
Ідуць неўміручыя людзі да зор.
Дасталася дорага гэта дарога —
Крутая дарога да неба з зямлі.
Кастры інквізіцыі,
Краты астрогаў
На ёй,
Як трапічныя джунглі,
Раслі.
На плошчах,
Дзе вогнішчы змрочна трымцелі,
Іменем бога раўлі званы...
Спаліць чалавечыя крылы хацелі,
Але, згараючы нават, ляцелі
Дымам нястрымным да зорак яны!
Гэта не сон летуценны,
Не казка,
Гэта не мроя старога фантаста.
Недзе ў бясконцых прасторах сусвету
Вымпел чырвоны праносіць ракета.

ПЧАЛІНЫЯ СОТЫ

Паклонам першым і паклонам сотым,
П'янеючы без хмелю пакрысе,
Я кланяцца гатоў пчаліным сотам,
Мядовай іх спакуслівай красе,
Не літасцю багоў падараваная,
Турботай і работай —
вось яна,
Уся з маленькіх сонцаў змураваная
Майстрамі пералётнымі сцяна.
Паблісквае бурштынавымі блёсткамі
Праменны мур
пчалінае радні,
Якая мёд з калодзежаў пялёсткавых,
Нібыта з шахтаў,
Цягне дзень пры дні,
Спякоты спадарожніца бухматая —

Нястомная шукальніца-пчала...
Дык гэта ж ёй сама прырода-матухна
Усё сваё цвіценне аддала!
Запоўняць сонцам соты, нібы літары,
Працавікі пагоднаю парой,
А там і трутняў
з дому дружна вытурань:
За гэта —
ўвесь пчаліны рой —
гарой!

У ЛЕСЕ

Дрэвы — нібы дзяды:
Сівізна на галінах кашлатых.
Я прыходжу сюды,
Як на сход мудрацоў барадатых.
На мяне, як на дзіва,
Глядзяць яны зверху заўсёды.
Бо на сходзе адзіны я
Грамадзянін безбароды.
Я прыходжу паслухаць
Світальную мудрасць дубровы.
На мяне пазіраюць
Бязмоўна не дрэвы, а дровы —
Страявыя стралкі,
Што страляюць у печах спрадвеку,
Што ахвярна гарань,
Каб аддаць цеплыню чалавеку.
На мяне пазіраюць
Маўкліва цымбалы, якія
Не паспелі рассыпаць
Напевы свае трапяткія.
На мяне пазіраюць
Крамяныя мачты —
не сосны.
Старшынствуюць на сходзе
Не лютыя зімы, а вёсны.
Лёгка дыхаць на сходзе:

Тут клімат, як кажуць, здаровы,
У сяброўскім суседстве —
цымбалы,
і мачты,
і дровы.
Ваяўнічыя вёсны
Тут гнёзды свае заснавалі.
Спеў птушыны
з галінаў
Навечна дрымоту абтрос.
І шуміць, і гамоніць
пра мірнае суіснаванне
Асамблея зялёная
сосен,
дубоў
і бяроз.

ПЛАТА

На лісцях — крывавыя кроплі.
Гэта іх восень параніла.
Расплачваецца прырода
За тое, што ўлетку буяніла.
За тое, што травы з праталіны
Цягнуліся да навальніцы
І пляскалі прывітальна
Грому і бліскавіцы,
Што ў маі ўзрываў пупышкі
Зялёны агонь бунтоўны,
І дзынкалі, быццам кілішкі,
Пялёсткавыя бутоны,
За тое, што ў спёку часалі
Галіны, як грэбнем, хмары
Ды прыкрывалі часамі
Зябкія мокрыя твары,—
Час, як гандляр суровы,
Прымае за квецень плату:
Сарваных лістоў галовы
Злятаюць, нібы на плаху.

* * *

Зямля, як ад сухотаў, сохла,
Лінялі
Далі
        з кожным днём,
Калі яго высокасць сонца
Не грэла,
            а пякло агнём.
Гароду, саду, ніве, поплаву,—
Буянству фарб усіх дзяржаў
Схаваны ў промнях
                        колер попелу,
Самадзяржаўна пагражаў.
Ах, сонца!
Праз твае капрызы
Пад вартаю атрутных траў
Пасаджаны,
Нібы на прысак,
Бурак чырвоны паміраў...
Ды раптам перуны правохалі —
І лівень адшумеў і сціх.
Грымоты сонца не спалохалі,
Бо сонца нарадзіла іх.

* * *

Які цырульнік — сонца! Я гляджу,
Як рунь тугую завівае чубам...
Зямля, счарнеўшы, сохне па дажджу,
Нібы жанчына верная па любым.
Патрэскаўшыся ўпоперак і ўдоўж,
Яна вады маршчынай кожнай просіць.
Але аглух неўтаймаваны дождж —
Яго вятры па іншых нівах носяць.

ЗЯМЛЯ

Агорклая ахова палыну,
Які пад ветрам калыхаўся цяжка,
Стагоддзямі трымала цаліну —
Счарнелую самотную манашку.

Зямля, нібы без рошчыны дзяжа,
Нясілела ад пахаванай сілы.
Нарог, твайго ратоўнага нажа
Яна маўкліва з году ў год прасіла!

І толькі я — яе спрадвечны друг —
Ад нематы вылечваю жалеза,
Каб, ачуняўшы, плуг,
Што быў аглух,
Палын пад корань рэзаў, як гарэза.

Прышпорваў я сталёвага каня,
Што бушаваў, нібы гарачы кратар.
Дымок, як грыва, трапятаў штодня,
Ды чмыхаў паздраваты радыятар.

Гудуць і сёння рукі ад руля...
Ды глянь: набухшы ў кожнай баразёнцы,
Цяжарная ўраджаямі ралля
У павітухі запрашае сонца!

ПАВЕТРА

Людзі трывожацца ды бядуюць,
Сняцца ім атамныя грыбы.
Гора гадуюць і сховы будуюць
Моцы сваёй выбуховай рабы.
Адны бунтуюць і пішуць петыцыі
Да мудрасці і да галоўных галоў.
Другія наладжваюць рэпетыцыі
Пагібелі свету:
— Розум далоў!..

І вось ужо атам з прывязі спушчаны,
У падзямеллі нас гоняць грамы...
А дзе схавацца Шэкспіру і Пушкіну,
Што засяляюць тамы,
як дамы?
У чорных калысках, што ў друзе пахованы,
Не зведаўшы музыкі і святла,
Слепнуць Гамеры і глухнуць Бетховены...
Ты джунглямі ўзрываў, Зямля, зарасла!
У пыле і попеле тлеюць акропалі,
Абшнарваюць шчыліны ўсе і куткі,
Быццам жандары, атрутныя кроплі:
Ці не ўцалелі паветра шматкі?
Нехта ўцячэ ад хваль выбуховых,
Ды пазайздросціць мёртвым жывы...
Вы,
што кратамі стаіліся ў сховах,
Чым жа дыхаць будзеце вы?
Каб суднае атамнае ідовішча
Свет не ўцягнула ў бяздонны вір,
Будуйце, зямляне, адно бамбасховішча —
Мір!

ВЯЗНІ

Іх упіхнулі штыкамі салдаты
У падзямелле,
Бы ў мех каменны.
Не здарыцца цуду.
Не выкруціць краты.
І галавой не выламаць сцены.
Расталі нават іх твары ўночы,
Постаці толькі цямнелі рухома.
А, пэўна, былі ў іх сумныя вочы,
А, пэўна, былі ў іх любыя дома.
На голас адчаю ніхто не падаўся.
Сціскала ад нейкай нямоглай самоты.
І раптам, нібы перуном па дасе:
— Ідуць самалёты!

— Гудуць самалёты!
Такога не знойдзеш і ў казачным цудзе —
Ці чулі вы,
                    ці бачылі людзі
І камуніста і камсамольца,
Якія на неба,
                    на неба моляцца?
Не пацямнелыя і ў цямніцы,
Не ачмурэлыя і ў бяссіллі,
Не літасці —
                    грому і бліскавіцы
Чатыры бязбожнікі ў неба прасілі!
О, разрадзіся гневам раптоўным,
Праведнай бомбай, агнём ратоўным,—
Прасілі стаічна,
                    а не ганебна
Чырвоныя вязні ў чырвонага неба.
І выбухі столь скаланулі грымотна —
Зямля загайдалася, як арэлі.
І, перасмыкваючыся дрыготна,
Агнём языкатым «тыгры» гарэлі.
Трэскала неба ў хмарах ірваных.
Бомбы ахвяраў не выбіралі.
Чацвёра шчаслівых,
                              жыўцом пахаваных,
Пад роднымі крыламі паміралі.

ЛЯ АБЕЛІСКА ПЕРАМОГІ

Спыніўся час.
                    Свінцу смяротны россып.
Прырос к плячу дрыготкі аўтамат...
Гудуць гады,
Як паязды,—
                    узростам
Я перарос цябе, старэйшы брат.
Не гаснучы,
З агню фантанчык хвошча
Перад гранатай, што заносіш ты.

Рывок рукі,—
І ў скверыку на плошчы,
Як выбухі зялёныя, кусты...
Дзяўчынка,
З гора пачарнеўшы, кленчыць
Каля глухіх і нерухомых пліт.
Граніт маўчыць,
Граніт крычыць
І енчыць,
Гатовы грымнуць,
Нібы дынаміт.
Над болем ран,
Якія помсты просяць,
І над застылым стогнам нематы
Зрашэчаны баямі сцяг узносяць
Мае — навекі юныя — браты.
Хоць скамянелі самі ад знямогі,
Іх позіркі — ад Эльбы навылёт!
Яны яшчэ ідуць да перамогі...
А перамозе нашай столькі год.

СІКЕЙРАС

Мексіка. Міхіко. Камера.
Свеціцца вязень, як свечка.
Не ў Лету, а ў камеры з каменя
Канула сярэднявечча.
Як пазыўныя, выстукаў
Фрэскі аловак нядрэнны...
Цемрыва?
Маніце! —
Выстаўка
У рамцы сценаў турэмных!
У вочку замочным — з акенцаў —
Промень, як ключ, завязнуў.
Камера — рэзідэнцыя
Вялікай дынастыі вязняў,
Што пішуць бяссонна і сошна...

Калі ж не дастаць рукамі
Да палатна і сонца —
Пішуць на сценах камер!
У мастакоў за кратамі
Фарбы, як хлеб, раптоўныя
Штоноч пацукі раскрадвалі —
Сааўтары іх гвалтоўныя.
Аўтографы вязняў адбіты
Тымі крутымі гадамі
На сценах усіх маабітаў
І ўсіх на зямлі майданакаў.
Што ж вас трасе ліхаманка,
Ямбы мае і харэі?
Я, нібы росчырк маланкавы,
Мексікаю хварэю.
Сонца —
мой доктар —
над светам
Схіляецца: — Мексіка, дзе ты?
Але глухія к паэтам
Урады і прэзідэнты.
Астрожнымі бразгаць брамамі
Піратам і імператарам,
Пакуль на зямлі не абрана
Праўда адзіным дыктатарам.
...Трымціць у акенцы Сікейраса
У барвах іржавых крапін
Месяц бліщчастай сякераю,
Вышчарбленай аб краты.

КУБІНСКІ ТАНЕЦ

Роем выпырхнуць гаванцы
З хатніх сотаў нездарма.
Тут, на плошчы, ставіць танцы
Рэвалюцыя сама.

Ногі — росчыркам маланкі,
Як гару крутую з плеч,

Ношу ў сто мільёнаў янкі
Страсянуў кубінец прэч.

Румба,
румба,
румба,
румба:
Стук абцасаў — гул званоў.
Адкрываем без Калумба
Мы Амерыку ізноў.

Ходзіць востраў-непаседа.
Навакол — кругі, кругі.
У паўночнага суседа
Падмывае берагі...

Скача Куба — вецер хвошча
Над расплаўленым ільдом,
Ад штуршкоў падземных поштак
Скаланае Белы дом.

Толькі бліскае нямеркла
Кабура на паяску,
Як Паўднёвая Амерыка,
Што ў планеты на баку.

Ды глядзі — пусціўся ў танец,
Атуліўшы Кубе стан,
Малады заўжды паўстанец —
Барадаты акіян.

Толькі лёскат ураганам:
Сцеражыся — апячэ!..
У абдымку з акіянам
Хто закружыцца яшчэ?

Збоч
паўзе туман калматы,
Забінтоўвае прасцяг,
Ноч,
як Злучаныя Штаты,
Расхінае паласаты,
Чарнаваты зорны сцяг.

Ці пе зноў у моры змова?
Да цябе з мацерыка
Так і цягнецца праз мора —
Не дацягнецца рука.

Ім цябе на стол бы, Куба,
Востраў Куба, кавы кубак...
Ах, як губы апяклі
Вострай ежай каралі!..

ПЛОШЧА МАЯКОЎСКАГА

Брытагаловыя крытыкі,
Мудрыя,
Нібыта коскі,
На вас фанабэрна прыкрыквалі
За тое, што вы —
Маякоўскі.
— Не дойдзе!..
Прарокі дзьмулі
У меднастволыя глоткі.
Абваляцца,
Як хадулі,
Зламаных радкоў усходкі,
На паўдарозе дзесьці
У Леце бяздоннай утопяцца...
Знямелых пракракаў дзеці
Сёння на плошчы тоўпяцца.
Прыйшлі
З вучнёўскімі сшыткамі,
Прыйшлі
Са сваімі першымі
Немудрагеліста сшытымі
Каструбаватымі вершамі,
Зняўшы з чупрыны воблака —
Белую кепку волата,—
Паэт прывітальна кінуў
Недзе на шпіль вышынны...

Хлопцам харошым і розным
Да вас
— ну, нібыта да полюса! —
Нават і самым рослым
Не дацягнуцца да пояса...
Ветру аддаўшы ўпэўнена
Свае грывастыя космы,
Яны прачытаюць напеўна
Пра пацалункі і космас.
І гэтак балюча згадзіцца,
Што бронза —
глуханямая...
Я чую — сама навальніца
Голас ваш пераймае.
Між воблакамі дрыготкімі,
Якія пярун калыша,
Ламаным радком,
усходкамі,
Вершы маланка піша.
Гром, нібы ў бубен, бухае
У купал неба маскоўскага.
Зямля, заміраючы, слухае
Раскацісты бас Маякоўскага.

ПЕРАД КАНЦЭРТАМ

Зіма, на твой абрус вялізны
Нагамі боязна ступіць.
Нібы памытая бялізна,
Сняжок някрануты рыпіць.
Узбоч дамоў
І клёнаў вычварных,
Узбоч дымоў, у неба ўвінчаных,—
Ідзеш,
На ўвесь сумёт падрослая,
У каўняры ўтапіўся нос.
Недасягальная, харошая,—
Няўзнак ні вецер, ні мароз!
А мне ля касы ў зале вузенькай,

Дзе сумятня і таўкатня,
Аматары класічнай музыкі
Бакі камячылі паўдня.
Я місію цяжкую выканаў,
Я так стаю,
нібы пяю:
Я толькі што ў акенца выкінуў
Амаль стыпендыю сваю!
Як музыку, што ў нотах схована,
Я два білецікі нашу.
Спяшаеш ты спаткаць Бетховена,
А я пальчаткай варушу.
Табе пад чорненькія боцікі —
Сняжынкі, быццам з вербаў коцікі.
Сняжынкі —
знічкі міжпланетныя —
Усе срабрыстыя, не медныя!
Раяцца, скарбы несучы...
Тапчы, тапчы!

СУСТРЭЧА З БАХАМ

Галіне Раеўскай

Дзень добры, Бах! Ну вось мы і знаёмы...
Твой бас густы крануў да нематы.
Падобны да прыручанага грому,
Па клавішах аргана,
нібы з дому,
Па лесвіцы, ка мне злятаеш ты.
Па клавішах —
з мінуўшчыны ў сягоння —
Разлёт цыбатых быстракрылых рук.
За радасцю няспынная пагоня —
Падковы шчасця цокаюць аб брук...
Сярод людзей, сярод аглухлых статуй,
Вандруючы нястомна з веку ў век,
Пасуцца гукі, быццам дзікі статак.
Злаві і забратай іх, чалавек!

Патрэскваюць кастры, што паляць кнігі,
Гучыць, як крык, бунтоўны скрып пяра,
Грыміць вада, якая крышыць крыгі,
Рука раба шукае тапара!
Звініць, нібы надзея, ключ астрожны
У цішыні, распятай на крыжы...
О гукі!.. Утаймуй іх пераможна
І да лінейкі нотай прывяжы!
...Мільгаюць гулкіх клавішаў ступені,
З зіхотна-чорным снежна-белы ўзбоч,
Чаргуюцца, як водсветы і цені,
Як на арбіце зорнай дзень і ноч.
І ты палоніш не дзяржавы —
сэрцы,
О музыка — вышэйшая з улад!
Не пахіснецца з часам на паверцы
З'яднаных гукаў чалавечы лад.
Тут Бах — нязменны старшыня ва ўрадзе.
Прад ім —
пляччо кранаецца пляча —
Міністр і муляр у адзіным радзе,
У самым чуйным ранзе слухача.
Дзень добры, Бах! — набат сярэднявечча,
З бяздоння ночы к сонцу ўзлёт круты!
Як доўга мы ішлі на гэта веча:
Я — трыццаць год,
І тры стагоддзі ты.

* * *

Трэшчына зноў.
Не зладзім.
Сердаваць на мяне не трэба.
Сустракаюцца ж на даляглядзе
Нават зямля і неба.
Хоць сягоння пачціва ізноў я
Называю цябе харошаю,
Ні надзеі на сваркі новыя,
Ні пяшчоты ў цябе не выпрошваю.

Можаш толькі мяне вінаваціць —
Пакаранне прыму
любое.
Не памру ад тваёй нянавісці,
Калі не памёр ад любові.
Я ад злосці зубамі хрустаю,
Што быў гэтакім спраўным і ціхенькім
Тваім застольным хаўруснікам
І вельмі дакладным будзільнікам.
Я развітваюся з табою,
Як з нялёгкай дарожнай ношаю,
Без тугі,
без адчаю,
без болю.
Заставайся ж,
мая харошая!
Са сваімі губамі-вішнямі,
Са сваімі рукамі ўвішнымі,
З марай сваёй,
як хата,
Што для мяне цеснавата.
З ласкай хітрага звера-ліса,
Што да плеч тваіх прытуліўся
І якому, папраўдзе, ні трошку
Я раўніва цяпер не зайздрошчу.
Я выходжу, як човен, з туману,
Аддаляючыся ад кручы.
Ты хочаш, каб быў я рахманы,
А я —
калючы.

* * *

Ад зябкасці золкай сутулячыся,
Спяшаюся дзень пры дні
Да пакаёвай утульнасці
Ад вулічнай таўкатні.
І ад дажджу, што гоніцца
За мной, як цыбатая конніца.

Я старшынствую ў доме
На шматвяковым сходзе.
З паліц, нібы з крэсел, томікі
На стол да мяне сыходзяць.
Гётэ і Маякоўскі —
Прамоўцы нямоўчныя — во яны!
Старонкі, нібыта войскі,
І плугары, і воіны.
Кідаю ў пашчу акурак
Акамянелай акуле.
А дождж на вакно маё косіцца.
Стукаюць кроплі, як кулі.
Патрэскаваючы, як дровы,
Аб нечым далёкім-далёкім,
Міргае прыёмнік нервова
Усёвідушчым вокам.
...Недзе ўраган пад Калькутаю.
Над Джонстанам — атамны выбух.
Стукае,
            стукае,
                        стукае
Кулямі дождж па шыбах.

ДОМ БЕЗ ГАСПАДАРА

Бывае такая пара:
Дом застаецца без гаспадара.
Камандзіроўку бярэш,
                                як лекі
Ад цішыні,
                што хіліць да сну.
Паехаў на Месяц шукаць чалавека,
Пайшоў узнімаць цаліну.
На цвіку, як на зорцы палярнай,
                                                  палонік —
Агню і вады паклоннік,
Поўны адчайных мар:
Эх! Даць бы нырца ў вар!
Канапа не зарыпіць —

Адчувае сябе абібокам.
Што ёй рабіць
Са сваім пружыністым бокам?
Крэслы хадзіць развучыліся,
быццам
Падлога да сябе прыляпіла.
Ніхто на іх не садзіцца,
Апрача пылу.
На шахматнай дошцы раскіданыя пешкі
пасталі —
Войскі, якія ў баях патрэпаны.
Тэлевізар сляпы на тумбачцы,
як на п'едэстале —
Манумент непатрэбны.
У прыёмніка непрыёмныя дні
Цяперака,—
Паспрабуй у пакой зазірні,
Афрыка ці Амерыка!
Са сцен — павуцінне,
каметамі — космы,
Разлёгся ў кутку пыласос-гультай.
Дом бязлюдны —
халодны, як космас.
Гаспадар,
хутчэй прылятай.

АБУТНІКІ

Калі партачыць нехта, мы крычым:
— Шавец!
Шпурляем слова, быццам звягу.
Прафесія аблаяная,
чым
Ты заслужыла гэтую знявагу?
Ці бачыў ты шавецкі ўзмах рукі,
Па-снайперску дакладны, адмысловы?
Умеюць заганяць абутнікі
Цвікі ў падэшву, нібы ў песню словы.

О непаўторны танец малатка
З двухпавярховым рукатворным грукам!
Хто не забіў ніводнага цвіка,
Сябе адчуе побач з ім бязрукім.
Спяшаюцца шаўцы, нібы вятры,
Каб утрымацца ўпоравень з эпохаю.
Чмурэючы ад люстраных вітрын,
Якая прыгажуня не завохкае?
Тут —
Туфлі ваяўнічае красы,
Для пальчыкаў хаваючы калецтва,
Нацэльваюць ракетамі насы
Не менш, як на палову чалавецтва.
Пачуеце вы летам і зімой
І з вуліцы, і з ціхага завулка,
Як молада гарцуе горад мой,
Абутнікамі падкаваны гулка.
Абцасікі — алоўкамі аб брук.
Слядам іх тут бы нотамі астацца!
Грыміць ва ўсіх актавах перастук
Кантатаю шавецкаму мастацтву!

ФУТБОЛ

Гулкая асада стадыёна.
Ля ўвахода паставы ахрып.
Глухнуць нават трубкі тэлефона.
Заразіў футбол усіх, як грып.

Скаланецца, загрымеўшы ў ладкі,
Стадыён —
раскроены кавун.
І вось-вось, здаецца, як зярняткі,
Выпырснуць балельшчыкі з трыбун.

Скок — ігрок, і ў мяч ілбом да болю...
Дзе ты, шарык? Ты — ізноўку свой!
Пасвятлелі думкі аб футболе —
Бач, і тут працуюць галавой.

Тут адно ў ног улады многа,
Рук сваіх жа бойся, як біча,
Бо караюць суддзі вельмі строга
За рукапрыкладства да мяча.

Нехта к брамцы вырвецца знянацку:
Бухайце, балельшчыкі, ў званы!
Толькі гулка чокнуцца па-брацку
Два шары —
футбольны і зямны.

Натрэніраваным бумерангам
Пстрыкнуў мяч —
хоць плач ці закрычы.
Варатар, нібы апостал рангам:
Не ўпускае грэшныя мячы.

Сам свісток судзейскі заскандаліў —
Свіснуў іграку, як штрафніку.
Воплескі, як тысяча медаляў,
Выслізнуўшы, грымнулі ўбаку.

Галава закружыцца ад звону,
Як ад хмелю.
Але ні да дна
Трапяткую чашу стадыёна,
Як бы горкай ні была яна!

ХАТНІ РАЙ

Ад камандзіровак, ад сяброўак —
Хочацца развітвацца ці не,—
Ад сталовак тлумных і вандровак
Забірае хатні рай мяне.

Дома жонка ля пліты штукарыць.
Каву ў ступцы, як вядзьмар, таўку.
Рок-н-рол шчупак віхлясты шпарыць
На патэльні, як на пятачку.

З пары —
Хмары.
Вось і навальніца!
Грукну шклянкай — грому нараблю.
Толькі грозна гляне чараўніца —
Дзве маланкі мілыя злаўлю!

Да стала заўжды лячу са страхам:
Спознішся — бяда не абміне.
Позіркам дакорлівым, як штрафам,
Пакарае любая мяне.

Ды абрушыць з абурэннем шчырым
Лаянку ласкавую сваю.
Каб вайна закончылася мірам,
Пляшку ўпотай з шафы дастаю.

Але зноў каханая асекла:
— Чарка ў будзень — гэта цераз край...
І каму паскардзішся, што ў пекла
Вельмі шмат пазычыў хатні рай!

САЛАТ «СЯМЕЙНАЯ ІДЫЛІЯ»

Ах, і сусед мой — гурман-непаседа!
Які сямейны салат у суседа!
Крышачку вернасці,
Крышачку здрады,
Крышачку рэўнасці,
Крышку спагады...
Салат кулінару па густу,
Па сэрцу,
Прыпраўлены лаянкай густа,
Як перцам.
Ды падсалоджаны ласкай падманнай —
Казачнай маннай, што сыпле з нябёс,
Ды перасыпаны самаю таннай
Соллю жаночых пакутлівых слёз...
Ах, і сусед мой — гурман-непаседа!

Які сямейны салат у суседа!
Гатуецца ён і ноччу і днём...
Мне б па-братэрскаму праву
Перакульнуць бунтоўна ўверх дном
Гэтую агорклую страву!

ГІМН ЦВЯРОЗАСЦІ

Я знаю пах віна і смак чарэшні.
Я сам зусім не праведнік бязгрэшны.
І ўсё ж складаю гучны гімн цвярозым:
Няхай жыве да веку ясны розум!
Ды вось жа пляшкі на стале пасталі,
Як ідалы на хісткім п'едэстале.
І рыльцы іх нацэлены, як жэрлы,—
Ідзе ў атаку ідал ненажэрны!
І ты прад ім адразу рукі ўгору.
Усё адно ці з радасці, ці з гора —
Ты пляшкаю, якую ўраз асушыш,
На суткі сонца сам сабе патушыш.
І задрыжыць відэлька ў пальцах слізкіх...
Ты — злодзей!
Ты крадзеш у самых блізкіх:
У любай — непадораную ласку,
У сына — нерасказаную казку.
Прададзены падманлівым акрасам,
Ты і чарніш і лакіруеш разам.
І лак, і дзёгаць у тваім бакале
Прытулак для абдымкаў адшукалі.
Ты — дэзерцір! Ты завярбован страхам,
Сам ад сябе ўцякаеш гразкім шляхам.
І языком,
Як малатком,
Кляпаеш.
Бяжыш —
І за крысо мяне хапаеш.
Таму я і складаю гімн цвярозым:
Няхай жыве да веку ясны розум!
Калі ж не можа свет зусім без п'яных,
Дык лепш ужо хмялець ад губ каханых!

ЖАЛЕЗНЫ АДАМ

Можаш, горад мой, лёгка ад смагі лячыцца,
Бачыш —
стаўшы на вуліцы чарадой,
Аўтаматы румяныя, як прадаўшчыцы,
Газіраванай гандлююць вадой.

Я манетку ў адтуліну кідаю хвацка,
Але дзе ён, струменьчык?
Цярпліва стаю.
У цябе, аўтамат, жалезная хватка:
На вачах заціскаеш капейку маю.

Мігатліва забліскаў шклянымі вачыма,
Забурчаў, засіпеў:
— Не аддам! Не аддам!
Што за Ева цябе махляваць навучыла,
З роду робатаў першы, жалезны Адам?

І няўжо нашаптала металу на вуха
Прадаўшчыца, што ў белым халаце заўжды,
Перадаўшы сваю старую навуку,
Як адбухаць шыкоўную дачу... з вады?

Можа, даць бы тут волю пагрозам цвярозым?
Але я, не ўтрываўшы, даю грымака!
І глядзіце — дайшло! Прачынаецца розум!
У засмяглую шклянку шуганула рака!

ЮБІЛЕЙНАЕ

Нехта чхнуў — кадзільны дым прамоў
Гэтак зачадзіў на юбілеі...
І здаецца, быццам сто грамоў
Бухае ў парожнюю балею.

Ледзь не камянее ад пахвал
Юбіляр, нібыта ўвесь з цэмента.

Хоць бяры ды стаў на п'едэстал —
Велічней не знойдзеш манумента!

І яго мне крышачку шкада:
Хіба ноша гэтакая ўзрадуе,
Калі толькі тонамі руда
І ні грама, ні крупінкі радыю.

І ў душы сваволіць скандаліст:
З лаўраў, што ўзвалілі на паэта,
Выскубнуць хаця б адзіны ліст —
Верш прыправіць, посны, як дыэта...

СЯБРУ-ПАЭТУ

Пачуць зялёны кліч вясны на золку
І дом змяніць на палявы абшар,
Саманадзейна замахнуцца ў зорку
І трапіць толькі ў вулічны ліхтар.
Глытаць таблеткі, калі ўвесну сыра,
Цягнуць у спёку з куфля свежы квас,
І праклінаць пагоду і касіра
За тое, што не выплаціў аванс.
Складаць кантаты гераічнай Лайцы
І праслаўляць усе мацерыкі,
З рэдактарам да ачмурэння лаяцца
І з крыкам апераваць радкі...
За чаркаю граміць няпраўды свету
І абдымаць усіх людзей-братоў...
А змог бы ты,
як Галілей,
планету
Спіхнуць з усемагутных трох кітоў?
Ты маўчыш?
Тады выкінь сваё пяро!

РАБЫ

З крыжом,
іржавым і надломаным,
Спічасты шпіль да зор
Прасцёр
На плошчы ў горадзе над Нёманам
Касцёл,
Нібы вяршыня гор.
Ад граду, што калоссі жытнія
Малоціць сотнямі цапоў,
І ад маланкі, што абжытая
Бяжыць па дроце між слупоў,—
Як цені, цягнуцца паломнікі
У храм, нібыта ў век былы...
Мае равеснікі — палоннікі
Сівой касцёльнае імглы.
Іх даўкім дымам замуроўвае —
Раздзьмуў кадзіла бог рабы.
І б'юць аб пліты мармуровыя
Ілбамі потнымі
Рабы.
Жанчына — горкаю рабінаю:
Удовін позірк,
як сляза.
Багіня хараства рабыняю
Згінаецца, нібы лаза.
Малітву посны пастар выдыхнуў
Баском рыпучым, як пратэз,
І раптам крык бунтоўна выбухнуў —
Дзіцячы крык, нібы пратэст.
Дзядок з вачамі жаўтароціка
Свой крыжык ціске да грудзей.
Выцягвае камені гоціка
І гне людзей,
І гне людзей...
Мая эпоха!
Ты — нязвычная!
Табе ў вяках няма раўні.
Нейлонавая і касмічная,
Рабам калені разагні!

БУСЕЛ

Рэчы, пацясніцеся ў пакоі:
Я гляджу ў шчаслівым неспакоі,
Як калыска —
Лодка без вясла —
Ледзьве-ледзьве ў дзверы праплыла.

Чым суняць грамадзяніна Слаўку?
Закрычаў уладна на ўвесь свет —
Падае свой голас,
як заяўку
На жылую плошчу ў гарсавет.

У калысцы хлопчык,
як палоннік,
Цэлы дзень бунтуе неўпапад —
Сіліцца парваць палон пялёнак,
Што скруцілі з галавы да пят.

Супакойся, мой бунтар нястомны:
Чуеш,
Як клякоча за сцяной
Дзюбаю сталёвай кран пад'ёмны —
Звонкі бусел на назе адной.

Я акенца адкрываю насцеж:
Змоўк і ўраз заслухаўся малы...
Несучы на дужых крылах шчасце,
Клекачыце, добрыя буслы!

НАВЫПЕРАДКІ

На доўгую дыстанцыю даўно,
Час, я з табой навыперадкі выйшаў.
Канца дарозе гэтай не відно,
На ёй па горла і нізін, і ўзвышшаў.

Па разгайданай тупаю зямлі,
І гэтак ёй мае патрэбны крокі,

Як акіянскім хвалям караблі,
Як струнам пальцы і як сценам кроквы...

Гук, мой сапернік, ты пра свой рэкорд
Бубніў у вушы тонам пераможцы.
А дзе ж ты зараз? Як загнаны хорт,
Рысіш за мной па бегавой дарожцы.

Як гром маланку, хуткасць прыручы,
На ўздыме дыхай лёгка, як прапелер.
І дай з разгону губы апячы
Паветрам, як наждачнаю паперай.

Ні кропелькі не страшна, што мяне,
Нібы салдата ў час апошняй бітвы,
Святло па зрэнках раптам паласне
Адточаным лязом бліскучай брытвы...

Праскочыў я праз абручы франтоў
У Брацк агністы з барыкадаў Прэсні,
Давай, святло! Я ад цябе гатоў
Аслепнуць, як Гамер стары ад песні.

Глытаю кіламетры на хаду.
Калі ж зямлю пад голаў, як падушку,
З дыстанцыі сышоўшы, пакладу,—
Хай перарве ў фінале сын мой стужку.

Прыгубіць ён прастор са скразняком,
І ты мяне з рахунку, час, не скінеш.
Сваім судзейскім трапяткім флажком
Зара ўзмахне — і стане стартам фініш.

З кнігі «АКНО»

(1965—1967)

* * *

У пафасным уступе,
                    як у ступе,
Ваду вядомых слоў таўчы штодня,
Пакуль алоўкам па стале не стукне,
Нібыта лёс няўмольны, старшыня.
Жыццё, жыццё, кароткі твой рэглямент.
Як разгарнуцца тут на ўвесь размах?
Няўжо мы толькі камяні ў фундамент,
Каб іншыя дабудавалі гмах,
Даб здолелі вышынны дах пакласці?..
Але ж і мне
            не потым, а цяпер,
Таварыш бог,
            адрэж акраец шчасця
І долю чалавечую адмер!

* * *

Здаецца, загоены раны,
Залечаны ў сэрцы трывогі.
З'язджаюцца ветэраны
На юбілей Перамогі...
Упартасць у іх — з жалеза!
Яны будуюць і сеюць.

І няньчаць свае пратэзы.
І ў глаўках ад дум лысеюць.
Памяць забыць бы хацела,
Яе б размініраваць варта.
Ды пад кашуляй цела
Быццам ваенная карта...
Яе не згубіш ніколі,
Яна да скону з табою,
Як біяграфія
                    болю.
Як геаграфія
                    бою.
Адзначылі тут асколкі
Пасёлкі ад Волгі да Віслы.
На ордэнскай стужцы вясёлкі
Медалем Зямля павісла.
...І пабрацімы на плошчы,
Дзе вечны агеньчык хвошча,
Адзін аднаго абнімаюць
Рукамі,
          якіх не маюць.

* * *

Яснасці,
Яснасці,
Яснасці! —
Хочацца па-цвярозаму.
Яснасці — чэснай уласнасці
Незакілзанага розуму.
Яснасці ўсім, хто выйшаў,
Каго не хістае змора,
Хто пеністым следам вышыў
Хустку планеты — мора.
Як доўга ў былым туманы —
Барадачы нябрытыя —
Туляцца, бы атаманы,
Шайкі якіх разбітыя.
Нібы акрайцам румяным,

Сонцам надзеі снедаем.
Яснасці — у спазнаным,
Яснасці ў тым, што зведаем?
Яснасці! Хто там ізноўку
Робіць адтэрміноўку
Зорнага старту мыслі?..
Хмары ўгары навіслі.
Яснасці! І ў Сайгоне,
Сцятым чужой вуздэчкаю,
На плошчы, як на далоні,
Гарыць чалавек свечкаю.

ДВАЦЦАТЫ ГОД

Свой доўгі сум нясе дамоў яна —
У гмах зіркасты, што ў зялёных сховах.
Адзін сляпы квадрат яе акна
Чарнее між агнёў шматпавярховых.
А недзе ў шафе пахавальны ліст —
Яе ўдаўства мандат бестэрміновы.
...Ізноў з пупышкі выбухае ліст —
Атожылак вясновае абновы.
Дваццаты год яе цяжкой бядзе.
Не верачы ў круты прысуд паперы,
Дваццаты год яна адна ідзе
Па вуліцы сваёй жаночай веры.
Варочай успамінаў збіты куль,
Вышукваючы зерні дарагія.
Нібыта, ўваскрасаючы, адтуль
Дваццаты год вяртаюцца другія...
Ёй кроў, як токам, скроні апячэ,
Калі к суседзям нехта грукне ў дзверцы.
Дык, значыцца, не скончана яшчэ
Вайна, што замініравала сэрцы!
Агнёў аконных зіхатлівы шыфр
Высвечвае жыццё ярчэй за словы...
А хіба злічыш, колькі чорных шыб,
З якіх трывога не зняла заслоны?

ГРАНІЦА

Стараннымі аратымі ўзарана
Палоска ўздоўж дзяржаўнае мяжы.
Яна дыміцца на зямлі, як рана,
Якая просіць лекаў:
 — Памажы!
Тут зернятка баіцца ўпасці ў ворыва,
Прыпасці, як да маці, да раллі,
Каб потым,
 быццам выкрытага ворага,
Яго пад трыбунал не аддалі.
На цэнтр палоскі сігануў з разбегу
З чародкай натапыранай травы,
Як перабежчык, адуванчык белы:
Бярэ яго на мушку вартавы...
Цябе, як арыштанта, пад штыкамі
Скруцілі
 пагранічныя драты,
Зямля мая, ты круцішся вякамі —
Няўжо не можаш выкруціцца ты?
Ты ў спрасаванай атмасферы хмарышся,
Спрабуючы парваць спавівачы...
Як быць табе?
 Хіба суседу Марсу
Зямныя пазыўныя пракрычы.
Няўжо твае паселішчы людскія
Не больш як заапарк глуханямы?
Дзяржавы быццам клеткі, у якія
Саміх сябе пазаганялі мы...
Вам, што здаўна над межамі варожыце,
Я пакажу абшар зямлі без меж,
Дзе, разарваўшы дзірваны варожасці,
Граніцы нівам перадаў лямеш.
Мы — людзі!
 Мы павінны парадніцца,
Крануць пласты адвечнай цаліны...
Планету падпярэжа не граніца,
А млечны пояс роснай збажыны.

МОЙ ЛЕС

Лес, як вада, наталяе смагу.
Задыхаючыся ў вулічнай таўкатні,
Я лесу крычу,
як ратоўнаму магу:
— Дай мне глыток сваёй цішыні!
У бор, як у тайну,
загляну я,
Каб зведаць сапраўдную глыбіню:
За абыякавасцю драўлянаю
Колькі ўнутры схавана агню!
Калі да мары маёй стопавярховае
З паходняй падпальшчыка
вораг лез,
Я сказаў:
— Будзь маёй аховаю.
Самая мнагаствольная артылерыя —
Лес.
Дубы і сосны,
не ўмеючы клясціся,
Заўсёды маўкліва прымалі бой.
На гэткіх і сёння
можна пакласціся:
Не падвядуць у службе любой.
Скрыпкай дык скрыпкай,
якая б прапела
Крык,
і надзею,
і гора да дна —
Усё, што нямая лясная капэла
Выказаць людзям хацела здаўна.
Мачтаю —
ростам ад кроны да кораня.
Ці мала яшчэ высокіх пастоў?
Я дрэвам самую бездакорную
Характарыстыку выдаць гатоў.
Выстаялі.
Не адступілі.
У акупацыі
Не былі.
Вось што значыць як след акапацца,
Укараніцца на роднай зямлі!

Секлі,
палілі цябе на бяду маю,
А ты зноў — галавой да нябёс.
Я пра цябе часта думаю,
Мой лес —
Мой лёс.

* * *

Поле, поле,
У сваім прыполе
Колькі цудаў ты прыносіш мне!
Да пары, як змагары ў падполлі,
Тояцца зярняты ў баразне.
У раллі вільготнай валаконцы
П'юць жывую сілу — сок зямны.
Час праб'е — і пікамі да сонца
З цемрадзі праклюнуцца яны.
Выстаіць у полі войска хлеба —
Мускулістых каласоў атрад,
Хоць свае налёты робіць з неба
Бамбардзір цяжкі —
Грымотны град.
Навальніца ніву палівае,
І маланку-тэлеграму мне
Адбівае
Пошта палявая:
«Ураджай даспеў на цаліне».
Мы ўзышлі,
Нібы зярняты,
З поля,
І ўпадзём ізноў у поле мы.
Поле,
У тваім замкнёным коле
Нашы душы, думы і дамы.
Сплю ў каменным сховішчы кватэры.
Але што там бухае, як цэп?
Хто так гулка стукаецца ў дзверы?
Гэта ты, пасланнік поля —
Хлеб.

ЦЫРК

Узмах далоні — і жар-птушкі
Чародкай сядуць на плячы.
Ківок —
і з рота пырснуць стужкі —
Штукарскія спавівачы.
Гром воплескаў — як гул абвала,
Што выбухае ў цішыні.
Тут апладзіруюць хлусні,
Якая ўжо мастацтвам стала.
Падман... Няўжо і ў ім патрэба
Жыве ў душы? Інакш чаму
Ты, як галодны крошцы хлеба,
Гатовы кланяцца яму?

* * *

Дайце, харэі і ямбы,
Трубныя дыфірамбы
Будаўніку пястомнаму
Таварышу Крану пад'ёмнаму!
Па рэках паветраных волакам
Цягне далонь пад'ёмная
Паверхі ўпоравень з воблакам —
Дні ў вышыні прыёмныя!
Нехта яшчэ цаглінкаю
Марудна аб кельму дзынкае,
А гэты сцяну зграбастае,
Прышпіліць да сонца — і баста,
Паслухаеш — сэрца расчуліцца
Ад гэтай песні пад'ёмнае,
Мне ў гуках яе чуецца
Нешта аэрадромнае.
Дык хто там яшчэ ўпарта,
Хаваючы ў сейфы цёмныя,
Не выдае пад'ёмныя
Думам, што прагнуць старту?

Жылплошчу нябёс абсталёўваю.
Не быць вышыні бяздомнаю,
Бо мускулы мае сталёвыя —
Сіла мая пад'ёмная!

РАНАК, ДЗЕНЬ І ВЕЧАР

Мне, як і ўсім на зямлі,
Наканавана
Праводзіць ранак, дзень і вечар,
Каб усявышні мог
У графіку мерапрыемстваў
Ставіць чарнільныя галачкі...
Ранак маіх спадзяванняў
Быў ружовы і вельмі кароткі,
Я не паспеў стаць піянерам —
А мне павязалі на шыю
Чырвоны гальштук пажару,
У якім згарэў
Папяровы самалёцік дзіцячае мары,
Запушчаны з аэрадрома
Хлапечай далоні.
Ранак маіх спадзяванняў
Скарачала гвалтоўна
Вайна,
Як няўмольны рэдактар,
Чырвонымі алоўкамі
Гармат...
Дзень маіх турбот
Доўгі і будзённа-шэры,
Як скроены ў спешцы
Салдацкі шынель
Не па росту,—
Бягу і баюся
Наступіць на крысо...
А вышыня,
Якую трэба ўзяць,
Так блізка —
Рукой падаць!

Адкрываючы люк карабля,
Я ступаю ў касмічную бездань,
У магільную цішыню зор —
Зіхатлівых узнагарод
Тым, што ўпалі на безыменных
Вышынях
На подступах к небу...
Дзень маіх турбот
Доўгі і будзённа-шэры,
Як салдацкі шынель не па росту...

Якім жа ты будзеш,
Вечар маіх успамінаў?

РОЗНАКАЛЯРОВЫ БРЭСТ

Які ты зялёны, Брэст!
Тут дыхае строй нядрэнны:
Сабраліся, нібы на з'езд,
Рознаплямённыя дрэвы.
Гудуць аб былым, як званы.
Дуб, пакалечаны мінамі,—
Інвалід Айчыннай вайны —
Дзеліцца
успамінамі.
Не тоячы росту свайго,
Маячыць таполя, як клічнік
Да слоў захаплення майго
Табой, бастыён-пагранічнік...
Які ты чырвоны, Брэст!
Над крэпасцю, спаленай спрэс,
Зара, як шырокая рана
Ад вогненнага тарана.
Плавячы сталь і цэмент
На востраве, ворагам скутым,
Байцам высякаў манумент
Агонь, як няўрымслівы скульптар.
І зноў у падмурак — скрані!

Радамі па-воінску легла
Барвовая, быццам з крыві,
Загартаваная цэгла...
Які ты блакітны, Брэст!
Салдаты на золку з дазораў
На хусткі нясуць для нявест
Неба з узорамі зораў...

РОДНАЯ МОВА

Як самую звонкую ў свеце навуку,
Як ройных вякоў пчаліную складчыну,
Прымаю па складу, па смаку, па гуку
Мову маю матчыну!

З калыскі, ад першага лепету «мама»,
Які акрыліў жаўтароціка-хлопчыка,
Да грамавога «ура», што ўзнімала
Мяне ў штыкавую атаку з акопчыка.

Пароль неўміручасці — родная мова.
Рассуньцеся, часу перагародкі:
Вядуць, як суседзі праз вокны, размову
Учора і Заўтра, патомкі і продкі...
Мы ці нямыя вякамі мычалі?
Струны ржавелі без пальцаў музыкі.
Нібы ўзрыўчатку, запасіў маўчанне
Род мой,
Народ мой,
Набат без'языкі.

Мову маю, як праўду, падноскамі
На плошчах парадна глушылі,
Душылі
Пятлёй зацяжною, што Каліноўскаму
Вужакаю падступіла да шыі.

Таму не стамлюся славіць, як сонца, я
Цябе, рэвалюцыя, што назаўсёды

Агучыла, як кінастужку бясконцую,
Гісторыю збуджаных воляй народаў.

Ты ў нетрах маёй беларускай старонкі
Залежы музыкі адкапала,
Каб з сэрца, нібы з невычэрпнай скарбонкі,
Высыпаў песні народу Купала.

Мы слова прыгубілі, як крыніцу,
Што камень маўчання прабіла са звонам,
Пілі, як паветра пасля навальніцы,
Прапахлае сонейкам і азонам...

Ды рынулі браніраваныя вусені
На край мой, нібыта на ліст кляновы.
Але прыслухацца іх прымусілі
Мы да сваёй выбуховае мовы.

Трэсліся, быццам ад землетрасення,
Гвалтоўныя сейбіты сталі рурскай
Ад партызанскага вымаўлення
Грымотнай мовы маёй беларускай!

І мінамётамі, і гарматамі
Краіна мая, што ад гневу бурліла,
Па грозных законах ваеннай граматыкі
Чужынцаў скланяла аж да Берліна...

Нас дзеці і ўнукі паўтораць нанова —
Народы не спісваюцца на пенсію.
Ты будзеш звінець, мая родная мова,
Як слова, якое не выкінуць з песні!

РАХУНАК

Зязюля, мне яшчэ ў маленстве ты
Накукавала сотню зім і вёсен.
І шматгалосым рэхам бор густы
Памножыў лік на безліч звонкіх сосен.

Ды пад мяне вяла падкоп вайна.
Каб заглушыць зязюльчыны прароцтвы,
Грымотна заспрачаўшыся, яна
Дала гарматным пашчам паўнамоцтвы.
Ад гэтай гучнай сваркі нездарма
Зямля лістом асінавым дрыжала.
Снарады, як адзінкі, смерць сама
Нулямі чорных дулаў памнажала.
Бацькі і дзеці падалі ў баю.
Навук азы мне ўдзёўбвалі не ў школе.
Крутую арыфметыку тваю,
Вайна, я не змагу забыць ніколі...
Хоць бараной, зубатай у сяўбе,
Даўно твае падкопы прычасалі,
Астолкам, што ля сэрца пра сябе,
Гвалтоўная, напомніш мне часамі.
Але не цешся! Пераможны лік
Вядзеш не ты, кашчавая бабуля!
Блукае ў лесе хлопчык, мой двайнік,
Якому зычыць сто гадоў зязюля.
Агучвай жа, вяшчунка, бор глухі,
І хай твая не абарвецца песня,
Калі, як дынаміт, сучок сухі
Неспадзявана пад абцасам трэсне.

ВАР'ЯТ І ВАЙНА

Паводле нямецкай народнай казкі

З травінкай любой размаўляў ён без слоў,
Блукаючы ў джунглях аеру.
Віталі вар'ята кіўкамі галоў
Гарлачыкі ў белых самбрэра.

А полем узбоч без дарогі ішлі
У касках гарбатых салдаты.
І следам за імі — да сонца з зямлі —
Узносіўся пыл ружаваты.

Наўсцяж прасавалі яны збажыну —
Пад ботамі гнулася сцежка.
— Куды вы? —
Спытаўся вар'ят.
— На вайну!
Хіба ты не бачыш, даўбешка?!

Галодны крумкач на высокай сасне,
За войскам цікуючы, кракаў...
— А што вам, салдаты, рабіць на вайне? —
Вар'ят непакоіў ваякаў.

Тапырачыся, нібы напаказ,
Штыкі палымнелі пад сонцам.
— Паліць!..
— І расстрэльваць!..
— І нішчыць!..—
Адказ
Каціўся над строем бясконцым.

— Навошта? —
Не здолеўшы ўцяміць, відаць,
Ускрыкнуў вар'ят анямела.
— Каб зноў нараджаць!
— Каб зноў будаваць! —
Вясёлае войска грымела.

Гула ад абцасаў зямля, нібы звон,
Губляючы водгулле ў жыце.
І кінуў ваякам вар'ят наўздагон:
— Дык хто з нас вар'ят, адкажыце?

* * *

Грузчык я.
Мяне хістае трохі:
Ад відна да позна валачы
З парахода штармавой эпохі
Цюк трывог смяротных на плячы.

Ідучы па знойдзенаму следу,
Я, сапёр, спяшаю, каб у час
Абясшкодзіць беды,
як тарпеды,
Што здаля нацэлены на нас.
Зоркі ў небе адчуваю локцем,
Вышыня —
жаданая радня
Дум, якія я вяду, як лоцман
Да прычалаў заўтрашняга дня.

* * *

Юнацтва туманныя рэбусы
Яшчэ ў галаве карагодзяць.
Гады мае, як тралейбусы,
Прыходзяць і адыходзяць.
Пад імі
— прамыты ліўнямі
Асфальт маршрутаў штодзённых.
Над імі —
высокая лінія,
Што ў пальцах жалезабетонных.
А дзе ж ты, са скрыпам фурманка?
Калдобіны.
Тракт дрыготкі.
Прасёлачная гайданка.
Трэсла. А ехалі ўсё-такі!

На колах туга тарахцела.
Як мне карцела тым часам
Асфальту рабое цела
Пакратаць сваім абцасам!

Світання туманныя рэбусы,
Вам поўдзень разгадку знаходзіць.
Гады мае, як тралейбусы,
Прыходзяць і адыходзяць.

Далёка яшчэ тупік,
Куды заганяе поўнач.
Няхай жа ў гадзіны пік
Нас людзі да краю запоўняць.

На травы асфальт цячэ —
Раўняюць, трамбуюць, прасуюць.
Ды з крэктам усё ж яшчэ
Колы на ўздыме буксуюць.

Ад гулу калоціцца руль,
Патрэсквае ток прыручаны.
Ды я не прыстану —
пакуль
Да лініі сэрцам падключаны!

* * *

А лета
Не канула ў Лету,
Яно адслужыла тэрмін,
Бунтоўны агонь свайго цвету
Замкнула, быццам у тэрмас,—
У крутабокія яблыкі,
І кавуны, і бэры,
Што да зімы,
Як караблікі,
Шыбуюць на белы бераг.
Усё, што ў бяссонных пошуках
У лепеце лісцяў завяжацца,
У стопудовых кошыках
У лістападзе ўзважыцца.
Няхай цеплыні эстафета
Перадаецца бясконца...
Дзень добры,
Наследнікі лета —
Румяныя дзеці сонца!

МЕРА

К д'яблу метры і мэтры!
Пакрысе, пакрысе
Напаўняецца ветрам,
Напінаецца ветразь,
Што твой човен трасе.
Дні, як белыя ватманы,
Перачэрчвае быт.
Прагнуць людзі і атамы
Безразмерных арбіт.
Кантрабандай з таверны —
Пырсне слова з пяра.
Выспеў верш безразмерны
У душы песняра.
Брацкіх могілак горы
У зямлі на гарбе...
Безразмернае гора,
Чалавек, у цябе.
Дрэмле завязь у кветках —
Не прагледзь, чалавек!
Ў безразмерных шкарпэтках
Скача атамны век.
К д'яблу метры і мэтры! —
Твой апошні дэвіз...
Бачыш — грыб у паветры
Безразмерна павіс.
К д'яблу Кліберы і Рыхтар!
Рынуў джазавы рык!
Безразмерныя рытмы
Растраслі мацярык...
Толькі фрэскі, як трэскі,
З эрмітажаў далоў.
Толькі бліснe ды трэсне
Тры мільярды галоў.
Грымне космас у горны
Чорным россыпам нот...
Стой! Рукамі — за горла
Падпалены кнот!
Ніжай зорная млечнасць —
Разгінаецца раб!
Чалавечнасць, як вечнасць,
Твой бязмерны маштаб!

АСЕННІЯ БАРВЫ

Расінкі поту жнівень з твару сцёр —
Здае цяжар спякотных абавязкаў.
І верасень — грамадскі кантралёр
Касцянкамі лічыльніка заляскаў.
Адсвечвае галактыкаю сад,
У барвы шчодрай спеласці адзеты.
Як успамін, раіцца лістапад:
Зялёнае буянства лета,
Дзе ты?
Нібыта штору, адхіні смугу,
Развей лісты, як сцёртыя чырвонцы,
Кладзі на шалі чыстую вагу
Пладоў, зярнят і дум, цяжкіх ад сонца.
Сам космас, быццам просьбіт, басанож,
Сыходзіць ноччу да Зямлі з паклонам,
Дрыготна падстаўляе зорны кош
Пад яблыкі, што падаюць са звонам.
Зрываючыся з прывязі галля,
Бабахне бэра, як скарбонка лета.
І сутыкнуцца груша і Зямля —
Малая і вялікая планеты.
Цямнее лоб зямлі не ад гадоў —
Ад восеньскай разважнасці халоднай.
Як лёгка ёй пад ношаю пладоў,
Як цяжка ёй ад лёгкасці бясплоднай.
Пад шынамі машын яна дыміць,
Ды круціцца, не просячы рамонту,
І хмарыцца ад думкі: як прамыць
Запыленыя жніўнем гарызонты.

НЯМА ЧАСУ...

На хаду бутэрброд дажоўваеш,
Сябру папкай ківаеш ружоваю,
Паўтараючы вельмі часта:
— Няма часу...
Ты выседжваеш мудрасць гадзінамі,

Аж пацеюць у крэслаў спінкі.
Ды ніяк не праклюнецца дзіўная —
Пэўна, цвёрдая шкарлупінка!
Канцылярская сошка, сонна
Ты арэш папяровыя склады.
Ты гатоў адчытаць нават сонца,
Што ўвайшло ў кабінет без дакладу.

За злачынства сваё не бойся:
Не караецца па законах
Часу масавае забойства
На паседжаннях незлічоных...
Год за годам
паражняком
прагрукоча,
І прыпынак апошні, як тупік, набяжыць.
І зажмурыш ад праўды вочы:
— Не было часу жыць...

Мітуслівасць — круцелька прыкрая,
Не чапляйся!..
Пароюлюбою
Я ў скнарлівай вечнасці выкраю
Час для дружбы і для любові.

Сэрца, быццам набат адмысловы,
Чалавечай гудзе трывогай —
Паспявай да людзей, маё слова,
Хуткаю дапамогай!

Грукачы бяссоннай хадою
На дасвецці і апаўночы,
Не пакінь дружбака з бядою
У самоце, нібы ў адзіночцы...

Хай з гадамі душа не скісае,
Я прыгублю жыццё, як чашу,
А як прыйдзе з касою касая,
Я скажу ёй: — Няма часу...

* * *

Кажуць, даволі пра дальнія страхі.
Кажуць, даволі пра даўнія страты.
Страхі — мінулага чорныя птахі,
Страхі — патопленыя піраты.
Ды памяць, як лішні вагон,
не адчэпіш.
І без яе наперад не рушыш.
У памяці — вочы,
якіх не аслепіш.
У памяці — вушы,
якіх не аглушыш.
Песні, імёны і мары,
навалай
Гнаныя ў камеры і крэматорыі,
Рэспубліка памяці захавала
На суверэннай сваёй тэрыторыі.
Памяць нядрэмная, будзь жа ўсячутнай,
Грукай у сэрцы ўдарам тарана,
Покуль на нашай зямлі шматпакутнай
Ходзяць забойцы беспакарана.
Нават на пенсіі — за работай
Бед камандзіры, дум канваіры:
Пыл барадаты сціраюць употай
З іконаў свайго адстаўнога куміра.
Як жа мы гмах сваёй праўды завершым,
Забыўшы пра тых, што салдатамі ўпалі,
Калі адступалі мы ў сорак першым,
Калі ў сорак пятым мы наступалі?

ЗАПРАШЭННЕ К ЗДАРОЎЮ

Сюды, ў лясное царства,
На досвітку ступі,
Як лепшае лякарства,
Настой паветра пі.
У кроне на сасонцы
Сярод галін завяз,

Як скальпель, промень сонца,
Нацэлены на вас...
У цішыні дрымотнай
Яліны, што наўкол,
Іголкаю пяшчотнай
Тут зробяць вам укол.
І прымеце, як лекі,
У засені бяроз
З зялёнае аптэкі
Сто тысяч кропель рос,
Што ад знямогі лечаць...
Няхай ужо гады
Не цiснуць вам на плечы,
Як мулкія пуды.
Гукаю ўсіх сяброў я:
Спяшаюся ў паход!
Лясны палац здароўя
Працуе круглы год.

ВЯЧЭРА

Захлынуўся ветру плач надрыўны...
Падпаліўшы раптам сэрца мне,
Чыркнула запалкай у акне
Знічка ці знішчальнік рэактыўны.
На стале даўно астыла кава:
І бурчыць, і лаецца ласкава,
Губы надзімаючы, злуецца
Жонка,
што мяне не дазавецца.
І не бачыць,
як рукою порсткаю
Я рассунуў свайго дома сцены
І надзеў навін апошніх порцыю
На відэлец радыёантэны.

* * *

Хвала напятай хвалі, што пяе!
Хвала ўзбярэжным дзюнам, што як горы!
На пляжы спляжу немачы свае
І змору
    патаплю ў бяздонным моры.
Ад гарадской гарачкі і трывог
Лячы мяне,
Мой добры доктар — ціша...
І ўжо блакітнай вечнасці разлог
Мяне ў калысцы трапяткой калыша.

Куляйся,
    як свавольнае дзіця,
Будуй з пяску высотных мар пакоі.
Пуцёўка —
    віза за рубеж жыцця —
У царства санаторнага спакою.
Усё, што хвалявала, забывай.
Зачыненае сэрца — на засовы...
Зялёны рай —
Курортны край —
Бывай! —
Я пакідаю мой нябыт часовы.
Дарма, дарма ўзбярэжных хваляў цуг
Маёй ляноце дружна ў ладкі пляскаў.
Хапаю зноў выратавальны круг
Сваіх будзённых спраў і абавязкаў.

* * *

Хоць клалі сосны ў зруб,
Але з усіх парод
Хвалілі толькі дуб
За цвёрдасць з году ў год.

У царстве гупічару
Дубы — тугія лбы —

Каронамі ўгару
Узносілі чубы.

На ўвесь лясны раён
Дудзеў дубовы ствол,
Што па прызванню ён —
Паліраваны стол,

Што ўвойдзе ў кабінет,
Ступіўшы на паркет...
А там з нейлону стол
Ужо забраў прастол.

Шуміць пра свой намер
Дуб між лясных братоў.
І я яму цяпер
Паспагадаць гатоў.

— Як ордэны, лісты
Страсуць вятры з цябе.
І шпалай ляжаш ты
На земляным гарбе.

І запяе тады
Струною магістраль:
— Туды,
Туды,
Туды,
Дзе пахне сонцам даль!

І рэха паплыве:
— Хай, як адзін народ,
Заўжды, заўжды жыве
Сям'я лясных парод!

БАЛГАРСКІЯ ПАМІДОРЫ

Поезд запыхкае дымнай цыгараю,
Ляснуць суставы саставу ад зморы...
Едуць да нас
Пасажыры з Балгарыі —

Чырванашчокія памідоры.
Дрогка гайдаюцца ў скрынях
з дзяржальнамі,
Жарам прыручаным станцыі поўнячы.
Вось і парушаны межы дзяржаўныя
Лета і Восені,
Поўдня і Поўначы.

Посвіст гудка — і далёкае блізка.
Аж з прыдунайскага калідора
Цягнецца ветка чыгункі да Мінска
Грузнай галінкаю памідора...

Колы пад вамі капэлаю спеліся,—
Гэй, падапечныя сонца балканскага!
Як вы палаеце колерам спеласці,
Колерам сцяга рабоча-сялянскага!

ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ

Вершы твае —
лісты
Да запатрабавання.
На пошце натоўп густы
Не растае ад чакання.
Расказвай жа, як жывеш.
Выкладзі праўду крутую...
Ці не ступіўся лямеш,
Што цаліну пластуе?
Па шчырасці напішы,
Дай адрасатам вызнаць,
Як у засеках душы
Зерні баразнамі трызняць...
Не давярай пяра
Скарзе — бурчлівай бабе,
Што сваркі свайго двара
Падасць у сусветным маштабе.
Вычарпай словамі ты
Боль, і любоў, і лагоду —

Бо адрасуеш лісты
Ты чалавечаму роду.
У чарнавой чарнаце
Томіцца ноч спачатку,
Ды сонейка на лісце
Паставіць уранку пячатку!
І хай нават смерць-карга
Дастрочыць твой ліст апошні,
Будзе шумець чарга
Перад акенцам пошты.

ПРЫПЯЦЬ

Здалася ты мне з вышыні трапяткой,
З глухой самалётнай шыбы
Сасновай галінаю,
                    да якой,
Як гнёзды, прыліплі сялібы.

Хоць вабяць уладна другія краі,
Усё ж я іду на зніжэнне.
Рака мая, кожнаю кропляй крыві
Адчуў я тваё прыцяжэнне!

На беразе — купамі сена капцы.
Глядзіш — і здаецца, што гэта,
Лугі пагаліўшы, прыселі касцы
Спачыць да наступнага лета.

Чакай, я бліжэй да цябе падыду!..
Разгледзець здаля немагчыма.
Ці вербы пялёхкацца выйшлі ў ваду,
Ці мыюць бялізну жанчыны...

І ці не ад поту сялянскага ты
Зрабілася рыжаю, Прыпяць?
Маўчыць. Расцягнула гармоняй плыты,
Каб рытмы рабочыя рыпаць.

* * *

Няма на зямлі адзіноты —
Пустэчы, падобнай да смерці.
Мы — ноты,
мы — ноты,
мы — ноты
У чалавечым канцэрце.

Глушыць стракаты сокат
Стройных акордаў нізка.
Адны бяруць высока,
Другія бяруць нізка,
Нехта, нібы ў кавадла,
Бухае —
свет хістае.
Нехта фальшывіць заядла.
Нехта ў трубу вылятае.
Хто там, назваўшыся лёсам,
Зноў барабаніць ў сенцы?
Мы, ноты,
як бабы, галосім,
Рагочам,
нібы шаленцы.
Нехта матыў чаканіць.
Нехта яму падвывае.
Нехта застыў у чаканні,
Як статуэтка жывая...
У бубен трывогі стукнуць
Ці выдыхнуць трэль мажору?
Які твой узмах наступны,
Палачка дырыжора?

АКНО

Як мне святлом упіцца хочацца,
Калі світанкам праз акно
За кропляй кропля сонца сочыцца,
Як вінаграднае віно.

Зара смугу далей адсоўвае,
Зажмурыш вочы ад святла:
Ты, ноч, маёй турмой часоваю,
Маёй цямніцаю была!

Мой дом —
майстэрня, а не камера.
Прамень, сюды прыходзіш ты,
Каб вызваліць,
як скульптар з каменя,
Мяне з маўклівай чарнаты...

І я ўжо больш не агароджаны.
Удзячны добраму агню,
Здаецца, як нованароджаны,
Ад шчасця крыкну ўпершыню.

Рукой ружовы шар пакратаю,
І зноўку думка апячэ,
Што, перакрэсленыя кратамі,
На свеце вокны ёсць яшчэ...

АФІЦЫЯНТКА

Пагойдваючыся,
паднос
Плыве параходам з кухні.
Чайнік задраў нос.
Пеніцца піва ў куфлі.
Кубінскі цукар і чай
Грузінскі —
якое суседства!
Сталоўка —
тлумны прычал
Галоднага чалавецтва.
Хоць самы розны народ
Прымаюць гэтыя сцены,
Тут прага напоўніць рот —
Заўсёды кліент нязменны.

Грыміць з рэпрадуктара Бах
Вышынна-блакітнае штосьці,
А ў едакоў на зубах
Хрумсцяць парасячыя косці.
Выбух — і пробка ў столь,
А поруч нехта аб стол
Стукае афіцыяльна,
Гукае:
— Афіцыянтка!
Яна сваю стому нясе,
Змяіцца між столікаў кобраю,
З'едзены ўсмешкі ўсе,
З'едзены словы добрыя.
Чым наталіць душу,
Якая зубамі ляскае?..
— Афіцыянтка,
прашу
На першае — кубак ласкі!..

ВІРУСНЫ ГРЫП

Каля сэрца вібрырує вечны барометр —
Асколак іржавы.
Па-ўдовінаму галосячы,
Вецер успамінаў ахрып.
Эпідэміяй ломіцца,
Нібы ў дамы, у дзяржавы
Вірусны грып —
Атамны грыб...
Чуеце, як набліжаецца?
Колькі яшчэ крокаў?
Сігнал меднагорлай сірэны яшчэ не зароў...
Годзе! Замоўкніце!
К д'яблу асляплых прарокаў!
Глуха стогне зямля:
— Дактароў!
— Дактароў!
Дыпламаты шаноўныя!
Што вашы слоўныя раунды?

Ці не час зірнуць вачыма цвярозымі?
Трэба планеце
Дыягназ бязлітаснай Праўды
І хірургічны скальпель Розуму!

* * *

Ад тармазоў — сіпаты, дымны віск:
Дрыжы, прыпынак, цішыні пазбыты.
І ўціскваюць, нібы патрон у дыск,
Мяне ў тралейбус, што біткам набіты.

Мароз — траскучы абстракцыяніст —
Свае шэдэўры выставіў на шыбах.
На шкле, здаецца, алавяны ліст,
Увесь у хітраватых перагібах,
Як ні глядзі ў акно —
ўсё адно
Не зможаш у маршруце разабрацца.
Куды бяжыць тралейбус, не відно,
Мастак халодны, з-за тваіх абстракцый.

Ды дзьмухну я — і раставай да дна,
Абстрактны лёд, наляпаны бязладна.
І, нібы ў рамку, у квадрат акна
Пейзаж рэальны ўпісваецца ўладна.

Узмах рукі — і золак трапяткі
На волю з ночы выплыў, як з палону.
Ад сонца прыкурыўшы, камінкі
Дымяць у твар самому Апалону.

Бывай, тралейбус! На прыпынку Дзень
Выскокваю з цябе, як з дрогкай брычкі.
Хай дакранецца ранішні прамень
Да барады лязом вясёлай брытвы!

ПЕНСІЯНЕРЫ

Паселены тут, на гары,
Як у зацішнай кватэры,
Век дажываць стары
Рэчы-пенсіянеры.
Без слухачоў, адны,
Бадзёрыя робячы міны,
Праводзяць штодзень яны
Вечар сваіх успамінаў.
Усё, што спазнаў на вяку,
Аповесць былой славы,
Прыладзіўшыся ў кутку,
Расказвае стул кульгавы.
Тыя, што маюць вагу,
Яго прасавалі да глянцу,
Пакуль не зламаў нагу
На юбілейнай гулянцы.
— Прыйшла і мая чарга,
Стала я жэрдкай без кошту...
Драўляная качарга
Газавай плітцы навошта?
А некалі — будзь здароў! —
Я шуравала ў печы
Пад вечным абстрэлам дроў,
Што мне апякалі плечы.
Слова бярэ патэфон:
Даўшы пачуццям выйсце,
Сіпіць, як парожні сіфон —
Ах, як ён грымеў калісьці!
Быў ён для часу свайго
Заслужаны запявала.
Як кажуць, пад дудку яго
Хто не скакаў, бывала?
Яго разумелі без слоў.
Але нарэшце:
— Далоў!
Годзе, ахрыплы ёлуп,—
Грымнула радыёла...
З затоенаю журбой
Каманднага рангу песні,
Што ўчора вадзілі ў бой,
Сягоння ідуць на пенсію.

Без слухачоў, адны,
Рэчы праводзяць вечар.
Пласцінка, як шар зямны,
Круціцца, круціцца вечна.

ЭКСПАНАТ

Гаварыць не ўмеюць экспанаты.
Ды ад іх пачуеш, як штодня
Свішчуць кулі, грукаюць гранаты...
Цішыня ў музеі. Цішыня.
Сталь сцяну каменную прашыла.
Помнік з цэглы вычасаў фугас.
Побач дрот калючы,
як шыпшына,
Што расцілі прыхадні для нас.
А пад шклом магільнік чорнай славы:
Ордэнаў жалезныя крыжы...
Дзе цяпер іх уладальнік бравы?
Вось ён —
госць цывільны з-за мяжы.
Ветэран з эсэсаўскай іржою.
Дымных успамінаў гаспадар.
Сетачкай маршчын, як паранджою,
Замаскіраваў азызлы твар.
Ордэны, як орды, на палічцы —
Блізкая такая даўніна...
Колькі іх?
На пальцах не палічыш:
Пальцы ў немца адцяла вайна.
Заблішчаў у госця зірк дрыготкі,
І калі б наўкол не тлум людзей,
Дык з-пад шкла паўскоквалі б бразготкі,
Каб прыпасці да яго грудзей.
Воўчым вокам, ад натугі белым,
З карабля разбітага пірат,
Як калісь наводзіў парабелум,
Цэліць зараз фотаапарат.
Ён тады не вырваў славы з бою,

Што, як прывід, мроіцца ў смузе...
Дык хоць цьмяны цень яе з сабою
Па-зладзейску сёння павязе.
Падаецца з залы іншаземец,
Быццам зрушыў з месца экспанат...
— Стой! Куды?
Але не чуе немец:
Ён даўно аглух ад кананад.

ПРА АДЗІНОТУ

Ад боляў эпохі, як брытва, вострых,
Ад жонкі, якая заўжды начаку,
Нібыта на незаселены востраў,
У адзіноту сваю ўцяку.
Свет захіну фіранкаю рыжай.
У крэсла ўтапіўшыся, «Праўду» вазьму.
Выбухі! Грукнула бомба ў Парыжы —
Чыркнуў асколак па сэрцу майму.
Снягурачка ў белай чаромхавай замеці
Зайшла, не пастукаўшы, у пакой.
— Адкуль ты?
— З тваёй трывожнае памяці.
З ранішніх зор над бяссоннай ракой!
І зноў гарачышся, святлееш і хмарышся...
Заходзяць у мой пакойчык малы
Хмары, планеты, маланкі, таварышы
І мары — будучыні паслы.
У адзіноце — душамі посныя!
Іх не ўзварушыш і грамадой.
Мая ж адзінота да пядзі апошняе
Заселена радасцю і бядой.
Весткі атамныя з-за акіянаў,
Нібыта громаадвод,
лаўлю.
Адзінота — не сховішча ад ураганаў,
Што хочуць з восі спіхнуць Зямлю!
Дасведчаныя пра ўсё на свеце,
Гудуць над маім акном правады...

Што гэта?
Рэквіем нашай планеце
Ці песня пра заўтрашнія гарады?
Раптам на дроце чырыкнула нота
Вельмі мажорнага вераб'я...
Паклон табе, мая адзінота!
Праклён табе,
адзінота мая!

ГУЛЬНЯ

Адгрымеў даўно сорак пяты.
Ды штовечар з майго двара
Чужакам наступае на пяты
Выбуховым абвалам «ура».
Нехта бухае ў бляху таропка —
Пошчак, нібы ад залпу гармат.
Гулка ставячы кропку за кропкай,
Строчыць цацачны аўтамат.
Затрашчалі парканаў клеткі,
Пашчапаныя, як ад куль...
Ах, равеснікі міру, падлеткі,
Ваяўнічасць у вас адкуль?
Дзецям ставяць у школе двойкі
Па гісторыі продкаў, дзе
Ад малой да вялікай бойкі
Кожны ліст, як набат, гудзе.
Ім не ўцяміць, як цяжка маткам.
Брацкіх могілак цішыня
Аўдавелым крычыць салдаткам,
Што вайна — благая гульня.
Раны—памяці нашай зарубкі.
Пакалечаны шар зямны
Абеліскі ўздымае, як рукі,
Галасуючы супраць вайны...
Але дзе яно, войска грознае?
Раптам бой у двары заціх.
Гоняць маці дадому розгамі
Дарагіх гвардзейцаў сваіх.

МАНАЛОГ АКІЯНА

Махмуду Эсамбаеву

Трывог па горла ў акіяна...
О лёгкасць танца майго важкая!
Мне хвалявацца наканавана
За кожны човен, які гушкаю.

Нібы раз'юшаныя ваўкі,
пражэрліва
Па-над стыхіяй вятры завылі.
У пачарнелым святле пражэктара
Плюскочуць рукі мае —
залівы.
Іду я ўпрысядкі, не знаю зморы.
Я выгінаюся між сэрцаў кладкаю.
Даходзіць мова мая
праз моры
Да розных земляў без перакладчыка.

Адной рукою крануў Еўропу,
Другой паляпваю я Амерыку,—
Каб толькі хвалям не збіцца з тропу,
Каб толькі братам быў бераг берагу.

Вятрыску горла спакой зацісне,
І я свячуся ўжо ззяннем глянца.
Але не верце ў маё зацішша —
На дно маўчання майго загляньце!

Мяне падводна, балюча раняць
Драпежных рыбак тупыя кулі.
Штодня тыраняць, штодня тараняць
Душу і цела маё акулы.

Тут нават камень, бязгуччам скуты,
Здаецца, блізка зусім да віску.
За міг бязважкасці — век пакуты
У перагрузках нямога ціску!

Я прасаліўся, прагорк ад поту,
Ці гэта хвалі, ці гэта мускулы,

Заўсёды ўпрэжаныя ў работу,
Нястомна ходзяць у рытме музыкі.

Між белай грывы праглянуць плешы,
То я ўскіпаю, то халадзею.
Але ўскладайце вы мне на плечы,
Нібыта судны, свае надзеі!

ПАЛАНЯНКА

Калі нечакана ўранку
У клетку яе закрылі,
Адчула тады паланянка,
Што лішнімі сталі крылы.

Успомніла, як калісьці
На сцэне зялёнай з ласкаю
Далонямі дружнымі лісце
Песням яе пляскала.

Укралі ў спявачкі неба,
Але затое неслі
За краты крупінкі хлеба,
Як ганарар за песні.

У вымушаным натхненні
Службова чырыкала птушка,
Нібы штукар на сцэне
З рота выцягваў стужку.

Цурчала песня бяздумная —
І пахавальнае штосьці,
Штосьці пранізліва сумнае
Было ў яе весялосці.

Ды неяк хлапчук-гарэза
Уранку адкрыў клетку —
І птушка сп'янела ад бэзу,
Ад водару траў і палеткаў...

Паверыць было ёй цяжка,
Што болей нічым не звязана.
І раптам адчула пташка,
Як песня ў горле завязла.

КРЫЛО І ПЯРО

У паэтаў — грому, грому...
Дай для ўзлёту крылы, глеба!
Ім жа без аэрадрома,
Як без хлеба,
Як без неба...

Як працягла,
Як пакутна
Ноччу іх бязмоўнасць мучыць,
Покуль ранкам усёчутна
Слова губы не агучыць.

Хочаш быць раўнёй пілоту? —
Ад зямлі стартуй у неба!
Слову, як і самалёту,
Прыручаць вышыні трэба.

У глыбінях стратасферы
Рэактыўных пёраў росчырк.
Неба — чысты ліст паперы.
Што ты там напішаш, лётчык?

Да людзей праз ноч нядрэмна
Лётчык і паэт даходзяць.
Недарэмна, недарэмна
Ад крыла пяро паходзіць...

Хай туман у мора кане —
Дайце лётную пагоду,
Каб у залах пачакання
Не заседжвацца па году!

МАЛАКО

Прыгадваю маруднасць адвячорка,
Калі зару
працэджвае паркан
І, як ад сырадою,
на падворку
Дыміцца
Цёплы чэрвеньскі туман.
Праклюнецца
З саска струменьчык звонкі —
І вось ужо вядро, як азярко.
Мне праз гады
чуваць твой водар тонкі.
Салодкі хлеб маленства —
Малако...
І адступала
цемната начная,
Запальваў зрэнкі твой глыток,
Як ток...
Ах, Млечны Шлях жыцця майго!..
Я знаю,
Адкуль бярэш ты свой зямны выток!
Трава жылплошчу аддае бетону,
І берасцянку глушыць бас гудка,
Але грымяць
аб тратуар бітоны,—
Хвалю
Бесперапыннасць малака!
Вятрамі
і дарогамі
прапахшы,
Замыкае сігналам ля латка
Машына ўранку,
як карова з пашы,
З бляшаным вымем,
поўным малака.
Рыкай у свой ражок,
трубі,
карова,
З мурожных берагоў малочных рэк!
Адну тваю рагатую карону
Не скіне з трона мой бунтарны век.

* * *

Суседка мая —
вуліца.
Я цябе, несціхануюю, слухаю.
Днём гудзеш перапоўненым вуллем,
Уначы засядаеш квактухаю...

Каб сон мяне атуліў салодкі,
Ты пяшчотным няньчыным рухам
Мне трамваі свае,
як бразготкі,
Доўга-доўга трасеш над вухам.

Ты варочаешся без адбою,
Неспакойная,
як бяссонніца,
Аж пакуль на зары над табою
Куранём не праклюнецца сонца.

І куды я ступіў бы раніцай,
Калі б не тваё суседства?
Ты —
дотык маёй абранніцы,
Дотык да чалавецтва.

Я тваю таварыскасць знаю,
Суседка мая —
вуліца.
Ты дойдзеш, як сувязная,
Да ўсіх, хто на хутары туліцца.

Як табе я аддзячу, дарэчы?..
Калі б толькі ногі ўтрымалі,
Я б ускінуў сабе на плечы
І панёс за цябе трамваі...

Мы з табой у сяброўскім хаўрусе —
І мяне ты на шпацыр клічаш.
А ў маўклівасці зажуруся,
Ты мне грому, суседка, пазычыш!

* * *

Сысці мы паспеем
                                парою любою.
Хай маршы аглухнуць,
Асыплюцца кветкі.
Давай, бесплацкартнае шчасце,
                                з табою
Згуляем у хованкі,
Як малалеткі,—
Пакуль мы гадамі яшчэ
                                не прыбіты
Да быту,
Да ўтульнай кватэрнай арбіты...
Білет латарэйны —
                                білет на поезд!
Жылплошча вандроўніка
                                абсталявана:
Мой халадзільнік —
                                Паўночны полюс,
Чорнае мора —
                                мая ванна!

ВІЛІЯ

Віляеш ты між вольхаў, Вілія,
Заступніцтва ў зялёных ценяў просіш.
Свой плёскат тонкі — лепет ручая —
Нібыта бунт прыглушаны, разносіш.

На берагах тваіх трыснёг зачах,
Як ад сухотаў безнадзейна хворы,
Ты ад спякоты сохнеш на вачах...
Няўжо ты марна марыла аб моры?

Дзе хваль тваіх вясновых крутаверць,
Што калыхала домікі, як лодкі?
Было — сплыло...

З касой пясчанай смерць
Вось-вось падступіць да
засмяглай глоткі.

З рыбацкай хваткай вуду акуні —
Клююць, нібы шавецкімі цвікамі,
Пячкурыкі...
Язі ды акуні
У бездань рэк вялікіх паўцякалі.
Растане над затокамі туман —
І як тады ад яснасці не вохнуць,
Што можа задыхнуцца акіян,
Калі яго прытокі перасохнуць!

Раптоўны дождж, прыйдзі ж хутчэй сюды
І дай гаючых кропель, быццам доктар.
Маўчаць грамы, набраўшы ў рот вады,
Замкнуўшыся ў сваіх вышынных дотах.

* * *

Берагі
Ваду бяруць
У рамку,
Каб рака трымалася напрамку,
Каб,
як ранцы,
караблі насіла
Мускулістых пругкіх хваляў сіла.
Ах, рака —
Рука крутога мора,
Ты не знаеш, што такое змора,
Бач, цябе п'янлівасць веснавая
Зноў да хваляванняў падмывае.
Скінуўшы ільдоў счарнелых вечка,
Вырастаеш, быццам з дзежкі цеста.
І табе ўжо, рэчка-быстрацечка,
У сваім зямным улонні цесна...
І куды, нікому невядома,—

У вады няўрымслівасць сляпая —
Уцякае з рэчышча,
Як з дому,
Бераг, як парог,
Пераступае.
Пабяжыць за край зямлі і неба,
І яе не зацугляць, хоць рэжце.
І няўжо з сябе выходзіць трэба,
Каб знайсці сябе самога ўрэшце?
...Вусце ў мора. Рокатна і гулка
Некалі рахманая рачулка
Бухае, як кулаком у брамку...
Берагі
Ваду бяруць
У рамку.

У ДЗЕДА ТАЛАША

Я ў Петрыкаў прыйшоў —
Да Талаша,
Дзе ён з пагорка аглядае гоні,
Нібы вось-вось з ляснога шалаша,
І ад стральбы яшчэ гудуць далоні.

Узбоч — паркан,
Нібыта патранташ,
Які ў хвіліну ціхага адбою
Распяразаў і кінуў дзед Талаш,
Як грозны напамін,
Перад сабою.
Ён не салдат,
А сейбіт і касец.
Ды выдараўся час гарачы гэткі,
Што сеяў дзед не жыта, а свінец
На ўзрыхленыя ворагам палеткі.

Не толькі летам, і зімой касіў
Тых, што народ у госці не прасіў.

Каб не таптаў варожы грузны бот
Палёў Палесся, што былі ў палоне,
Сціскалі гнеўна пальцы кулямёт —
Зялёную зямлю агнём палолі.

...І вось плугар у грунт скалой урос,
Прапісаны на ўзгорку родным стала.
І пад блакітным полагам нябёс
Яму планета вечным домам стала.

* * *

За тыдзень бог зямлю і неба
З такой таропкасцю стварыў,
Што нам пацець вякамі трэба,
Каб неяк знітаваць прарыў...

Свае ўсявышні недаробкі
На плечы нам зваліў, як куль.
Жыццё, нібы пісьмо без кропкі:
Усё пакуль, пакуль, пакуль.

О свет, калі ж цябе мы створым?
Дамы — на час, і мы — на час.
Цябе мы з цемры цягнем к зорам,
Як пераростка ў першы клас.

НАФТА

Я — нафта.
                    Я чорнай рабыняй у сховішчы
Пад прэсам адменнай
                    каменнай пароды
Шукала ў сваім безвыходным
                    становішчы
Свабоды.

Пластоў цвердалобых вярхоўная сіла
Мяне прыціскала,
каб я прыкусіла
Язык небяспечны падпольнага
полымя,
Якое мне кроў гарачыла і поўніла.
Трымалі мяне ў чорным целе
вякамі,
Вятры нада мной
галасілі ваўкамі,
А я —
акіян,
спрасаваны ў азерцы,
Агонь выбуховы свой
няньчыла ў сэрцы.
Разведчыкі,
перш чым мяне вы адкрылі,
Брылі па паверхні,
як птушкі без крылля,
Таптaлі мяне і не зналі тым часам,
Што я —
ваша ўзлётная моц —
пад абцасам...
Я верыла —
скончыцца тэрмін турэмны:
— Хутчэй высякайце ў цямніцы
аконца,
І я, пакідаючы карцэр падземны,
Ад шчасця падскочу
фантанам —
да сонца.
Не быць мне рабыняю болей ніколі,
Праз шчыліну ў глыбах каменных на
волю
Я, нафта, прабілася лаваю чорнай
З чырвоным агнём
у душы непакорнай!..

* * *

Адкажы мне,
                    што ты такое:
Хлеб
      ці
        малітва?
То атуліш гаючаю ракою,
То падступіш да горла,
                              як брытва.
Я памкнуўся ўжо хоць куды
Уцякаць ад цябе
                         ў паняверцы.
Але дзе там!
                    За павады
Падцяла зацуглянае сэрца.
Ты мой крыж,
                    да якога прыбіт я цвікамі,
І маё ўваскрасенне.
Без цябе я —
                    у бездань упушчаны камень,
Іголка на сене.
Ты згубіла мае ключы
Ад спакою —
                    не ад пакою!
Я малю цябе,
                    не маўчы,
Адкажы мне,
                    што ты такое?

* * *

Быў у зялёным загсе
                              май за свата.
Пячатка-сонца змацавала шлюб.
І з той зары
                    я адзначаю свята
Тваіх марудных і п'янлівых губ.
Мне сто вякоў спаткаць цябе карцела.

Мільгаюць тут,—
скажы,
з якіх часоў? —
Спякотны дзень твайго тугога цела,
Густая ноч жытнёвых валасоў;
Нябёсы воч —
блакіт бяздонных тоняў,
Турботай затуманены пагляд,
Скуластыя мацерыкі далоняў,
Прычальны родны бераг немаўлят...
Люблю цябе зямную, не ікону!
Люблю цябе, нібы ратай раллю!
Тут я адзін.
Не стукайце.
Нікому
У тваім сэрцы месца не ўступлю!

* * *

І я калісь лавіў за грыву хвалі,
Што вокамгненна кланяліся дну.
Мне мора па пуцёўцы выдавалі,
Нібыта хлеб па картачцы ў вайну.

Да пены белагрудага прыбою
Прытулішся, а тут яна — бабах...
І выкіне на бераг. І з сабою
Насі палынны прысмак на губах.

Не запакуеш акіян у скрынку,
Нібы багаж, каб звезці ў іншы край,
Дзе суша, быццам чэрствая скарынка,
Дзе ад няўтольнай смагі памірай.

Ды я з табой спаткаўся, як з вадой,
І вецер хвалі пругкія лістае.
Я — кантынент,
я морам абрастаю,
Нібы тысячавёрстай барадой!

* * *

Ахрысцяць вусны жонкаю нявесту —
І з цемры ўжо галёкае радня.
З якой мукі і му́кі гэта цеста,
Што ты, любоў,
замешваеш штодня?

Камандзіруй ізноў у падарожжа,—
Ад зернятка, набраклага ў раллі,
Да каравая, да кароны збожжа,
Што на стале ўвянчае мазалі...

З зямлі праб'юся і ўпаду пад цэп,
Ускіну жорны ўсіх пакут на плечы,
Румянашчокім выйду з пекла печы,
Каб толькі зведаць, што такое хлеб...

Хай звергне вецер з дрэў ліству, як моду.
Пакінь цаліннай весняй баразне
Вады таропкасць.
І марудпасць мёду,
Як спелы яблык, дай прыгубіць мне.

* * *

Так пераблытаны
подыхі нашы і рукі
І гэтулькі многа цябе
ў маім сэрцы на дне,
Што доўга не ведаў я
ў часе бясконцай разлукі,
Каго тут няма —
цябе ці самога мяне.
Калі ж у акне маім
дзённае сонца патухне
І ноч замуруе мяне
у чатыры сцяны,—

Па-гаспадарску
ў пярэдняй здымаючы туфлі,
Ты без стуку ўваходзіш
у мае адкрытыя сны.

Як вагаўшчык, час
кідае наша шчасце
На векавечныя шалі сустрэч і разлук...
Якія ж адлегласці
могуць цябе ўкрасці,
Калі я цябе абдымаю
мерыдыянамі рук?

* * *

Чаму ты плойме выдуманых бед
Разнасцежыла сэрца так старанна?
Бяда, калі пазнюся на абед,
Бяда, калі прыходжу надта рана.

Не там сяджу, і не туды гляджу,
І не магу я ўцяміць — нехарошы! —
Што парасон ратуе ад дажджу
І ад слаты —
гумовыя галёшы...

Навошта акіяны караблю,
Калі вады і ў завадзі па горла?
За ўсім, што я раблю і не раблю,
Ты бачыш нешта цёмнае, як гора.

Пакіньце ж, здані,
наш цвярозы свет,
І толькі дождж слязамі дол акропіць
На пахаванні выдуманых бед,
А нам з табою і сапраўдных хопіць!

* * *

Хоць у мой зрок
Уваходзілі,
Як параходы ў шлюз,
Поўнае сонца,
Жанчыны самотныя
І адзінокія зоркі,—
Я не ведаў, нашто мне вочы,
Пакуль не ўбачыў цябе.
Хоць прыпадаў не раз
Да кварты сталовай
І да паходнай біклагі,
Да рэчкі вандроўнай
І да пастаяннага мора,—
Я не ведаў, нашто мне губы,
Пакуль не спаткаў цябе.
Ты засвяціла,
Як выйсце
З катакомбаў халодных блукання майго.
У муках,
Як камень, марудных
Цябе адшукаўшы,
Знайшоў я самога сябе!
Таму, як малітву штодзённую,
Я чытаю цябе запоем,
Усю —
Ад загалоўка валасоў
І да шматкроп'я пацалункаў —
Перад тым,
Як забыцца сном.

ПЕРАГАВОРЫ

Хоць развіталіся мы,
Але жалезна звязаны.
Дзякуй, провад прамы,—
Табе мы так абавязаны!
Скроні ці сто званоў?..
Я ў тэлефоннай кабіне,

Як перад стартам ізноў:
Неба, адкрый глыбіні!
Я чую, як дыхаеш ты
У тэлефонную трубку,
Што ў покрыве цемнаты
Патрэсквае, нібы грубка.
Як мне ў вузельчык звязаць
Словы, што сэрца ўзважвае?
І не паспею сказаць
Самае, самае важнае.
Гэта прабегла жыццё
Ці толькі чатыры мінуты?
Слухай гудкоў выццё,
Як здаўлены плач пакуты.
І я ў зняменні стаю
І неяк збянтэжана ратаю,
Быццам руку тваю,
Трубку халаднаватую.

* * *

Тут мы ўдваіх. Ды тлумных думак цуг:
Прыкусіць язычок дзвярная клямка.
Як выспу ў цемры, свой замкнёны круг
Пяром святла акрэслівае лямпа.

І нам ужо адгэтуль не ўцячы,
Як палахлівым дэзерцірам з фронту.
Схаваны ад усіх дзвярэй ключы
У цемрадзі, за рысай гарызонта.

Мы прагнем акунуцца ў цішыні,
Як житнія зярняты ў баразёнцы,
Якія, зазямліўшы карані,
Вяртаюцца калоссямі да сонца.

Тут мой і твой бяссонны мацярык —
Хай музыка населіць свет грымотна,

Калі, як да струны напятай смык,
Я дакрануўся да цябе пяшчотна.

У шыбу дзень пастукае, як друг,
Якому кожны дом бясконца рады.
І ўжо ў адзіны неабдымны круг
Сальюцца закаханых далягляды!

ДАРОЖНАЕ

Ёсць у мужчын слова няўмольнае —
справы...
І ты, прырастаючы да акна,
Доўга глядзіш,
быццам з шырокай аправы
Карціна з журботнай назвай «Адна».
Гушкала ў вагоне і трэсла мяне ў аўтобусе.
І вось самалёт у надхмар'і нясе.
Унізе мільгаюць,
як на вучнёўскім глобусе,
Сінія жылкі рэк і напятыя струны шасэ.
Але воблакі — лебедзі белыя
Усяго мяне
не ўзялі:
Цень мой — цень самалёта бегае,
Як на прывязі, па зямлі.
Калі скалане паветраная дарога,
Над крэслам тужэй зацягні
рамяні
І за думку,
што ў небе бліжэй да бога,
Схапіцца можаш
у вышыні.
Але трымаюцца
у рукатворнай спайцы —
Бачу іх праз аконнае шкло —
Заклёпкі пукатыя,
нібы пальцы,
Якія з зямлі падпіраюць крыло.

У гасцініцы
з пылам дарожным і потам
Мяне сон у абдымкі зграбе.
Прахаплюся ў пасцелі халоднай потым —
Будуць губы шукаць
цябе...
Як гэтым крылам,
што носяць мяне,
веру
Табе, дарагая мая!
І калі да цябе
паштальён стукае ў дзверы,
Памятай —
гэта стукаю я.

КРЫНІЦА

Гнала мяне смага
Па лесвічцы горных парод,
Басіў, як пустая біклага,
Мой перасохлы рот.
Пальцы шукалі парэнчаў,
Да непрытомнасці слаб,
Покуль не ўпаў, не ўкленчыў
Перад табой, як раб.

Маё сцюдзёнае шчасце
Сагнула мяне ў крук...
Дай жа к табе прыпасці
Полымем губ і рук!

Ды гулкая непаседа
Крута вільнула ўбок,
Рачулкаю да суседа —
Подбегам скок ды скок!
Верная не паверне —
Пашыбавала туды,
Дзе і чакаюць не вельмі
Яе крынічнай вады.

ПАД ДАЖДЖОМ

Вечар.
Вецер.
Плошчу
Палошча
Дождж пранізлівы і густы.
Толькі два дзівакі на плошчы —
Слуп тэлеграфны і ты.
У слупа —
абавязак службовы:
Ён не можа схавацца пад дах,
Ён падтрымлівае размовы,
Што пагойдваюцца ў правадах.
Ні на хвілю, вядома,
яны не моўкнуць.
А табе, маладому,
навошта мокнуць?
Хлопец-зух, прыгажун, гуляка,
Недзе джаз затужыў без цябе...
Плашч набраклы звініць, як бляха,
Пад дažджом, што цвікамі дзяўбе.
— Не прыйшла — і няхай! Да д'ябла! —
Ты не ўсклікнуў у гэты раз.
Ты камячыш акурак азябла
І шпурляеш пад грозны абцас.
Табунамі імёны дзявочыя
У блакноце ад «А» да «Ю»...
Дык чаму ж ты яе не варочаеш,
Папяровую памяць сваю?
Галі, Веры, Надзі, Таі —
Спёка вуснаў і вільгаць віна...
Хто ж яна, ганарліўка тая,
Што за ўсіх вас дужэй адна?
Бог дзявочы цыгарку топча.
Дажджавая цурчыць вада.
Бог дзявочы —
зусім як хлопча.
Далібог, мне яго шкада!
Толькі хай памокне, нябога.
Пакланіся паклонам зямным
Тым дзяўчатам, што з бога любога
Пыл збіваюць дажджом праліўным!

* * *

Якіх адборных зорак у прыполе
Прынесла ноч для нас з табой у поле,
Дзе да зямлі —
ад зерня і расы —
Схіляюцца ў паклоне каласы.
Сябе саміх
на міг у жыце згубім,
А потым прагна зорны коўш прыгубім
І будзем піць з табой упершыню
Да дня
Да дна
густую цішыню.

Уся зямля празябне да дрыготкі,
І толькі мы —
на цёплым астраўку!
Тут сонейка знайшло начлег кароткі,
Паклаўшы голаў на маю руку.

* * *

Пацеў прафесар,
сеючы дабро.
І цішыня
струной напятай пела.
І па канспекце
бегала пяро,
Як на праспекце туфелька рыпела.
А я не ўмеў,
а я нямеў,
як тол,
Чакаючы, што выбухну аднойчы.
Са мной дзяліла ты студэнцкі стол
І з кім, не знаю,—
бэзавыя ночы...
Працэджвалася сонейка ў акне.
Я на цябе тады пагляну ў коса.

І так карцела пакамячыць мне
Твае —
          ужо абстрыжаныя! —
                                        косы.
А сэрца стук —
                            удары малатка,
Якім таропка бухае гарэза...
І ад вятроў,
                        як пена з малака,
Злятала квецень веснавая з бэзу.
Я вельмі позна зразумеў як след,
Што не было ні тых начэй, ні бедаў...
Быў толькі бэз.
                          І шлюбна-белы цвет.
І, як зламаць галінку, я не ведаў.

* * *

Не мне і не табе стаптаны ўзлесак,
Дзе манументы пнёў і горы трэсак.
Нырнём
          у некранутасць гушчару,
Куды не ўбіцца нават тапару!

Страляе ў нас ламаччам цішыня
У засені ялін — спічастых пагад...
Як цяжка дастаецца глыбіня,
Якая тоіць спеласць лешшых ягад!

І перад кожнай я хілюся ніц,
Каленямі густы мурог прасую.
Я знаю, што ў чарніц, як і ў суніц,
Пад скурай кроў чырвоная пульсуе.

Калі ж,
          як плод,
                          набракне стома ў целе,
Прырода нас не адпіхне ў бядзе.

Яна, як маці, мох пад бок пасцеле,
Пагорак, як падушку, падкладзе.
Я да грудзей тулю сусвет бясконцы
І вечнасць,
увасобленую ў міг.
Цалую неба, вільгаць хмар і сонца,
Што падаюць
у бездань воч тваіх!

* * *

Тупаў дождж па-салдацку чаканна
Чаравікамі звонкіх дажджынак.
Ты прыехала нечакана
З невядомасці на прыпынак.
Скок з тралейбуса — як дэсантніца.
Парашутам спаднічка ў свавольніцы.
Ты адкуль —
з кінастужкі Дэ Сантыса
Ці з нябёс, мая заваёўніца?
На асфальце ставячы кропкі,
Твой абцасік тоненька тукаў,
Быццам ключ тэлеграфны таропкі
Тэлеграму ка мне адстукваў.

Па пятах за табою грукаць
Мне, нібы за маланкай грому.
Працягні мне насустрач рукі —
Пойдзем з непагадзі дадому!
Насцеж вокны — мой быт праветраны.
Ходзяць ходырам крэслы з радасці.
Мой пакой, мой спакой павернуты
На сто восемдзесят градусаў!
Прасціна на шнуры адубелым
Калыхаецца — мае рацыю,
Абвяшчаючы сцягам белым
Халасцяцкую капітуляцыю.

* * *

Сам да цябе прыйшоў пакорна я
З няўтульнасці, як з вечнае разлукі,
У кайданы твае, любоў мая,
Падставіўшы добраахвотна рукі.

І мне маёй свабоды не шкада —
Маторы трубяць славу светафорам!
Я без цябе —
без рэчышча вада,
Якой ніколі не сустрэцца з морам.

Стыхія ад вясновага буянства
Шугае з берагоў, як з абцугоў,
А потым зноў шукае пастаянства,
Вяртаецца ў абдымкі берагоў.

Змывае ўсё без выбару мяцежнасць
Неўтаймавана ўздыбленай хады.
І цяжка так схапіць за павады,
Адчуць, што незалежнасць —
не бязмежнасць.

Багінямі да нас прыходзяць жонкі
З нявест у шлюбнай квецені вясны.
Звініце ж, абручальныя пярсцёнкі,
Кахання залатыя кайданы.

РУКІ ЛЮБЫХ

Што гэтак ласкава ляскае?
У цемру спрасонку гляджу:
Пырхаюць рукі, як ластаўкі
Перад пачаткам дажджу.
Хатніх турбот палоннікі,
Кухонных работ рабы,
Гладзяць яны палоніку
І лыжкам тугія лбы...

Галубяць сталовую міску,
Якая штодня спакваля
Сваю мурзатую пыску
Тыцкае, як цяля.
Дагледжваюць чуйна чайнік,
Што, задзіраючы нос,
Сыкае, нібы начальнік,
І кіпяціцца ўсур'ёз.
Воблачка з пару і з дыму
Пусціць начальнік круты...
Яго, каб суцішыўся, здымуць,
Нібы з пасады, з пліты.
Падсыпаць і солі, і перцу
Вы, рукі, паспееце ў час!
Нашы мужчынскія сэрцы
Заржавелі б без вас.
Кветак усіх галоўкі
Звяртае да вас зямля...
А рукі запырхалі зноўку,
Калышучы немаўля.

ДУШ

Ты ўладарна шуміш у лазні,
Душ — магутнейшы вадаспад.
Мы без лазні,
нібыта вязні,
Хітраватымі ўбраннямі звязаны
З галавы і да самых пят.
Дык гуляй жа, гуляй, мачалінка,
Па шырокай тугой спіне.
Падначалены хвошча начальніка:
Можа, гэтак, а можа, не!
Нам, аголеным, не да разбору.
Ходзяць тазікі, як чаўны.
Мы павесілі ў шафах уборы —
Мы павесілі нашы чыны.
Гардэроб — вясёлая вісельня:

Нешта вешаюць там заўжды.
Агаліла ўсіх нас і ўзвысіла
Ачышчальная сіла вады.
Адступаецца ўсё нязбытнае.
Боль — не боль.
І бяда — не бяда.
Нібы сам Адам першабытны
Ты —
      і ў пары з табой вада.
Жар гаючы пяшчотна дарачы,
Быццам вечнасць, яна цячэ.
Нават сонейка гэтак горача
Падапечнага не апячэ.
Сотым потам цела ўспацела,
Ды пяе сваю песню душ...
Гэта штосьці не толькі для цела,
Гэта штосьці таксама для душ.

* * *

Выходзячы ў дарогу,
Калі святло займаецца,
Тралейбус дротам строга
За лінію трымаецца.

Людскі паток заўсёды
Узбоч, як ток трываласці.
Шыбуюць пешаходы —
І хто за што трымаецца.

У таўкатні праспекта
Студэнт у рыжай маечцы
За дудачку канспекта,
Нібы за лёс, трымаецца.

Цвічок-абцасік тоненька
Рыпіць, ды не ламаецца.
Дзяўчына, як за коніка,
За сумачку трымаецца.

З партфелем не па чыну
Мужчына абнімаецца,
Як кучар за ляйчыну,
Ён за яго трымаецца.

А ты, мая бяссонніца,
Зямля мая, як маешся?
Адно за промень сонечны
Ты, як і я, трымаешся...

СЯБРУ, ЯКІ СПЯШАЕЦЦА

Спазніўшыся, прыйдуць слава і чын,
Якія пакуль не дасталіся.
І трапіць паспееш у сетку маршчын
Да хітрай рыбачкі —
Да старасці.

Пакарабаціць згублены твар
Выраз вядомай важнасці.
І галавы парадзелы гушчар
Пабеліць сняжок разважнасці.

І будзе цябе з гадамі ўдвая
Трэсці начамі трывога.
Каб, як каханка, слава твая
Не збегла да маладога.

Пакінеш сцежкі крутыя шукаць
Па гладкім асфальце ўдачы.
Пачне цябе «Волга» плаўна гушкаць
Ад дома да ціхай дачы.

І, як ад ношы, заные ў плячы
Ад славы —
ад прыкрай маёмасці.
І так пашкадуеш, што ўжо не ўцячы
У юнацкі край невядомасці.

ДВА КУБКІ

Побач з кубкам шчасця на стале
Бог паставіў кубак,
поўны гора.
Пенаю адсвечвалі ў імгле
Па суседству —
мора каля мора.

Палажыўшы на плячо руку,
Усявышні раіў чалавеку:
— Пі штодзень па аднаму глытку —
Хопіць шчасця да сканчэння веку.

І да незвычайнага пітва
Паспяшаўся сын зямлі прыпасці.
Ледзь пакаштаваў —
і галава
Крута закружылася ад шчасця.

І зусім забыўшы пра наказ,
І нібы зрываючыся з кручы,
Выпіў ён салодкі вір ураз,
Асушыў да дна бакал шыпучы.

Але піць няўтольная душа
Неадольна зноў і зноў прасіла.
Смага, ледзьве чутная спярша,
Забрадзіла, як сляпая сіла.

Сп'яна не разгледзеўшы бяды,
Сын зямлі
прыгубіў кубак гора...
Так перамяшаліся тады
Шчасце з горам, нібы з морам мора.

Поплеч з чалавекам з той пары,
Дзе яго ні кіне падарожжа,
Ходзяць два варожыя віры,—
Хто, скажыце, іх развесці можа?

БОТ

Стаптаны, разбоўтаны бот,
Што многа ў жыцці перанёс,
Ці ж іншых няма турбот,
Як задзіраць нос?

Я ведаю твой напеў.
Ты не лічыў за здзек
Тое, што праскрыпеў
Пад пятою цэлы век.

ПРА ВЕРНАСЦЬ

Ты цягнешся за мной штодзень,
Як цень.
Я ведаю трываласць гэткай вернасці!
Мой цень, як заяц, шмыгне за пляцень —
Ледзь толькі сонца ад яго адвернецца.

АНТЭНА

Любыя далячыні ёй відны,
Бо з вышынёю
у яе хаўрус:
Усё, аб чым гаворыць шар зямны,
Яна сабе намотвае на вус.

СВЯТЛО І ГУК

Дзякуй, школа, за азы навук.
Гэта ты за партай мне адкрыла,
Што святла дагнаць не можа гук,
Хоць і мае трапяткія крылы...

Але не пранік бы я ў закон,
Не спазнаў бы сэнс яго дакладны...
Ды адзін грымотны Цыцэрон
Мне на сходзе даў урок наглядны.

Трэслася, нібыта ад грамоў,
Зала, што кіпела поўнай чашай...
Адстаеш ты, гук пустых прамоў,
Ад святла вялікай праўды нашай.

ШТО ТАКОЕ МОРА

Сумуючы трохі без спраў,
Курортны народ назіраў
Хваляў плывучых плойму,
І кожны думаў па-свойму.
Гультай, загарэлы, як бохан,
Мора назваў абібокам.
Якому лёгка жыць, бо цэлы век ляжыць,
Варочаецца патрошку
У берагах, як у ложку...
Скульптар лічыў так:
Мора — глыбокі мастак,
Разцом сваім днём і ноччу
У цвёрды граніт стукочa,
Абчэсвае ўпарты камень,
Шукае свайго вякамі.
Глядзеў з прыбярэжных дзюн
Чабан на кудлатыя хвалі
І бачыў у іх табун
Авечак, якія бляялі...
Грузчык зазначыў сабе —
Мора на хісткім гарбе
Цяжар караблёў носіць
І нават платы не просіць
І толькі, калі на дне
Зробіцца моташна-чорна,
Усходзіцца і праглыне
Скарынку нейкага чоўна...

Сумуючы крыху без спраў,
Курортны народ назіраў
Хваляў плывучых плойму,
І кожны думаў па-свойму:
«Што такое мора?»

ОДА ГОРЛУ

Можаш сябе узвялічыць
Глоткай — крычы, крычы.
Пачуюць цябе і ўлічаць,
Залічаць у трубачы.
Натрэніруеш горла —
І будуць у ім грымець
То пераліўы горна,
То пракурорская медзь.
Гарластых адно турбуе —
Толькі б у час акурат
Выскачыць на трыбуну,
Не прамаргаць парад.
Ды разрадзіць узрыўчатку
Добра вядомых слоў.
Крыкнуць «ура!» спачатку,
Каб потым крыкнуць «далоў!».
Зробіш ківок управа
У стоенай цішыні
І — зразумелая справа —
Адразу ўлева кіўні.
Наверх атрымаеш візу,
Падумаюць — з галавой!
А пра цябе знізу
Скажуць — наверсе свой...
І будзеш за службу глоткі
Узнагароджаны ты —
Выкрычыш добрыя сродкі
На лекі ад хрыпаты.
А нехта без слоўнага грому,
Зусім безыменны для мас,
З далоні, як з касмадрома,
Пускае ракеты на Марс.

СКАРГА ЦВІКА

Справа мая —
                    дрэнь,
Не ўчуеш і добрага слоўца,
На службе мяне штодзень
Не гладзяць, а б'юць па галоўцы.
Гэткая доля ў цвіка:
Хочаш не хочаш — залазь!
Кароткі ўгавор малатка:
— Стук!
          — Бух!
                    — Лясь!
А ўпрэшся часамі,
                    з бяды
Згорбішся, скруцішся крукам,
Дык па баку тады
Абух забухае з грукам.
Допыт! Маўчу, як герой,—
Не скрыгатні, не ўскрыкні!
Латаю скарбы старой
Рыпучай і скрыўленай скрынкі.
Ні любасці, ні хвалы.
Драўніна ад воч мяне ўтойвае.
Вострыя ўсе вуглы
Целам сваім знітоўваю.
Справа мая —
                    дрэнь.
Ці ж малатку яе ўладзіць?
Мяне па галоўцы штодзень
Ляскаюць, а не гладзяць.

* * *

Сцены мембранамі:
Век адмысловы!
Ноччу прыёмнік уключыць сусед,
І зарычаць меднагорлыя словы —
Перанаселены словамі свет.

То заціланькаюць балалаечна,
То замурлыкаюць, як каты.
Лаюць лаяльна,
Джаляць і лашчацца.
Словы — драпежнікі.
Словы — браты.

Скрынка прыёмніка —
ёмкай прыёмнаю
Слоў —
надзвычайных замежных паслоў.
Рушылі
у наступленне
бяздомныя,
Самыя грозныя арміі слоў...

З лесу, дзе часта знаходзілі сховы мы,
Робяць паперу, а не дамы.
І высяцца гмахамі стопавярховымі
Нованароджаныя тамы.

Гул дыфірамбаў стукае ў ямбы.
Самы агідны — ружовы паклёп...
Людзі, рыхтуйце высотныя дамбы:
Словы рыхтуюць сусветны патоп!

ЗІМОВЫ ЭЦЮД

Трэск марозны ў цішыні
Як выбух.
Кожны дзень малюе нездарма
Лісце пальмаў на аконных шыбах
Наша летуценніца-зіма.

Як вуголлі, з Афрыкі студэнты
Экзатычна чыркаюць аб лёд.
З посвітам сшывае кантыненты
Срэбная іголка —
Самалёт.

Вуллем пчаліным крама з ранку —
Соты сонцаў свецяцца з акон.
Мараканскі пакаштуй лімон —
І адразу ўбачыш Касабланку...

* * *

Уваходзяць, як законныя,
У кватэру жыхары.
Хто вы, хлопцы электронныя?
Вы рабы ці ўладары?

Горла — медная пасудзіна:
Заціхай у зале, шум!
Робат-лектар распаўсюджвае
Праграміраваны сум...

І з паставай незалежнаю
На нарадах — дай загад —
Рад узняць руку жалезную
Кожны робат-дэлегат.

У цікаўных шыі-хобаты,
Дзе ж такое ўбачыш ты:
Чалавека судзяць робаты
За злачынства дабраты...

Б'ём у ладкі мы з пашанаю:
Робат — гулкі вакаліст
Песеньку хрыпіць бляшаную,
Як заслужаны артыст...

Можа, я аб гэтым робаце
І апошні верш пішу?
Робаты, няўжо вы ўгробіце
Чалавечую душу?

* * *

Не кожны ў крытыкі здатны:
Іх пёры цяжкія, як пікі...
Трэба слова «выдатны»
Не зблытаць са словам «вялікі».

Трэба славу бядомную,
Якую не купіш у краме,
Замацаваць за вядомымі,
Каб маладыя не ўкралі.

За кожнага, хто велічаецца,
Трэба хварэць і трывожыцца.
Штосьці то вылічваецца,
То дадаецца, то множыцца.

Фарбы наносяцца ладна,
Нібы на твары касметыка,
Размеркаваны дакладна:
Крытыка — як арыфметыка!

Крытыка — мудрасць гнуткая,
Яна і суддзя, і прарочыца.
Можа, і з алгебрай хутка
Ёй падружыць захочацца.

Жадаем удач свядома ёй,
Няхай яе пёры не тупяцца,
Калі да задач з невядомымі
Нарэшце яна падступіцца.

* * *

І звяры
Сябруюць да пары.
Вось чацвераногія падлеткі:
З тыграм поруч леў, нібы сябры,
У краіне аб'яднанай клеткі.

Тут галаварэзы і цары
Гыркаюць, зусім як міралюбы,
Покуль вырастаюць кіпцюры,
Покуль моцы набіраюць зубы.

БОМБА

Камандавацъ прагне парадам
Надзьмутая злосна бомба,
Начыненая зарадам
Атамнага апломба.
Тупагаловая марыць,
Як яна ўрэшце трахне...
Хочацца ёй валадарыць
У царстве сусветнага страху.
Драла давай ад бомбы,
Амерыка і Еўропа,
У норы і катакомбы,
Пячоры пітэкантропа;
Падпальвай запалкай злосці
Моцы сваёй узрыўчатку,
І ў век каменны — у госці,
Каб потым — усё спачатку?..
Прарокі смерці,
давoлі!
Дай жа адбой, трывога!
Не застанецца ўдавою
Планета без роду людскога.
Ах, як у вантробах бомбы
Свярбіць зарад акаянны!..
А ці не лепей ілбом бы
Яе аб дно акіяна,
Дзе, у бязмежныя глыбы
Нырнуўшы, ад страху нямеюць
Падводныя лодкі —
рыбы,
Якія крычаць не ўмеюць.

ПЕРАД ПАЧАТКАМ СЕАНСА

Чаканне —
Маруднай пакуты пара.
Шасцелі ў фае
Газетныя цені.
Раяль зачахлёны,
Як кабура,
Бязгуччам сваім
Таміўся на сцэне.
Ды нечакана,
Ад маці крадком,
Дзяўчынка з падмосткамі ўпоравень
Выйшла.
І, пакланіўшыся зграбным кіўком,
Як тэнісны шарык,
Скокнула ўвішна.
І паплыла,
Паплыла,
Паплыла
Лодкаю хісткаю ад прычала.
Ручкай узмахвала, нібы ў крыла
Лёгкасць птушыную пазычала;
Нібы скідала спавівачы
Апекі, якою была скавана,
Нібы паляпвала па плячы
Пругкасць паветранага акіяна.
Звонкагалосы разбег ручая
Прымала
На міг прыціхлае мора.
Належала ўсім і была нічыя
Гарэза, што ў скоках не знала зморы.
І зала ззяла добрым святлом,
Што высякала дзяўчынка абцасам,
І нават маўчальнік раяль пад чахлом
Буркаў у такт
Прыструненым басам!

З кнігі
«ДОТЫК ДА ЗЯМЛІ»

(1968—1975)

* * *

Ёсць словы, што прасцей, чым двойчы два:
Зямля, вада, паветра і трава.
Але чаму ж, як вымаўляю іх,
Шчымліва перахоплівае дых?
Зямля —
Прытулак зла і дабраты,
Клубок расчараванняў і надзей,
Няма вышэйшай радасці ў людзей,—
Як адчуваць, што пад нагамі ты.
Вада...
Хоць я жыву на астраўку,
Над прорвай акіянскай глыбіні,
Тужу з няўтольнай смагай па глытку
Тваёй выратавальнай чысціні.
Але якім каштоўнасцям раўня —
Паветра, чым мы дыхаем штодня?
Звяры і людзі, дрэвы і кусты,
Мы ўміг загінем, калі знікнеш ты.
Пакуль з няўмольнай цвёрдасцю бетон
Бярэ планету ў шэры свой палон,
Я бласлаўляю ў ранак веснавы
Зялёны бунт, зялёны ўзлёт травы...
Я веру, што ніколі не міне
Усё, чым даражу і чым жыву.
Ці ж многа так прашу? Пакіньце мне
Зямлю, ваду, паветра і траву.

СЦЯГІ

Я ведаю, сцягі — для свята,
Для той хвілінай урачыстасці,
Што сэрцы адраджае свята
Раптоўным дотыкам вячыстасці.

Святліва далі расцвітаюць,
Калі над вулкамі заспанымі
З муроў і вокан вырастаюць
Яны вялізнымі цюльпанамі.

І ўжо тваёй душы патрэбу
Будзённымі не змераць меркамі.
Выходзіш спавядацца небу,
Прасветленаму феерверкамі.

Мы плошчу ботамі малоцім —
І твой абцасік тонка стукае.
Суседа кратаючы локцем,
З мінулым звязваеш наступнае.

Будзённую прагоніш скруху,
Нібы дакучлівага лёкая.
І толькі ў гэтым вечным руху,
Здаецца, блізка ўжо далёкае.

Замоўкнуць трубы, сціхнуць бубны,
Хай цішай нораў іх гартуецца.
Мы добра ведаем, што ў будні
Святочны ўзлёт сцягоў рыхтуецца.

* * *

Бацькі дзяцей дамоў гукаюць.
А дзеці ў гульнях несвядома
З двара бацькоўскага ўцякаюць
Усё далей, далей ад дому.
І пасівелыя заўчасна,

Бяруць да сэрца блізка мамы,
Што іх свавольнікі так часта
Прыносяць сінякі і шрамы.
І не спыніць ужо імкненне
У свет нязнаны — зорны вырай,
Нібы не ўладна прыцягненне
Зямной любві і ласкі шчырай...
На скроні срэбны снег садзіцца.
Галактыкі ў вышынях стынуць.
І гэтак цяжка пагадзіцца,
Што дзеці ўрэшце нас пакінуць.
Гарэзнікі, што з бойкім крыкам
Дэсант выкідвалі за весніцы,
Цяпер — у космасе адкрытым,
Цяпер — з калёсамі на Месяцы.
Пад вокнамі звінелі бомамі —
Удалечы расталі зоркамі...
Схіляючыся над альбомамі,
Мы свецім позіркамі горкімі.
Глыб акіяна сніцца рэкам.
І, як вялікія падзеі,
У сэрцах матак — гулкім рэхам
Сыноў узлёты і падзенні...
Ці ж ведалі, калі вучылі
Хадзіць сваіх нямоглых дзетак,
Што пойдуць перад іх вачыма
Свавольнікі далёка гэтак?

ДОТЫК ДА ЗЯМЛІ

На дрыготных вазах рыпелі мы.
У ракеты запрэглі час.
Колы лёгкія і прапелеры,
Нібы лёкаі, носяць нас.
Даль праз шыбы машын намацваем
Мы, ад хуткасці жмурачы зрок.
Ногі жаласнымі ўтрыманцамі
Просяць: дайце ступіць хоць крок...

Хіба годнасць сваю раняеце
Тым, што пешшу ў жыццё пайшлі?
Я не ведаю, з чым зраўняеце
Радасць дотыку да зямлі.
Басанож — па мурожнай ваколіцы,
Дзе нядаўна гуляла каса,
Дзе гаючымі голкамі колецца,
Пранікаючы ў сэрца, раса.
На загоне нагамі боўтай
Па-грачынаму спакваля
У раллі, як у чорных ботах,
У якія абула зямля.
Кожны бачыць: усё высокае,
Што да сонца з зямлі паўстае,
Гадавана глыбіннымі сокамі,
Галубінаю ласкай яе.
Не хачу я спрачацца з крыламі,
Што за воблакі нас узнялі,
Але ведаю — страцім сілу мы,
Адарваўшыся ад зямлі.
Нездарма, калі мы, яе родзічы,
Адлятаем, яна ў журбе
Нас па-матчынаму праводзячы,
Так прыцягвае да сябе.
Я люблю падарожжы далёкія,
Я адведзіны неба люблю.
Ды ўздыхаю заўжды з палёгкаю,
Зноў ступаючы на зямлю.

ПЛАТА ЗА ВЫШЫНЮ

Я зноў, я зноў на вышыні.
Я на адлегласці нязмернай
Ад мітусні, ад таўкатні,
Ад жонкі, вечным сваркам вернай.
Прашыў аблокі самалёт.
Такім адсюль здаецца дробным
Штодзённы свет зямных турбот,
На домік картачны падобны.

Маё мінулае за мной —
З надзеяй і дзіцячым плачам.
Якой вялікаю цаной
Палёт мой сённяшні аплачан!
Мінаў пакутна доўгі час,
Пакуль ірвалі пакаленні
Ланцуг зямнога прыцягнення,
Што, нібы вязняў, звязваў нас.
Мне ўслед чародкі дрогкіх дрэў
Самотна голлі заламалі...
Усе, хто ўпаў і хто згарэў,
На вышыню мяне ўздымалі.
Над лютасцю былых вякоў,
Над навальнічнай зморай хмары
Лячу на крылах дзёрзкай мары
Замучаных ерэтыкоў.
О горды дотык да нябёс!
Хвала вам, продкі, што не марна
За мой уздым свой страшны ўзнос
Жыццём выплачвалі ахвярна.
Цаной нясцерпных страт і бед
Мы збудавалі мост да сонца.
...Мне права на палёт — білет
За сем рублёў далі з аконца.

* * *

Май прынёс Перамогу.
У Маі расцвіў бэз.
У Маі прымаю трывогу,
Што тупае да парогу,
Без...
Без бацькі сын вырас.
Прыродзе наперарэз
Множыцца, быццам вірус,
Без...
Нага без нагі —
Пратэз.
Як рэха мінулага, стукае
У сэрцы і камяні.

Завея бяздомнай сукаю
Сціхла ўдалечыні.
Вуліцай у непагоду
Безвач народ ідзе.
Бездараж. Ад галалёду
Не ўратавацца нідзе.
Аўтобус, што коціцца роўна,
Зачыкільгае раптоўна
І панясе, панясе
Гэтак, што ахнуць усе.
Не ўтаймаваць гайданку.
Хіба не бачыце вы,
Як крутануў баранку
Вадзіцель без галавы?
У твары пранізліва хукае,
Разбегам збіваючы з ног,
Эра бязмерных хуткасцяў,
Эра люстраных дарог.
Лёс мой — шалёны аўтобус
Без тармазоў і руля.
За паваротам,
як глобус,
Выслізнуць можа зямля...
Множыцца страшнае «без»,
Быццам бязродны бес.
Вокны без шыбы.
Свет без падзей.
Мора без рыбы.
Дом без людзей.
Без...
Без...
Без...
Бездань, як позва.
Стойце — яшчэ не позна!

* * *

Забіўшы бога,
Чалавек сам
Уссеў на трон
Валадара сусвету.

І толькі тут адчуў,
Што спраўджаная мара
Стала яго бядой.
...Настолькі падоўжалі рукі мае,
Што імі
Пагладзіў цела Венеры
І нейкай яшчэ
Спакуслівай зоркі,—
За гэта мяне жонка,
Прыраўнаваўшы,
Выгнала з дому.
Сталі такімі відушчымі
Вочы мае,
Што я разгледзеў
У кошыку электронных арбіт
Залатое яечка —
Атамнае ядро...
«Ляцела мышка,
хвосцікам махнула...»
На шчасце, яшчэ
Не ўпала яечка,
На шчасце, на ім —
Залатая вуздзечка.
Мой боскі лёс так невыносна цяжкі,
Як бервяно, што на плячы мурашкі.
А я ўсё прагну даляў і хвалы,—
Такі вялікі і такі малы.

КУЛЯ І ЧАЛАВЕК

Абапал палі трымцелі,
Вецер па твары сек.
Навыперадкі ляцелі —
Куля і чалавек.

Ён уцякаў з палону,
Ён уцякаў з вайны.
Свабодны напалову,
Скокнуў з глухой сцяны.

Цягнулася міг кароткі
Шалёная крутаверць.
Першынства кулі ўсё-ткі
Засведчыла ў фінішы смерць.

Жалобна маўчыць узвышша,
Дзе ён упаў навек.
Хто ж пераможцам выйшаў —
Куля ці чалавек?

Сёння маячаць кроквы
Там, дзе гулі баі.
...Яго апошнія крокі
Крокамі волі былі.

* * *

Да раніцы з дум упарта
Белую пражу высноўваю,
Узяты пад зоркую варту
Бяссоніцаю вясноваю...
Чую —
Шукаючы выйсця,
Бунтуе прыглушана лісце,
Палоненае ў пупышцы,
Упіраецца ножкамі ў донца,
Каб у зялёнай успышцы
Вытыркнуцца на сонца.
Чую —
хор безыменны
Тых, што з вайны не прыйшлі,
Помніка крык каменны
Вырас да неба з зямлі.
Камусьці спакойна спіцца
За гарызонтам крыку.
. . . .

Спрабую ў трамвай прабіцца,
Быццам патрон у скрынку.

Загнанае, як у гета,
Выскаквае сэрца з грудзей...
Як расказаць пра гэта
Для ўсіх людзей?

ВЯНОК ЛЮБВІ НАРОДА

Максіму Багдановічу

Юначае душы парыў гарачы
І дум высокіх бліскавічны ўздым
Аддаў ты мужнай песні да астачы,—
Каб у жыцці застацца маладым.
Бой абвясціўшы бастыёнам гвалту,
Спяшаўся ты ў засмужаную даль,
Да незалежных гордых гор у Ялту,
Каб поруч быць з адвечным бунтам хваль...
Паслухай сёння, як у белы май,
Выходзячы гурбой на бераг стромкі,
Пяюць пра вольны беларускі край
Ткачыхаў слуцкіх вольныя патомкі.
Той, хто сваё акрыленае сэрца
Спаліў паходняй у імя жыцця,
Сярод жывых і зараз на паверцы,
Не падуладны цемры забыцця.
Прынеслі мы табе свой шчыры дар —
І дзе яшчэ вышэй узнагарода! —
Народных мар, народных дум пясняр,
Прымай вянок любві свайго народа.

АБЕДЗЕННЫ
ПЕРАПЫНАК

Службе сваёй кажу:
— Стой!
Пара за стол,
За абедзенны стол.

Час перапынку.
Гадзіна спачынку.
Нервы свае адключу ад турбот.
Заказваю ўсё, што належыць па чыну:
Боршч падагрэты,
Гуляш
І кампот...
Чакаю, пакуль апетыт не загіне,
Афіцыянтку, нібы багіню.
Чакаю, пакуль...
Посвістам куль
Далеч раптоўна мяне абдала.
Выбух і грукат.
Спачын укралі.
У пяці кроках ад стала
Падае бомба —
На тэлеэкране...
Руплівцы бяссонныя і непаседы,
З сябрамі далёкімі нездарма
Мы дзелім беды і дзелім абеды.
Сценаў няма. Сховішч няма.

* * *

За буднямі — нядзеля.
І зноўку — як спярша,
Калі табой, надзея,
Надзелена душа!
Ці ж не цябе шукаю
Я ў бездані на дне,
Саломінка, якая
Выцягвае мяне?
Я адсвяткую ўдачу,
Я патану ў журбе.
Усё на свеце страчу,
Усё, апроч цябе...
Не пакідай, надзея,
І летам, і зімой,
Майго жыцця нядзеля,

Надзел ратоўны мой.
Апушчаныя крылы
Ізноў разварушы
І дай мне ўзлётнай сілы,
Надзея — хлеб душы!

ТАБЕ, БАЦЬКОЎСКАЯ ЗЯМЛЯ

Агнём хрышчоны, кулямі апеты
Цябе, мой край, пазнаю і здаля:
Лісток кляновы на баку планеты,
Любоў і боль — бацькоўская зямля.
Будзь блаславёны кожны твой куток,
Прастор былінны ад Дзвіны да Сожа,
І Белавеж, і Нарач, як глыток,
Што наталіць тугу па моры можа.
І цытадэль над Бугам, дзе ў сінечы
Нясе паданні дымныя вада
Аб тым, як тут налегла нам на плечы
Вялікая Айчынная Бяда.
І купка ўдоў-сасёнак на пагорку,
Куды мой бацька, дзіўны чалавек,
Стаміўшыся шукаць у небе зорку,
Як у падполле, адышоў навек.
І бель садоў, што слепіць вочы ўночы,
І бусел, што клякоча над гняздом...
Зямля, куды пясчынкаю аднойчы
І я вярнуся, як у родны дом.
Даруй, што я дагэтуль не паспеў
Табе прызнацца, каб усе пачулі.
І ці сыны клянуцца нараспеў
У пачуцці да ўласнае матулі?
Хоць быў з табой і ў шчасці, і ў журбе,
Я не ўзлятаў на той таропкай хвалі,
Дзе, як наперагонкі, рыфмавалі
Сваю любоў грыбную да цябе.
Хіба аздобіш родную зямлю
Зіхотным словам, як партрэт аправай?
Сваёю кожнай чалавечай справай
Хачу сказаць табе сваё «люблю».

ЯШЧЭ РАЗ ПРА ЗОРКІ

Ведь, если звезды зажигают,
Значит — это кому-нибудь нужно?

Ул. Маякоўскі

Хочацца бачыць зорку —
З мараў мураў пагорак.
Бо вельмі сумна і горка,
Калі не відаць зорак.

Няўлоўны ваш цуд праменны,
Госці майго бяссоння.
Зніклі ў век каменны,
А ззянне даходзіць сёння.

Хіліць долу няспынна
Днём зямны клопат.
А потым выпроствае спіны
На вышыню попыт.

У поўнач, як сціхне праца,
І высі, імжой схаваныя,
У горадзе загарацца
Зоркі намаляваныя.

Пад носам тваім для аздобы
Фанернае неба павесяць.
І вокал тваёй асобы
Круцяцца зоркі і Месяц.

Але не доўга скоўвае
Цябе мітусня зямная —
Хваляю выбуховаю
Свет навіна скаланае.

Ізноў чалавек у космасе...
Дзень добры, мой лёс высакосны!
З нейкім крылатым адчаем
Мы вышыню прыручаем.

Ранічкай ля кіёска —
Строем бясконцае войска:
Стаім у чарзе за небам,
Як у вайну за хлебам.

* * *

Дапамога павінна быць хуткай,
Дапамога павінна быць ціхуткай.
Скажыце, каму па душы дапамога,
Што пра сябе трубіць многа?

Хочуць, каб іх да неба ўзносіць
За крошку хлебную, што пазычаць,
Не памагайце, калі не просяць,
І не прыходзьце, калі не клічуць.

Часцей сумленне сваё турбуйце,
Не зневажайце яго законаў.
Дапамагаючы, не патрабуйце
Хвалы ліслівае і паклонаў.

Дапамагайце,
як дождж палеткам,
Дапамагайце,
як пчолы кветкам.

* * *

Я заўжды з асалодай дзіўлюся,
Як гаспадыня
Перatrасае кватэру,
Праветрывае рэчы,
Як з-пад руплівай рукі
Навыперадкі
На балкон вылятаюць
Лянівыя дываны,
Сеннікі з пацярухай былога
І поўныя салодкіх сноў падушкі...
Наладзіўшы ім лупцоўку,
Выбіўшы палкаю пыл,
Яна пакідае іх
Сам-насам з ветрам і сонцам,
З небам і зоркамі...
Любуючыся гаспадыняй,

Я думаю пра сябе,
І мне здаецца, што душа мая
Падобна часамі на спальню,
Дзе так утульна спачываюць
Мары,
Якім да сонца ляцець,
Думы,
Якія свет скалануць,
Ідэі,
Што створаць зямлю нанова...
Адчыняю акно душы —
Трэба праветрыць
Яе заляжалыя скарбы,
Выбіць з іх пыл мінулага,
Даць глыток свежасці,
Каб не змарнелі
Ад кіслароднага галадання.

ПІРАТЫ

> Сучасныя імперыялісты — піраты
> дваццатага веку не грэбуюць ніякімі
> сродкамі ў дасягненні сваіх мэт.
>
> *З газет*

Піруюць піраты. Ракою віно.
А ўчора яшчэ пасцілі.
Піруюць піраты: сёння на дно
Яны карабель пусцілі.
Ад іх ратунку няма нідзе.
Накінуцца апантана
На судна, што ў моры адкрытым ідзе,
Бяруць за каўнер капітана.
— Куды ты гоніш на поўных парах?
Цісні хутчэй на тормаз!
І пасажыраў трасе страх
Дзевяцібальным штормам.
Паставяць да сценкі: мяняй курс!
За гэта жыццё даруем.

А будзеш упарціцца — да акул
Мігам камандзіруем...
І чутка знаходзіць ужо адрасы:
Піраты пажар тушаць.
Ну, а цвярозыя галасы
Свістам шалёным заглушаць.
А час забыцця карункі тчэ
І захінае страты.
Хвала дзівакам, што верань яшчэ
У дабрадзейства піратаў...
Яны зачахляць нажы да пары
(Піраты заўжды пры сіле),
А самі крычаць ва ўсе рупары,
Што іх пасажыры прасілі.

* * *

Перад дажджом
Зноўку і зноўку
Праводзіў пярун
Артпадрыхтоўку —
Ля самых вокнаў,
Ля самых дзвярэй
Бабахаў з усіх сваіх батарэй.
У перапудзе пусцее вуліца,
Прахожыя тлумна ў пад'езды туляцца,
Запоўненыя будзённымі думкамі,—
У абдымку
З партфелямі,
Папкамі,
Сумкамі.
Ад халадку,
Што задыхаў няроўна,
Затрапятала ў прысадах
Лістава,
І ўсё навокал замерла раптоўна
У чаканні напятым,
Як цеціва.
— Тук! —

І нясцерпную ціш узрывае
Першая кропелька дажджавая.
Хваля яшчэ — і ў наступ вялікі
Пайшла пераможна пяхота вады,
Затахкалі срэбныя чаравікі,
Свет затрымцеў ад пругкай хады.
Па бруку,
Па сценах,
Па даху,
Па цокалі
Тупалі,
Стукалі,
Грукалі,
Цокалі.
Пад каўняром натапыраным дзесьці
Горад стуліўся —
І толькі дзеці
Скакалі адны на зялёным улонні,
Працягвалі цёплым дажджынкам далоні,
З яснай усмешкай
На тварах асмужаных
Босыя бегалі бойка па лужынах,
Сябе адчуваючы на кані:
— Дождждык, дождждык, дагані!

* * *

Хочаце —
Пераніцую любога,
Новыя рысы надам спакваля.
Хочаце —
З вас зраблю бога.
Хочаце —
З вас зраблю караля.
І не ўсміхайцеся, калі ласка,
Я жартаваць зусім не прывык.
Я па службоваму абавязку
І па характару — чараўнік.
Калі вам сняцца чыны вайсковыя,

Калі вы з пароды гарачых задзір,
Якіх свабода цывільная скоўвае,—
Прымерайце свой генеральскі мундзір!
А вы, кірпатая, ў трэцім радзе
Станьце царыцаю харaства,
Перад якою з мальбой у паглядзе
Рыцары сцелюцца, як трава.
Каб вы пабачыць маглі ў люстэрку
Прывабнымі постаць сваю і твар,
Я клапатліва здымаю мерку
З вашых няўтольных жаданняў і мар.
Змена адзення — заўсёды падзея,
Заўсёды свята. Вядомая рэч,
Што сустракаюць нас па адзенню...
А хто не хоча добрых сустрэч?
Мастацтвам маім залюбуецца кожны:
Ходзяць, працуючы дбала на вас,
У пальцах маіх паслухмяныя ножны,
Якімі крою
Прастору і час...
Хтосьці пазычанае надзене,
І ўбачыш адразу: справа — швах.
І пачатковыя нашы надзеі
Трашчаць пачынаюць па ўсіх швах.
Таго, хто ролю чужую выконвае,
Падсцерагае сумны канец...
Гэта даводжу вам пераконана
Я —
тэатральнай майстэрні кравец.

* * *

І раптам снег, як навіна.
Злятаюць белыя ахапкі
На дах, на двор, на сінь акна,
На галаву маю без шапкі.
Гукаю ў думках:
— Добры дзень,

Чаканая неспадзяванка!
Хутчэй жа паліто надзень,
Мая дрыготная заранка.
Туды, дзе спіць завеяў свіст,
Нясі сваёй душы ўзрыўчатку.
І зноў жыццё —
як белы ліст.
І зноў усё пішы спачатку.

ЛЁС НАРОДА — КУПАЛА

Каб замкнуць пагарджанаму люду раты,
У турэмшчыкаў рук не хапала.
Сумным плачам жалейкі прарэзаўся ты,
Боль народа — Купала.
Песня тая, што спела пакутна ў душы,
Думнай долі сваёй не праспала.
Пракаціўся, як гром перуновы ў цішы,
Крык народа — Купала.
Свет пытаў у здзіўленні:
— А хто там ідзе?
З воч заслона туману апала.
Вырастаў упярэймы спрадвечнай бядзе
Меч народа — Купала.
У граніт берагоў біў маланкавы ўздым
Хвалі той, што, як гнеў, закіпала.
Дол і высь абручыліся з імем тваім,
Лёс народа — Купала.
Каб заўжды ты ўпрыгожваў сабою зямлю,
Каб віхура цябе не шчапала,
Я любоўю сыноўняй цябе атулю,
Сад народа — Купала.
Сёння зноў на вялікай штодзённай сяўбе
Слова-зерне, што ў сэрцы запала.
Мы нясём пакаленням наступным цябе,
Скарб народа — Купала.

* * *

Вучылі мяне з маленства —
Слухацца трэба.
За ўпартае непаслушэнства
Не раз пакідалі без хлеба.
Не споўніш загад бацькі,
Маткі, сястры, цёткі,
Новай пазбавяць цацкі —
Лялькі або бразготкі.
А то і паладзяць лазню
Аматару пасваволіць,
Паставяць у кут, як вязня,
На дзесяць хвілін зняволяць.
Іх словы лаві вушамі,
Употай сціскаючы зубы.
Чыняць над малышамі
Старэйшыя суд грубы.
Літасці аніякай,
Быццам па абавязку
За аплявуху — дзякуй,
Як за сваяцкую ласку.
Маленства мяне непакоіць,
Хоць выйшаў даўно з маленства,
А ўсё не магу засвоіць
Навуку паслушэнства.
Не памудрэў з узростам:
— Дурань! —
разумнікі енчаць.
Гэта ж зусім проста —
Укленчыць.

* * *

У травы
Забіраюць правы —
Хіба гэта не бачыце вы?
Аграмады няўмольных будоў
Выцясняюць траву з гарадоў.

Рэчка чорная ўдаль плыве
Па траве, па траве, па траве...
Пашырае ўладанні свае —
І няма берагоў у яе.
І кладзецца сцяблінка травы
Пад асфальт, як пад танк,—
Радавы.
І здаецца, па дзірване
Перагрэты прайшоўся прас.
І зубром згаладнелым мне
Зарычаць падмывае падчас.
На душы — каменнем туга,
Бо мурожнага астраўка
Не знаходзіць мая нага,
Не знаходзіць мая рука.
Я хвалююся, як і вы,
Нахіляючы галаву:
У травы
Забіраюць правы...
Заступіцеся за траву!

ДРЭВА

Дрэва
Не дрэмле,
Дрэнна
Без дрэва.
Добра, што блізка
Краіна Лес.
Дрэва —
Калыска,
І дрэва —
Пратэз.
Дрэва —
Дрыготнай сякеры
Далонь,
Дрэва —
Папера,
І дрэва —

Агонь.
Дрэва —
Слупамі да неба дымы,
Дрэва —
Жыцця спадарожнік нямы.
Трымаюся з вамі
І я на суку,
Які безаглядна
Сяку і сяку.

* * *

Прырода і сёння чаруе і радуе.
І ў горад яна прасекла акно.
Слухае жаўранка сын мой —
Па радыё,
Бачыць адлёт жураўлёў —
У кіно.
Па тратуары іду з авоськаю,
Дзе ўтульна бульбе і бураку.
Іду з авоськаю,
Нібы з вёскаю,—
Рука за руку.

Сын мой, што поруч,
Убачыць раптоўна:
Сцяблінка бетон прабіла бунтоўна,
Ад радасці ўскружыцца галава:
— Трава!
На моры асфальту,
Дзе без супынку
Нас духатою душаць дамы,
Як за саломінку, за травінку
Хапаемся мы.

* * *

Ты маўчаў тады,
як білі дружбака,
Білі словам,
як кастэтам адмысловым.
Ты мычаў сабе,
што слова не рука,
Не кулак і не нагайка.
Слова словам.
Але заўтра
пад прыцэл патрапіш ты,
Дзе ад слоў шукаеш схованшча
дарэмна.
І адчуеш,
як злачынства немаўты
Нас штодзённа забівае
узаемна.
Не ад куль —
часцей мы падаем ад слоў,
Кулі словамі апрануты,
як плацдем.
Невыносна ю цаной людскіх
галоў
За маўчанне палахлівае мы
плацім.
Потым будзеце старацца
напаказ,
Ды ці можа апраўдаць
перад сумленнем
Дабрата,
якую робіце не ў час,
Справядлівасць,
Што прыходзіць са спазненнем?
І мяне грызе часамі пачуццё,
Што адпушчана гадоў
па норме строга.
Але знаю,
на паўторнае жыццё
Не пакінуць перавучвацца
нікога.
Каб у тых, што поруч з намі,
не забраў

Усявышші
                чалавечае цярплівасці,
Не адкладвайце на потым
                                добрых спраў,
Не адкладвайце на потым
                                справядлівасці.

* * *

Трубілі гучна оды
Мы з захапленнем школьніка:
Няхай жыве заўсёды
Саюз каня і конніка...
Наканавана коням
Быць у яздзе апораю.
Прыцішацца — падгонім
Убок сталёвай шпораю.
Мы ўладаю надзелены,
Як закілзаць іх, знаем.
За павады надзейныя
Гарачых падцінаем.
А што,
        як не захочуць
Каманду нашу выканаць?
Уздыбяцца, падскочаць,
З сядла гвалтоўна выкінуць...
Але, як сон, забудзецца
Падзенне выпадковае.
І прага ехаць будзіцца —
Каваль каня падкоўвае.
І —
      скачкі, скачкі, скачкі —
Грымотныя ўспаміны.
Увысь над ставам качкі —
Нібы ад страляніны.
Зноў цокат ля сасонніка
І наўздагон за эраю —
Палёт каня і конніка...
Ах, дзе ты, кавалерыя?

Я З ВЁСКІ

Вуголлем у мае страляе сны
Касцёр вясны, што не паспеў ачахнуць.
Я выйшаў з вёскі, выйшаў з баразны,—
І ворывам мае далоні пахнуць.
Смыляць дасюль на пальцах мазалі,
Набраклыя цяжкой п'янлівай стомай,
Майму нашчадку сёння невядомай...
Паўстаў я жытам да святла з зямлі!
На вішнях цвет пад вечар закіпаў,
Духмяны, нібы пена сырадою,
Калі я рукі ў баразне купаў,
Перш як абмываць крынічнаю вадою.
Я, аратай, абуджаны вясной,
За плугам дыбаў цяжка і бясконца,
Нібы з канём у вупражы адной
Выцягваў з цемры воз зямны да сонца...
Я спасцігаў навуку вышыні,
У цёплай глебе грузнучы па пояс.
Працягваю і ў сённяшнія дні
Жыцця майго жытнёвую аповесць.
Стаяць нябёсы на маім плячы.
Калі б, зямля, ты не дала мне хлеба,
Ці змог бы дацягнуцца я да неба,
Аб зорны келіх губы апячы?

* * *

Ураджай, ураджай —
Ходзіць ніва пад ветрам ходырам.
— Пры-яз-джай!..
Так і цягне п'янлівым водарам.
І расступяцца ўраз жыты
Перад тымі, каго паклічуць.
Тут губляемся
Я і ты,
        губы нам каласы казычуць.
Хваляй шум набягае здаля...

А ці знаеш, якім насеннем
Засявалася гэта зямля
Днём вясеннім і днём асеннім?
Не іду, а кудысьці плыву,
Анямеў — пераймае голас.
Трапяткою рукой сарву
І скамячу даспелы колас.
На далоні — зярнят янтар...
Але ведама толькі полю,
Колькі тут на кожны гектар
І крыві, і стогну, і болю.
Неспакойная мітусня
Каласоў, што схавалі сцежку...
Дзе вы, сейбіты? Цішыня.
Дот размыты маўчыць на ўзмежку.

ПРАЦУЙ, РАЗЕЦ СВЯТЛА

Я раніцою кожнай, як дзіця,
У захапленні адкрываю вочы
На непаўторны вечны цуд жыцця,
На свет, які штодзень выходзіць з ночы.

Пастукае прамень ціхутка ў шкло,
І ў норы цені ціснуцца, як лісы.
Усё наўкол, што цемраю было,
Набудзе зараз контуры і рысы.

Нібыта з-пад рукі чараўніка,
Ўвышыню раптоўна пырхне птушка,
Прарэжацца лістота і рака
Зазіхаціць, як трапяткая стужка.

Прачэрчацца паверхамі дамы,
Успыхнуць стоаконныя вітрыны.
А з каміноў барадачы-дымы
Выскокваюць, нібы з бутэлек джыны.

Прыходзь, прамень, ва ўсе куткі зямлі,
Туманам ахінутыя старэчым,

Аголенаю праўдай прасвятлі,
Вярні аблiччы страчаныя рэчам.

Працуй, разец святла — мая радня,
З людзьмі ў цябе адвечнае сваяцтва.
Чароўным добрым дотыкам штодня
Вяршы сваё высокае мастацтва!

* * *

Я па бяду
Не пайду —
Ратункам сябе суцешу!
Камень цяжкі знайду,
На шыю бядзе павешу
І кіну бяду —
У ваду!
І, выцершы пот на ілбе,
Пачну жыццё без замінкі
І нават, бяда, па табе
Вясёлыя спраўлю памінкі.
Скончана наша дружба!
Ды што там трымціць на вадзе?
Выратавальная служба
Кінула круг бядзе...
Дзякуй за подзвіг!
Адсвяткавалі. Пойдзем.

ВЫХАДНЫ

Дзень добры, выхадны:
Бярозы, біце ў бубны!
Парады ў нас адны —
Таксама, як і будні.
Да росных мурагоў,

Да дрэў і птушак весніх,
Як рэкі з берагоў,
Са сцен выходзім цесных.
Ускінулі гаі
Галін зялёны парус.
Душу сваю гаі
Яго дыханнем зараз.
Ад духаты кватэр,
Ад чаду вуліц тлумных
Лячы сябе цяпер
Жывіцай сосен думных,
Пяшчотай дрогкіх траў,
Бязмежнасцю прасторы,
Якую ў нас украў
Заслон аконнай шторы...
Выходзь з былых граніц,
З утульнай хатняй плесні
Да чысціні крыніц
Твайго жыцця і песні.
Выходзь у выхадны
І адшукаеш выйсце,
Як зерне з баразны.
І як з пупышкі лісце...
Здароўем мімаходзь
Цябе вятры напояць —
Выходзь, выходзь, выходзь
Да вечнасці на споведзь!

* * *

Ці многа ў маленстве трэба?
Ласкі.
Казкі.
І хлеба.
Ды крылы,
Каб з неба зорак
Прынесці на свой падворак.
Хлеб здабываў татка.
Ласку дарыла матка.

Казку бабуля адкрыла.
А мара давала крылы.
Бацьку спаткаць улетку,
Калі ён вяртаўся з палетку,
Я вылятаў за браму...
Бацьку вайна забрала.
Не ўмела бегаць матуля
Хутчэй, як шалёная куля,
Што секанула ля плота
З варожага самалёта...
Бабуля ўзваліла на плечы
Адна — за бацьку і маці —
Нялёгкі цяжар чалавечы
Штодзённых турбот у хаце.
Бабка маліла з любоўю
Бога, каб даў здароўя.
Глухі ж валадар неба
Не ведаў, чаго ёй трэба...
Палілі і распіналі.
Толькі былі не ў сілах
Паставіць да сценкі ў фінале
Мару маю аб крылах.
Мяне над смуткам і горам —
Хоць і на міг кароткі —
Крылы ўздымалі к зорам,
Таму я і вырас усё-ткі!
Без ласкі.
Без казкі.
Без хлеба.
Ці многа ў маленстве трэба?

* * *

Ракеты і аўтамабілі
У нас адлегласць узялі,
А мы, здаецца, разлюбілі
Хадзіць нагамі па зямлі.
А мы забылі, як у полі,
Калі ступаеш басанож,

Ласкава дражніцца і коле
Травінка вострая, як нож.
Усё, што робіць незалежным,
Усё, чым дыхаем усе,
Сваім намеснікам жалезным
Перадаём мы пакрысе.
Яны за нас глядзяць і ходзяць
Па роўнядзі бетонных трас,
За нас шукаюць і знаходзяць
І нават думаюць за нас.
Ах, як нам быць з заўчасным раем?
Душа чарсцвее, як калач,
І чуецца за небакраем
Жалезны смех, жалезны плач.
У непазбыўнай паняверцы,
Стаіўшы подых, ловіць час,
Як перасаджаныя сэрцы
Стукочуць у грудзях у нас.
І ў нейкім утрапенні сінім
Жалезны сум нутро скрабе:
А што мы ў рэшце рэшт пакінем
Самім сабе,
Самім сабе?

МІНЫ

Якія ў вас на тварах міны,
Які агонь душу пячэ,
Калі здымаеце вы міны,
Што ўчора ставілі яшчэ?
Згубіў ужо свае правы
Пірацтва вопыт непатрэбны —
Здымайце сорам той ганебны,
Якім сябе пакрылі вы.
Тут смерць, што дрэмле ўглыбіні,
Бабахнуць можа ў міг адзіны.
Як кажуць, пры благой гульні.
Не зробіце вясёлай міны.
Заслон варожасці і зла,

Які вы ўзводзілі старанна,
Паў ад народнага тарана —
Вы бачыце, чыя ўзяла?
Праз джунглі грому і метала
Дарогай горкіх ран і страт
У час даходзіў, што б ні стала,
Да друга друг, да брата брат.
Хто там употайкі яшчэ,
Люляючы вайны ўспаміны,
На сцежках згоды ставіць міны,
Сіло для новай змовы тчэ?
Давайце поле душ прапалем
Ад зла былога спакваля,
Каб непраходным мінным полем
Не стала заўтра ўся зямля.
Хай адступае небяспека
На трасах сушы і вады,
Каб чалавек да чалавека
Ішоў бязбоязна заўжды.

БЯРОЗА

І гаспадыняй і рабою
Ты нечакана станеш мне,
Калі святло тваё рабое
Душу пранізліва кране.
І я ўзыходжу зноў на сопку,
Дзе наталяе голад мой
Глыток бярозавага соку,
Глыбінны смак зямлі самой,
Не дай мне абмінуць удачу
І завядзі ў гушчар лясны,
Дзе я ў святле тваім убачу
Маёй удачы цуд грыбны.
Тут, дзе была ты сувязною,
Мне адшукаць ізноў дазволь
На выцвілай бяросце мною
Накрэслены штыком пароль...

Як і цябе, мяне шчапала
Бяды ваенная пара.
Ды я не ўпаў і ты не ўпала
Перад пагрозай тапара.
Працягвай мне свяціць бясконца,
Гаючай ласкай атулі,
Маё бярозавае сонца,
Высокае святло зямлі.
Калі вятры гадоў астудзяць
Гарачыню майго чала
І лёс мяне на ноч асудзіць,—
Пазыч цяпла, пазыч святла.
Над галавой маёй, бяроза,
Нязгаснай свечкай засвяці
Так нетаропка і цвяроза,
Як ты мне свеціш пры жыцці.

* * *

На берагах былінных Свіцязі,
Спавіўшы хмарамі чубы,
Стаяць, як казачныя віцязі,
Шыракаплечыя дубы.
А вецер часу выпрабоўвае
Іх вытрымку, іх строй лясны.
Ды з непахіснасцю дубоваю
Вартуюць скарб жывы яны.
Сюды не падступіцца ворагу.
Дрыготным невадам удач,
Пясняр, лаві ў бяздонні возера
Паданняў звонкіх смех і плач.
І адыходзяць небяспечнасці,
І даспяваюць жалуды...
Замры перад дыханнем вечнасці
У трапяткім святле вады.

* * *

На вішнях —
цвет густы.
Шчасліваю парою
Спаткаліся браты
Не па крыві, па зброі,
Браты па той бядзе,
Браты па той паверцы,
Што з году ў год ідзе
І стукаецца ў сэрцы.
І грудзі аднаму
Пяклі асколкі мукі:
— Ах, як вас абдыму?..
Вайна забрала рукі.
Другі нямеў,
як звон,
Як абабіты колас.
Як усміхнецца ён?..
Вайна забрала голас.
А трэці быў бы рад,
А трэці быў ахвочы
Загаласіць ад страт —
Вайна ж забрала вочы.
Вы, што бачыце,
Што ў горы людскім рыбачыце,
Вы, што чуеце,
Што на падушках з пораху начуеце,
Ці бачыце кулак бязрукіх?
Ці чуеце
Крык бязгубых?
Ці чуеце
Плач бязвокіх?
На вішнях —
цвет густы.
Шчасліваю парою
Спаткаліся браты
Не па крыві,
па зброі.

* * *

Мяняю
трохпакаёвае шчасце
з вадой гарачай у ванне
на юначае
акіянскае
хваляванне.
На мураву трапяткую і росную
мяняю
коўзкую гладзь паркету,
мяняю
славу узнёслую
на талент,
яшчэ не адкрыты свету...
Мяняю
на смолкую баравіну
набітыя пыльным скарбам каморы,
мяняю
мора на ручаіну,
якая марыць аб моры.
Гэй, вы,
хто ловіць удачу ў рацэ,
мяняю
адданы кухоннай патрэбе,—
сініцу ў руцэ
на жураўля ў небе!

* * *

На моры — бура, на сушы — ціша.
Над сушай — ясна, над морам — хмары.
На моры хваля крылом калыша
Счарнелы парус блакітнай мары.
Завербавала душу гайданка,
Дзе міг і вечнасць у паядынку.
Ах, бура, бура — мая каханка,
Як страшна вабяць твае абдымкі!
Я буду потым, у пырсках белых,

Калі стыхія мяне аглушыць,
Як паратунак, лавіць той бераг,
Дзе аўдавела, сумуе суша.
Той чорны човен, які чакаю,
Там пахавае бяздонне зараз.
Чаму ж у буру ізноў пускаю
Блакітнай мары юнацкі парус?

* * *

Хаця насення меней, меней,
А трэба сеяць поўнай жменяй.
І не вядома, колькі зерня
Зямля ў твае далоні верне.
Палетак песцячы раўніва,
Пра стому сейбіт забывае.
Адлегласць ад сяўбы да жніва
Даўжэй за век людскі бывае.
І не ганебна пакланіцца
Баразнам, як адменным вершам,
Калі мы хлеба таямніцу
З самой зямлёй у згодзе вершым.
Выкідвай зерні дарагія,
Пакуль жыццём набракла глеба.
І нават хай пажнуць другія,
А трэба сеяць.
Сеяць трэба.
І шчодра так і так прыгожа,
Як дождж у маі сеюць хмары.
Калі ў сяўні забракне збожжа,
Пасееш зерне добрай мары...
Сячэ палеткі град і вецер:
Старэе свет —
зямля лысее.
І шчаслівей за ўсіх на свеце
Не той, хто жне, а той, хто сее.

* * *

Выбачай, што не знаю імя тваё, птах,
Невядомы спявак, безыменны саліст,
Рассыпаючы звонкае дзіва ў кустах,
Скачаш з дрэва на дрэва, з ліста на ліст.
Ты збудзіў мяне дотыкам неба ад сну,
Расчыніўшы на досвітку дзверы ў вясну,
Я, аглушаны пошчакам срэбным, стаю,
У пакой упускаючы песню тваю.
Ты вясёлаю нотай сваёй цішыню
Пранізаў, нібы промень, што бліснуў з-за хмар,
Падарыўшы зямным слухачам вышыню
Летуценняў блакітных, агучаных мар.
Заціхае ў зняменні трава і ліства,
Заміраюць і людзі, і дрэвы наўкол,
Калі ты запяеш, уладар хараства,
Недасяжнага неба крылаты пасол.
Гаспадыня, не ў сілах стрымаць пачуцця,
Да акна падаецца ад дымнай пліты.
Угару галаву задзірае дзіця:
— Звонкі песенны цуд, дзе хаваешся ты?
Гэй, паслухай, няўлоўная пташка, прашу,
Я табе адкрываю, як сябру, душу.
Я таксама над песняй не сплю да відна —
Ды чаму чалавецтва не будзіць яна?
Таямніцу мастацтва свайго адамкні,
Навучы вышыні, навучы чысціні.
Навучы, як трымацца ў палёце заўжды,
Навучы, як, адводзячы хмары бяды,
Ад зямлі да нябёс працягнуўшы струну,
Славіць вечнаю песняй жыццё і вясну!

* * *

Ні подыху палёў,
Ні дроў, ні вугалёў,
І жар даўно ачах.

. . . .

Але гарыць ачаг!
Цяжкой пліты далонь.
І столь над галавой.
Выконвае агонь
Адвечны танец свой.
Ні вугалёў, ні дроў.
А ўсё-ткі не пагас!
Нібы да сэрца кроў,
Бяжыць блакітны газ.
Ачаг і чалавек
Паўсвету абжылі.
Ад рук тваіх спрадвек
Цяплее на зямлі.
Рыўкамі ўвышыню
Шугаюць астраўкі
Рахманага агню...
Рука, шукай рукі!
Над чыгунком — кругі:
О водар бульбяны!
З нябёс глядзяць багі —
Іх дражніць дух зямны...
Пільнуй каля пліты
Ачаг. А то ўцячэ.
Вада, агонь і ты.
Чаго яшчэ?

ДОМ СЯБРОЎ

Камяні, якімі продкі
Прабівалі сабе чэрапы,
Пакладзіце ў падмурак,
Закапайце глыбока,
Каб уцячы не надумалі
У век каменны.

Сцены змацуйце металам,
Што калісьці начамі
У пірацкіх руках
Намацваў сэрца суседа.

Дзверы зрабіце шклянымі,
Каб не ўпускалі
Толькі вецер і сцюжу,
А замкі і ключы
Здайце ў музей старажытнасці.

Дах пакіньце адкрытым,
Дах накрыйце блакітам,
Каб зоркі віднеліся
І жыхарам не давалі
Згінацца і горбіцца,
Каб хатнія гаспадыні
Маглі
Разліваць у талеркі
Радасць
Палоннікам Вялікай Мядзведзіцы.

Будуйце дом сяброў.

* * *

Шуфляда мая да рэшты
Напакавана — хоць рэж ты,—
Не можа паперка ўлезці...
Пара пераграсці.
Перабіраю і ўзважваю
Багацце сваё калішняе.
Здавалася, некалі важнае,
А вылятае, як лішняе.
Яшчэ на парад просіць
Туды, дзе людскія калоны,
Пацёрты зліняды пропуск,
Што некалі быў чырвоны.
І пісьмы ад даўняга сябра,
І адрасы каханак —
Часу няўмольная швабра
У кошык змятае — пад ганак.
І з папяровых затонаў,
Як рэха былога бяссоння,

Ляцяць нумары тэлефонаў,
Глуханямыя сёння.
Шпурляю на вецер асенні
Неадасланую скаргу...
Дзень добры, землетрасенне
Майго заляжалага скарбу!
Усё, што цяпер не месціцца
У доміку цесным з дошак —
Хвіліны, і дні, і месяцы —
У кошык ляцяць,
У кошык...

* * *

Кожная сцежка
Шукае дарогу
І знаходзіць яе па-свойму,—
То пятляючы доўга
Між купін і хмызняку,
То пераскокваючы гулліва
Пагоркі і яміны,
То абвіваючы дрогка
Стромы каменныя
Над абрывам,
То з разгону — наўпрост...

Свой бег паскараючы,
Сцежка зусім не думае,
Што, дасягнуўшы дарогі,
Загіне сама
Пад спрасаванаю гладдзю
Асфальта...

Сцежкі,— як карані, што
Прабіраюцца ў цемрадзі
Падзямелля,
Сок несучы да камля.
Каранёў не відаць,

Але ці ж не яны
Ад працы счарнелымі пальцамі
Дрэва трымаюць,
Не даюць яму ўпасці
Пад націскам ветру,
Які штодзень змяняе кірунак?
Дзякуй сцежкам,
Якія нястомна шукаюць дарогу,
Дзякуй дарогам,
Якія цярпліва чакаюць сцежак.

* * *

Прыйшоў я з ночы і вярнуўся ў ноч.
О катаванне дзённага бяссоння,
Не дай, не дай пагаснуць сонцам воч.
Хвала святлу, якое ззяе сёння!

* * *

На зямлі заселеных лясоў
Спеў і брэх ідуць за мной усюды.
Я жыву між салаўёў і псоў,
Ад якіх мне не ўцячы нікуды.

Гэтак лёс часамі страсане,
Што гатоў сабакам заскуголіць.
Але голас салаўіны мне
На карачкі ўпасці не дазволіць.

А калі ад песні салаўя,
Што захопіць сэрца да астачы,
У вышынях закружуся я,—
На зямлю вяртае брэх сабачы.

Гукі, што з трывогаю лаўлю,
Больш мяне палохаюць, чым цешаць.
Як спяваць салісту салаўю,
Калі псы, задраўшы пыскі, брэшуць?

Хоць абрыдлы брэх даецца ў знакі
Песнярам крылатым у гаі,
Думаюць з палёгкай салаўі:
— Добра, што не лётаюць сабакі...

ПАВЕТРАНЫЯ ЗАМКІ

Гараць паветраныя замкі,
Прыгожыя, як Кардыльеры.
Трашчаць паветраныя брамкі,
Трашчаць паветраныя дзверы,
Трашчаць паветраныя фарбы.

Гараць і паратунку просяць
Мае паветраныя скарбы:
— Ах, што выносіць?
— Што выносіць?
Як гэта страшна ўбачыць попел,
Прачнуўшыся аднойчы раннем.
Я сам душой, аброслай потам,
Іх будаваў з такім стараннем.

І з губ маіх злятае:
— Мама...
А ў сэрцы д'ябал круціць жорны:
Была вясёлкавая гама,
І вось адзіны колер — чорны.

Трапеча розум мой падсудны:
Няўжо інакш, як вуголлем,
Мы не напішам дзень наступны,
Схаванай праўды не аголім?

Ва ўсе блакітныя напрамкі
Агонь шугае выбухова.
Гарадь паветраныя замкі —
І спіць пажарная ахова.

РАМОНТ

Няхай жыве рамонт!
Бразгочуць вокны, дзверы.
Рамонт, як гулкі фронт,
Праходзіць па кватэры.

Пакояў перакрой.
Спакою перакоўка.
Грымотнаю гарой
Злятае ўніз тынкоўка.

Скрыгоча цвік-прасцяк,
Якім дыван прыбіты.
Не выцягнеш ніяк,
Як мешчаніна з быту.

Ступае па двары
Пыл, як вярблюд сутулы.
Нагамі дагары —
І столікі і стулы.

Патрушчаны датла
Парадак учарашні.
Хвала табе, хвала,
Пераварот дамашні!
Як трэба страсянуць
Падчас былыя скарбы,
Каб потым удыхнуць
П'янлівасць свежай фарбы.

Вывешвае рамонт
Свае сцягі — шпалеры.
І, як бяскроўны фронт,
Праходзіць па кватэры.

УСТУП У ЦЫРК

Натоўп, нібыта ў бляху,
Стукоча:
— Туп-туп!..
У бубен сэрца бахае:
Пара пачаць уступ.

Рэклама так дрыготка
Дзярэ каля двара
Неонавую глотку:
— Пара, пара!

Гадзіннікам пясочным
Уступ у цырк.
Па аднаму прасочваемся:
— Цырк-цырк...

Бясконцым ціснем цугам,
Трашчыць праём дзвярны.
Выратавальным кругам —
Манеж маны.

То ўверх, то ўніз арэлі —
Куды нас павядзе?
На цыркавой арэне
Кругі, як па вадзе.

Тут абскакалі планы —
Запамятаць прашу! —
Па выпуску туману,
Па выпуску падману
На кожную душу.

* * *

Вышыні нам даюцца з боем —
Ці ты стары, ці малады.
Не патурай уласным болям,
Не паўтарай свае сляды.

Не пераймай таго, хто важна
Хвалой ліслівай лашчыць слых,
Становячыся незаўважна
Рабом сваіх удач былых.
Хай, закасаўшы рукавы,
На свой партрэт наводзіць глянец
Самазадаволены ўтрыманец
Заслугі даўняй — удавы.
Калі настойлівая стома
Салодка хіліць на спачын,
Даводзячы, што ты ўжо дома,
Ступі яшчэ хоць крок адзін.
І, як нязнаная планета,
Гукне зямля далей ісці...
Адчуеш ты, што, мо̀жа, гэта —
Галоўны крок твой у жыцці.

* * *

Нібыта наўздагон,
За хвалямі хвалі стукочуць.
Як на вагон вагон
Адна на другую наскочаць.

Гулам бягучай вады,
Дзе спяць да пары небяспечнасці,
Ты клічаш мяне заўжды,
Мора —
цягнік вечнасці.

* * *

Тут ахнуў бы, напэўна,
Сам Радэн,
Калі б пабачыў
Гэты цуд каменны,

Што вытачан
З такім майстэрствам тонкім,
Аж хвалі ўсе
Збягаюцца сюды,
Каб у паклоне
Перад ім
Разбіцца.
Як лёгка мне ўздымаць яго
Над морам
На п'едэстале ўласнае далоні!
Я штосьці пазнаю ў каменных рысах,—
Хто гэта:
Бог Нептун, рыбак ці мой двайнік?
І я гляджу,
Нібы зачараваны,
Спрабуючы дарэмна разгадаць,
Адкрыць твайго майстэрства
таямніцу,
Вялікі неўміручы скульптар,—
Мора.

* * *

Чаму ў марудных муках
Гук запева
Шукае губ — адзіны выхад свой?
О некрануты чысты ліст паперы,
Баюся белай магіі тваёй.
Як атуліць
Цнатлівасцю душу,
Расхрыстаную
Ветранай эпохай.
І я з надзеяй стоенай
Прашу:
Палохай, некрануты ліст,
Палохай.

* * *

Надыдзе хвіліна важная —
Паклічуць да справаздачы.
І я з хваляваннем узважваю
Удачы свае і няўдачы.
Узважваю радасць і гора.
У нейкім нервовым шале
Скачуць то ўніз, то ўгору
Напераменку шалі.
Тут поруч і гонар і горыч,
Сябры і ворагі поруч.
Шпурляюць у знак увагі
На трапяткія вагі
Адны —
мой здабытак няважкі,
Другія —
мае прамашкі.
Кладуцца чаргой нястомнаю
За промахам перамога.
І асвятляецца цёмная
Кладоўка майго былога.
Узважваў удачу, няўдачу,
Мераў глыбіні ворыва,
А падлічыў, бачу,
Толькі сяброў і ворагаў.

* * *

Баішся, што мяжу
Аднойчы пераскочу?
Скажу, каму служу,
Скажу, адкуль не збочу.
Дзень навіной буджу,
Як тэлеграф дармовы.
Скажу, куды гляджу
У прадчуванні змовы
Зярнят і баразны,
Садоў і пчол руплівых,

Напятае струны
І пальцаў нецярплівых,
Плаціны і ракі,
Што падмывае штосьці...
І хай усе шпікі
Палопаюць ад злосці!
Пайшоў, нібы ў ваду,
Іх непатрэбны клопат...
Я сам сябе вяду
У заўтра, як на допыт.
Скажу, чым даражу,
Як хлебам, як паветрам
За небакрай імжу
Зялёным гоніць ветрам.

ШТОРМ

Хто бачыў бунт
Раз'юшанай вады,
Закутай у граніт?
Палоненае берагам
Рычыць і кідаецца
Мора
З лахматай лютасцю ільва,
Што марна прагне
Вызваліцца
З клеткі.

* * *

У жонкі на твары — важнасць.
Зрэнкі блішчаць, як джальцы.
Штосьці заўсёды вяжуць
Яе рухавыя пальцы.
Можа, маломy штонікі,

Можа, пальчаткі для дочак...
Цягнецца нітка тоненька,
Размотваецца клубочак.
Як дотык ратоўнай казкі,
Нас атуляе надзейна
Пража яе ласкі,
Яе пяшчоты адзенне.
Рана да сонца ўстане —
І ад пруткоў-праменняў
Займаецца дрогка світанне:
Тэрмін начы паменеў!
Штосьці спрабую ўзважыць,
Але не ўзважу, вядома,
Дзіва, якое вяжуць
Пальцы жаночыя дома.

* * *

То шоўкам касынак касых,
То бляхай плашчоў лапочаце.
Вецер датычыць усіх,
Хочаце вы ці не хочаце!

Зялёныя астраўкі,
Чаромхавая каранацыя...
Лагодна рука да рукі
Так незнарок дакранаецца...

І не ўмяшчаюць сады
Спозненых пастаяльцаў.
Спеляцца вішняў плады
У завязі цёплых пальцаў.

Хоць ноч па зямлі ідзе,
Ад квецені светла да раніцы.
Не могуць схавацца нідзе
Абраннікі і абранніцы...

Іх, як сябе саміх,
Спаткаеце вы і збочыце.

Вецер датычыць усіх,
Хочаце вы ці не хочаце.

Шчоўкаю ў лад салаўю:
Песняю сэрца заселена...
Сонца прыгоршчамі п'ю!
Ветрана. Молада. Зелена.

* * *

Я думаў, ты мая турбота
Лятучая, як ранкам дым.
А ты — высокая работа,
Маёй душы пакутны ўздым.
Я думаў, ты глыток паветра,
Гаючае святло расы.
А ты — гарачы подых ветру,
Якому рухаць парусы.
Я ўпотай думаў, ты ў прыполе
Адданы мне румяны хлеб.
А ты — няўзоранае поле,
Ты не крануты плугам стэп.
Я думаў, ты цяпло кватэры,
Дзе ўдвух люляе цішыня.
А ты — зачыненыя дзверы,
Якія адмыкаць штодня.
Ты — нібы скарб, любоў мая,
За сургучом сямі пячатак.
Ах, як наіўна думаў я,
Што ты вянец. А ты пачатак.

* * *

Давай у гарэзным шаленстве
Рэха сваё паклічам
У лесе, нібы ў маленстве,
Зялёным і таямнічым.

Нас прыме гушчар глыбокі,
Краіна лагоднага шуму.
Гукнём мы: — Дзень добры, уцёкі
Ад мітусні і тлуму,
Ад грому ракетнай эры,
Ад паляўнічага вока
Суседа майго па кватэры,—
У каралеўства воўка!
Суніца, якую сустрэнем,
На вуснах салодка растане.
Дзень пад сасновым ценем
Шлюбнаю ноччу стане.
Трушчым сухую іглiцу,
Якая страляе, як порах.
Не выдасць ніхто таямніцу
Сэрцаў, што стукаюць поруч.
Змоўклі сарокі-трашчоткі.
Лісы пабеглі да нораў.
Мне даспадобы ўсё-ткі
Ляснога насельніцтва нораў.
Травінка трымціць трапяткая
У дзірцы прастрэленай каскі
Аб тым, як зямля чакае
Спозненай ласкі.

ВАДА І БЕРАГ

У пошуме тваім,
у пырсках белых —
то стогн глухі,
то ціхае ныццё.
Скажы, вада,
чаму свой родны бераг
і точыш, і грызеш усё жыццё?
Адкуль бярэ ён цвёрдасць і цярплівасць,
каб утаймоўваць нораў твой круты?
Што без яго абдымкаў
значыш ты,
сляпая і бяздумная вірлівасць?

РУЖА

У кветніку за агарожай
Яна ад летняга цяпла
Такою казачна прыгожай
Аднойчы ўранку расцвіла.
І ўбачыла ў святле ружовым
Усё наўкол, усё наўкол.
У водары яе мядовым
Трымцелі млява высь і дол.
Тут і дарослы і падлетак
Цвярозы свой спакой губіў
І ружы, як царыцы кветак,
Паклоны ў захапленні біў.
Яна ж, хаваючыся ў вецце,
Захоўвала духмяны цвет.
Люляў яе ружовы вецер,
Ружовы лёс, ружовы свет,
Пакуль не шуснула раптоўна
Рука садоўніка ў лісцё...
І абарвалася гвалтоўна
Яе прыгожае жыццё.
Як берагла руплівa ружа
Сваёй красы цнатлівай бель!
І вось пачула з вуснаў мужа,
Што ёй цана — адзін рубель.

ВАЗА

Дарыла мне жанчына вазу
Усёй істотай трапяткой —
І подых музыкі адразу
Напоўніў мой увесь пакой.

Як толькі здолела рука
Схіліць метал да паслушэнства,
Што я ў здзяйсненні мастака
Лаўлю з табою падабенства!

Чаму натхнёна так, скажы,
Разцом красу тваю адзначыў
Разьбяр нязнаны і чужы,
Які цябе ў жыцці не бачыў?

...Застыўшы ў постаці адной,
Загадку тоячы сур'ёзна,
На тонкай ножцы грацыёзна
Яна стаіць перада мной.

А ледзь крану — і запяе,
Агучыць далечы і шыры!
І смех твой непаўторна шчыры
Звініць у музыцы яе.

* * *

Праходжу штодзень па скверыку,
А на лавачцы абдымаюцца
Пад ненадзейным ліпавым сховам.

Адзін аднаго крокамі будзім —
Вяртае твары рэчам і людзям
Сонца, якое займаецца,
А на лавачцы абдымаюцца.

Поўдзень —
Абедаць пойдзем:
Сонца ў зеніт узнімаецца,
А на лавачцы абдымаюцца.

Пакаштаваўшы дажджынку,
Што ў маі
Смак мора мае,
Бягу ад вады
Абы-куды...
Ліпавы ствол ад маланкі ламаецца,
А на лавачцы абдымаюцца.

6 Зак. 2167

Сцежкай адной —
Туды і сюды.
Ранкам у восем,
Увечар у восем.
Праходзяць па скверыку
Разам са мною
Зіма і вясна,
Лета і восень;
А тут,
На лавачцы,
У кофце і маечцы,
Час забываючы,
Абдымаюцца.

Жыццёвых прыгод сіла
Па свеце мяне насіла,
Сваю адкрываў Амерыку,
Даўно не бываў у скверыку.

Вабіць здаля роднае ўлонне —
Працягваю, як чалавеку, далоні,
Хачу запытаць,
                    як маецца,
А на лавачцы абдымаюцца.

Можа, тыя,
            а можа, не тыя,—
Ляцяць ім пад ногі лісты залатыя.
Нясе і нясе іх
У восеньскай млечнасці
Пошта прыроды,
Пошта вечнасці.
Трапечуць лісты чародкаю —
Вось яны
Ад вясны і зімы,
Ад лета і восені...

На ліпавым пні струхлелым
Галінка прымаецца,
А на лавачцы абдымаюцца.

* * *

Калі сустракаюцца дзве рукі,
Як з нотай у песні нота,
Будуецца мост над прорвай ракі,
Імя якой — адзінота.

Калі датыкаюцца губы да губ
На досвітку ў сінім завулку,
Бяздомнае шчасце закладвае зруб
Для заўтрашняга прытулку.

— Любіце?
— Любім!
— Любіш?
— Люблю!
Любоўю сусвет заселены.
Аддайце ж хутчэй закаханым зямлю,
Як падарунак вясельны!

* * *

Размывала адна бяда
Берагі,
Падзяляла адна вада
Бераг адзін
І бераг другі.
Каб, урэшце, яны ў жыцці
Насустрач змаглі пайсці
Наўпрост —
Збудавала любоў мост.
Над вадой,
Над былой бядой
У далонь
Легла
Далонь.
Ды, падкраўшыся ціхай хадой,
Запаліла нянавісць агонь.
Пад глыбінямі цёмных вод
Пахавала абломкі дно.

Будавалася стольki год —
Узляцела ў імгненне адно.
Скарб аплакаўшы дарагі,
Ходзім сумныя — я і ты.
Будзьце пільнымі, берагі,
Беражыце свае масты.

* * *

Аб тым, куды я еду,
Не гавары суседу,
Не гавары суседцы —
Усёвідушчай сведцы.
Не гавары —
як-небудзь
Стрымай сябе, змаўчы.
Скажы зямлі і небу,
Скажы глухой начы!

Парушыўшы граніцу,
Разбурыўшы сцяну,
Я еду ў таямніцу,
Я еду ў навіну.

З мяцеліцы зімовай
У весні першацвет
Перад бяссільнай змовай
Старых і новых бед.

Не гавары суседу,
Стаіўшыся ў журбе,
Аб тым, куды я еду...
Я еду да цябе!

ДВОЕ НА БЕРАЗЕ

Маладзіком пабеленыя
Ці сівізной,
Двое ішлі па беразе
Сцежкай адной.
Вузельчык, з далоняў звязаны,
Неслі яны.
Сэрцы раскутымі вязнямі
Білі ў званы.
Далёкія, блізкія, любыя...
Мора, пастой!
Размыты іх штампы шлюбныя
Хваляй крутой.
Змоўкнулі на паўслове:
Хваля — бабах!
Соль на губах наслоена,
Боль на губах.
Недзе дапытлівы горад,
Ды, як шчытом,
Агарадзілі іх горы
Дужым хрыбтом.
А мора пакутна вохала,
Бухала ўзбоч,
Вабіла і палохала,
Як шлюбная ноч.
Над грывамі хваляў, над чоўнамі,
Над гулам сівым
Двое ішлі, заручоныя
Морам самім.

* * *

Без бою я здаю сваю душу
Табе, любоў —
Палон салодкай мукі.
Не будзь жа ты турэмшчыцай,
Прашу,
Не надзявай мне кайданы на рукі.

Я чую
Блізкі стук тваёй хады,
Няўмольнай,
Быццам конніца Батыя.
А ці лягчэй нявольніку тады,
Калі на ім аковы залатыя?

НАСТУПАЮЦЬ РЭЧЫ

Без дабра зямнога
Людзі бедавалі.
Людзі вельмі многа
Рэчаў збудавалі.
Больш цяпер пустэчы
У людзей не будзе.
Наступаюць рэчы —
Адступаюць людзі.

Як жывое дзіва,
Вытыркнуўшы лапы,
У дзверы кракадзілам
Упаўзе канапа.
Каб расплюшчыць вочы
Вам і ўсім суседзям,
Халадзільнік ноччу
Зараве мядзведзем.
Вас уранку нашча —
Як нутро трывае? —
Праглынае пашча
Дрогкага трамвая...

Хто там — о шаленства! —
Запярэчыў рэчам?
Толькі паслушэнства
У парадку рэчаў.
Людзі любяць рэчы
І такое робяць,
Што саміх, дарэчы,
Можа заўтра ўгробіць.

ПРАС

У праса —
Пачэсная праца.
Сваю цеплыню дорачы,
Тугая далонь праса
Гладзіць заўсёды горача.

Якое адзенне асмеліцца
Пазбегнуць з ім сустрэчы?
Ніц перад прасам сцелюцца
Рознага крою рэчы.

Сваёю вагой расправіць
На плацці кожную складку.
У праса галоўнае правіла —
Абы было гладка.

Ён цэніць як лепшую вартасць
Шаўковае паслушэнства.
Затое суконная ўпартасць
Даводзіць яго да шаленства.

Бывае, такое падсунуць,
Што прасу робіцца млосна.
Калі ж на яго плюнуць,
Як ён шыпіць злосна.

Па шоўку пройдзецца лёгенька,
А на сукно падналяжа...
Яго жалезная логіка
Каму правату не дакажа?

МАНАЛОГ САБАКІ

Я з вядомай пароды сабак,
У двары гаспадарскім зух.
Я жыццё адчуваю на смак,
Я жыццё адчуваю на нюх!

Я, варушачы свой ланцуг,
Выглядаю: каго нясе?
Той, хто есці дае — мой друг,
А астатнія ворагі ўсе!

Трэніруючы галасок,
Выю, гаўкаю і вішчу.
Калі смачны пакажуць кусок,
Я на задніх лапках скачу.

А калі налятаю я
І зубамі хапаю ахвяр,
Хіба ў гэтым віна мая?
Нацкаваў мяне гаспадар.

Лямку долі сваёй цягну.
Мне нялёгка. Нашто хлусіць?
Цэлы век задачу адну
Вырашаю — лізнуць ці ўкусіць...

З вас, двухногіх, хто на зямлі
Зразумее маё выццё?
Я пытаю, а вы б змаглі
На карачках усё жыццё?

* * *

Графін зіхцеў у непаўторным бляску,
І шклянкі ў люстраным яго святле
Лічылі за пашану і за ласку
Вакол яго вярцецца на стале.
Да кожнай падыходзячы з паклонам,
Каб выказаць шляхетны свой парыў,
Усё, што меў, графін з вясёлым звонам
Сваім шкляным прыхільніцам дарыў.
Але калі апаражнеў зусім,
Графін гукнуў: — А дзе мая графіня?
Ды толькі шклянкі на стале другім
Цягнуліся да поўнага графіна.

* * *

Смакуюць на нюх прыправу,
Хоць на стале роўнядзь...
Адны робяць справу,
Другія выгляд робяць.

Толькі б зіхцела аправа,
А сам партрэт — дробязь...
Адны робяць справу,
Другія выгляд робяць.

Ківаюць то ўлева, то ўправа,
Быццам заведзены робат...
Адны робяць справу,
Другія выгляд робяць.

Знойдуць, вядома, права,
Калі ўжо нешта ўгробяць...
Адны робяць справу,
Другія выгляд робяць.

ПЕСНЯ ЗАВАДНОГА САЛДАЦІКА

Я — завадны, я — завадны,
Скляпаны на заводзе.
І клопаты ў мяне адны:
Трымаць сябе на ўзводзе.
З знаю толькі «раз» і «два»,
Як самы верх навукі,
Калі партачыць галава,
Тады працуюць рукі?
Умею я пад казырок
Ускінуць пальцы брава.
Наперад — крок,
налева — крок,
А потым крок направа!
Я ў бойках порахам прапах,

Аглух ад страляніны,
Ад кожнага майго «піф-паф»
Дрыжаць усе павінны.
Пажар сусветны на зямлі
Мне часта-часта сніцца,
Калі мяне ўжо завялі,
Я не магу спыніцца.
Прыйшла, прыйшла мая пара:
Я, асмялелы служка,
Ужо свайго гаспадара
Крадком бяру на мушку.
Кручок націснуць спускавы
І з галавой бляшанай
Магу я, зрэшты, як і вы,
Хто ўвенчаны пашанай.
Дол скаланецца ад грымот,
Паветра дым атруціць...
Ды стоп! Канчаецца завод.
Хто зноў мяне накруціць?

ГАДЗІННІК

На поўны ход, на ўвесь размах,
Парыпваючы ржава,
Гудзеў гадзіннікавы гмах —
Маленькая дзяржава.
Рыпеў і пеў метал цяжкі —
Гарбінкі ды зарубкі.
Падналягалі рычажкі,
Пакручваліся шрубкі.
І вось пачуўся гук начны —
Прыгожы і ўладарны.
Ва ўсе званы, ва ўсе званы
Біў малаток ударны.
— Бяссонна дбае кожны з нас,
Каб быў гадзіннік спраўны.
Працуем дружна мы на час —
І велічны, і слаўны.

Клапочам у імя гадзін
Спаянасці і згоды...
І толькі маятнік адзін
Вагаецца заўсёды...
І ўвесь гадзіннік пакрысе
Завёўся ў звонкай сполцы.
Наперабой гудзелі ўсе —
Спружынкі, гайкі, колцы.
— Як трэба толькі закруці —
І выцягнецца ў струнку!
— Павінны рухацца ў жыцці
Усе ў адным кірунку!
І ўжо сталёвым кулачком
Ад злосці нехта бразнуў.
І збіты маятнік маўчком
Хіснуўся і завязнуў.
І ў той жа міг спыніўся час —
О страшнае каварства! —
Знямела ўраз, застыла ўраз
Гадзіннікава царства.

КУМІР

Крыкнуў
«Люблю»
Людзям
Аднойчы —
Яго падкінулі ўгору
Тройчы;
І ён пайшоў
Лёгка,
Без груку
Па чалавечых руках,
Як па бруку;
Далёка дайшоў бы,
Ды ціха і глуха
Хтосьці
Куміру
Уводзіць
У вуха:

— Рукі, якія цябе ўздымаюць,
Вельмі ўжо хісткія схільнасці маюць:
Могуць падвесці,
Выраніць могуць,
Могуць
У бок
Увесці
Пазногаць,
Занаравіцца,
Упіцца, як шпора...
Не, не надзейная гэта апора!
І па загаду куміра
Ламаюць
Рукі,
Якія яго ўздымаюць.
Калі ён падаў,
Думаў у страху:
Усё-ткі збылося
Прароцтва
Замаху.

ПЛАСЦІНКА

Паслухмяна круціся пласцінкай,
Завадною служанкай эпохі:
Галасі, рагачы і цінькай,
Абуджаючы «ахі» і «вохі».
Пад іголкай, што ходзіць дрогка,
Толькі спраўнасць твая на паверцы:
Ах, як хараша, ах, як лёгка,
Калі шрубка заместа сэрца...
Але здарыцца часам гора —
Не туды бегунок заверне,
Нота косткай завязне ў горле,
Заскуголіш падбітым зверам:
І застынуць манументальна
Скрыжаваныя ногі і рукі.
Тых, што торгаліся фатальна
Пад твае ахрыплыя гукі.

І, нібы ачуняўшы спрасонку,
Хтосьці раптам прарэзліва звонка,
Як у рупар з грымучага цынку,
Загукае: «Змяніць пласцінку».
Але ўпартыя ў тлуме кватэрным
Завадную пакажуць вернасць:
Каб падоўжыць твой шумны тэрмін,
Перш чым знімуць цябе — перавернуць.
Скача публіка завадная
Пад мелодыю, што дзілінкае.
Хто заводзіць каго, не знаю,
Вы — пласцінку.
Ці вас пласцінка?

ЯК ЛІСА РАТАВАЛА ЗАЙЦА

Аднойчы заяц да лісы
Патрапіў, даўшы маху,
Уздрыгнуў спуджаны касы,
Затрапятаў ад страху.
Язык, нябога, прыкусіў,
Схаваць не ў сілах болю,
Ён жаласліва папрасіў:
— Кума, пусці на волю!
І вось як ліска шарака
Ласкава суцяшала:
— Чаго дрыжыш ты? Ад ваўка
Цябе я ўратавала!
Вядома ўсім, што гэты звер
На іншых вострыць зубы.
Сваю збавіцельку цяпер
Аддзячыць мусіш, любы...
Ліса, прамову пяючы,
Закончыла пяшчотна:
— Ну, што стаіш? Хутчэй скачы
У рот добраахвотна!

З кнігі «ПОЛЕ»

(1976—1978)

* * *

Век з рэактыўнай хуткасцю імкне,
Мы нездарма яму хвалу прапелі.
Адлегласць колы,
Вышыню прапелер
Адольваюць,
Узносячы мяне.
Хай сёння я на Млечны Шлях ступіў,
Усіх маіх здзяйсненняў таямніцы
Бяруць вытокі з той зямной крыніцы,
З якой і я рукамі неба піў.
Чаму ж я не крычу:
                              «Спыніся, міг!»,
Калі да зорак здолеў дакрануцца?
Чаму мяне так вабіць азірнуцца?
З маіх вышынь,
З адлегласцяў маіх?
Туды,
        дзе жыта б'ецца ў небакрай,
Дзе я бягу па зорных росах босы...
Не забірай,
                датэрміновы рай,
У ног —
           зямлю,
У галавы —
                нябёсы.

* * *

Забіраюць нас электрычкі,
Сцежкі, воблакі і бары.
Пакідаючы ўтульнасцю звычкі,
Ветразь мары рукой бяры!

Дакранаючыся да неба
Алюмініевым крылом,
Адчуваеш,
                    як пяткі глеба
Прыцягальным казыча цяплом.

Вырастаем ад дотыку мамы,
Ад гаючай яе рукі,
Што праводзіць з маленства да брамы,
За якой —
                    да зор напраскі!..

Вырастаем, як з дрэва кроквы,
Дзе так дрогка звініць вышыня.
Вырастаем ад першага кроку
Да апошняга кроку штодня.

Хоць таемных галактык пагоркі
Вабяць зорнаю навізной,
На зямлі —
                    мае лепшыя зоркі,
Што яшчэ не прыручаны мной.

Напінае тугія крылы
Кожны шчыры парыў крыві.
Вырастаем ад ласкі і крыўды,
Ад нянавісці і любві.

Вырастаем...
                    Адно б не вырасці
У ракетным разбегу падзей
Вышай праўды і вышай шчырасці,
Вышай чуласці добрых людзей.

ЗЯЛЁНАЯ АНТЭНА

Каб свет без ласкі не старэў,
На сонечны касцёр адменны
Нацэлены галіны дрэў —
Зямлі зялёныя антэны.

Заўжды чаруюць навізной,
Дрыготна ззяюць у паглядзе:
Зялёным полымем — вясной,
Падзеннем зор — у лістападзе.

У грунт карэннемураслі,
Падпёршы голлем полаг сіні,
Дубы, бярозы і асіны —
Паўпрэды сонца на зямлі.

Нас не змаглі ні сталь, ні порах
Скасіць, калі ішла вайна,
Мой лес, мой друг, мая апора,
Мая надзейная сцяна...

Ці месяц верасень, ці май —
Наш чалавечы дом нязменна
За промень сонечны трымай,
Зямлі зялёная антэна.

КОЛА

Я — кола. Мая доля —
Часамі з грукам і нехаць —
Круціцца ўвесь век на доле,
Каб вам наверсе ехаць.
Цісне ваўсю на педалі
Рыпучых гадоў бяссонне.
Не помню, з якої далі
Я прыкаціла ў сёння.
Я выраблялa сальта
На дрогкіх ухабах былога.

Зараз па люстры асфальту
Носіць мяне дарога.
Я, руху вярчальнага лёкай,
Сцярджаю людское суседства.
Ах, як на мне далёка
Заехала чалавецтва!
Я састарэла нібыта...
І хтосьці з вышынь здабытых
Ужо да мяне невясёла
Гукае: «Далоў кола!»
Спаборнікі эры зорнай,
Падманам сябе не цешце,
Быццам у гонцы маторнай
Я дакруцілася ўрэшце.
Я — пачатковая школа
Узлётнай ракетнай сілы:
Калі не разгоніць кола,
У неба не ўздымуць і крылы...
Качуся,
гонячы скруху,—
Аж зоркі трымцяць наўкола —
Я — кола адвечнага руху,
Выратавальнае кола.

* * *

Мы прагнем хуткае язды.
Забыўшыся на небяспеку,
Ляцім шалёна хто куды...
Ах, спешка веку,
Спешка веку!
У тлуме еду,
як і ўсе,
Між спадарожнікаў вясёлых.
Мяне калыша і нясе
Аўтобус —
інтэрнат на колах.
Тут упрытык сусед з суседам,
Пінжак з сукенкай упрытык.

За выбухамі смеху
следам —
Сварлівасці грачыны крык.
Тут упрытык з галінкай бэзу —
Тугі румянец калача,
І побач з нематой пратэзу —
Цяпло юнацкага пляча.
Тут побач з боцікам блішчастым
Цяжкі салдацкі чаравік.
Тут учарашняе з сучасным,
Тут боль з уцехаю ўпрытык.
Асфальт ільсніцца, як вада,
І не канчаецца гайданка.
Адна язда,
Адна бяда
Усіх трасе,
як ліхаманка.
Ад нечаканага рыўка
Дарога ўздыбіцца прамая,
Хай будзе пільнаю рука
Таго,
хто дрогкі руль трымае.
Адданыя трывожным трасам,
Стаім цярпліва ці сядзім.
Сто чалавечых лёсаў разам,
Як лёс адзін,
Як лёс адзін.

* * *

Рыгору Барадуліну

Давай не будзем ростам мерацца,
Як у дзіцячую пару.
Нам самы раз цяпер даверыцца
Свайму сумленнаму пяру.
Паблякне, што наспех расквечана.
Узважыць час крылом крутым,
Якое слова забяспечана
Запасам праўды залатым.

Няхай штукар з нутром уласніка
Крадзе жылплошчу ў вышыні.
А нам любоў і боль сучасніка —
Пароль у будучыя дні.
Ідзём, мінаючы выбоіны,
Туды, дзе песня і жыццё,
І ўладна вабіць адкрыццё
Вяршынь, якія не засвоены.
Калі ж галінка чалавечнасці,
Дзе ток цяпла твайго цячэ,
Зашапаціць на дрэве вечнасці,
Чаго яшчэ?
Чаго яшчэ?

* * *

Кастры не вінаваты, што ў іх згаралі людзі.
Злачынца не агонь, што спапяляў дамы́.
Агонь, які заўсёды ўспыхваць будзе,
І ворагам, і другам робім мы.
У тысячах абліччаў ён вядомы.
Агонь — знішчальнік. І агонь — змагар.
Як лёгка іскры ўпасці ў стог саломы.
І як нялёгка патушыць пажар.
З руплівасцю гаспадара зямнога,
Агонь, знітоўвай сталыя масты
Над прорваю варожасці былога.
Агонь — яны, і мы, і я, і ты...
Агнём вянчалі, і агнём каралі
Па волі то раба, то караля.
Ці ж для таго агонь у неба кралі,
Каб стала Хірасімаю зямля?
Агонь, які мінулымі вякамі
Скакаў нібы незакілзаны конь,
Я кратаю лагоднымі рукамі:
Будзь паслухмяным розуму,
Агонь!

ПЛУГ

Плуг —
Усіх згаладнелых друг —
Паглыбляецца ў глебу былінна.
Плуг,
Які прыходзіць у рух,
Умываюць пясок і гліна.
Каб барозны ракой плылі,
Мы
Метал
Мудрасці вучым.
Плуг
Купаецца
У зямлі,
Плуг
Выходзіць з зямлі
Бліскучы.
Навучы вышыні, прасвятлі
Нас, аратых, айчынная глеба.
Плуг
Капаецца
У зямлі,
Здабываючы
Золата хлеба...
Каб барозны ракой плылі.
Ззяе сонцам метал гарачы...
Калі плуг перастане
Купацца ў зямлі,
З'есць яго
Іржа да астачы.

ДОЛЯ МАЯ ЖЫТНЯЯ

Калі я цябе пакінуў,
Кранула асцём успамінаў
Ты, поле маё старажытнае —
Доля мая жытняя.
Даруй мне за ўцёкі злачынныя.

Пасеяўшы думы на полі,
Пайшоў я... Нібыта магчыма
Пазбегнуць уласнае долі!..
Зярністасць вясновага порыва,
Што гэтак гаюча і здарава
Нас, басаногіх, уколе,
Ужо не забудзем ніколі.
Коўзкую плошчу тым часам
Шліфуючы пругкім абцасам,
Стукаем па бетоне,
Што поле трымае ў палоне...
Сцяблінкі жытнёвыя, дзе ж вы?
Мне ногі расінкамі джальце!
...Нейлонавыя падэшвы —
Прасамі па асфальце.
Мне страшна, мне сніцца начамі,
Што я ў разявак прад вачамі
Спрабую, як зерне з асфальту,
Прабіцца з каменнага гвалту.
Жыццём мы заручаны з полем,
Штодзённа і сеем, і полем,
І хай не заўжды пажынаем,
Зямлю, нібы вечнасць, кранаем...
Ці не аб поле, скажыце,
Дзе калыхаецца ў жыце
Дзіва надзённага хлеба,
Абапіраецца неба?
Адродзіцца тое, што страчана.
І ты застанешся, як спадчына,
Поле маё старажытнае —
Доля мая жытняя!

* * *

Вывучаю замежныя мовы —
Птушак і дрэў,
Ветру і каменя,
Вады і агню...
Мне трэба дамовіцца з імі.

Баюся,
Каб птушкі
Аднойчы
Не адляцелі
У незваротны вырай,
Не знайшоўшы, дзе прызямліцца
На далоні маёй...
Хачу,
Каб на мяне дрэвы
Не глядзелі як на забойцу,
Які толькі і наравіць
Сакануць па іх
Тапаром.
Я ветру аддаў
Крылы ветракоў і парусы,
Але яму мала —
Разбушаваўшыся,
Часам
Зрывае дахі з дамоў,
Як шапкі.
Колькі разоў
Я прасіў у каменя:
Будзь сцяною палаца,
Будзь маставою вуліцы,
І не трэба ляцець
У напрамку —
Да чалавечага чэрапа!
Але камень
Маўчаннем
Адказваў.
І з вадой у мяне
Клопатаў хапіць:
То я без яе смагну,
То яна мяне топіць.
А як без агню пражыць на зямлі?
Агонь, сагрэй,
Агонь, не спапялі!
Вывучаю замежныя мовы —
Птушак і дрэў,
Ветру і каменя,
Агню і вады...
Мне з імі дамовіцца трэба.

ГОНКА

Нервы казыча тонка,
Піхае на ўскрай самагубства
Боязь адстаць —
                    гонка
Амбіцыёзнага глупства.
Першынства, першынства прагнуць.
Калі цябе ў гонку ўцягнуць,
Дыстанцыю ўжо не пакінеш,
Хоць знаеш, які фініш...
Гонка —
          у шторм адчальце,
Пакінуўшы бераг стромкі.
Гонка —
          гарацы на асфальце
Аўтамабіля абломкі.
У ліхаманкавай гонцы
Мае чалавецтва сваволіць:
Хто ўздымецца вышай за сонца,
Хто вышай калені агаліць...
У гонцы губамі тытана
Глытаеце прагна прастор вы,
Ціснучы апантана
Навыперадкі —
                    да прорвы...
Вы, завадатары гонкі,
Вы, трубадуры эпохі,
Годзе бабахаць у гонгі!
Дайце адстаць трохі.

* * *

Адкрывалі мацерыкі
І маленькія астраўкі,
Пікі горныя і пагоркі
І даўно патухлыя зоркі.
Вынаходнікі столькі знайшлі,
Адкрывальнікі столькі адкрылі,

Што ў бабулькі старой — Зямлі
За спіной разгарнуліся крылы.
Грэла кожнае адкрыццё.
Вынаходзілі плуг і порах.
У спаборніцтве смерць і жыццё,
Вынаходзячы, крочылі поруч.
Ціснем — вецер у твар сячэ:
Гонка, гонка — хвароба веку!
Ах, бы толькі адкрыць яшчэ
Чалавека
У чалавеку.
Дайце браму краіны любві
Адчыніць, нібы дзверы дома.
Моры гневу і рэкі крыві
Аддадзім назаўжды былому.
Я адкрыць хачу, як і ты,
У жыцці, а не ў цудах казкі
Кантыненты людской дабраты,
Акіяны пяшчоты і ласкі.
Ты задумаўся — што з табой?
Ты народжаны быць адкрытым.
Як падземнай ракі прыбой,
Неадкрытасць крычыць крыкам.

* * *

Дацягнуцца да старэйшых, вырасці
У маленстве так карцела мне.
Я свой рост штодзень цвіком па шчырасці
Адзначаў употай на сцяне.
І, калі прыгадваю, не верыцца,
Што неўтаймаваным хлапчуком
Я спяшаўся з дзецюкамі мерацца,
Стоячы на дыбачках цішком.
Дык чаму ж, свае вышыні хвалячы,
Пазіраю ўсё часцей туды,
Дзе знікаюць у туманнай далечы
Босыя хлапечыя сляды.
Нездарма, высокай мары пайшчыкі,

Памнажалі ўзносы мы свае.
Сёння сын, узняўшыся на пальчыкі,
Да пляча майго ўжо дастае.
І з няўтольнай смагаю нязвычнаю
Вуснам зараз трызніцца глыток
Той легенды, той вады крынічнае,
Дзе мая любоў бярэ выток...
Хоць у далячынь маленства росную
Немагчыма перакінуць мост,
Але так патрэбна і даросламу,
Як падлеткаў, мара навырост.
Растаюць перад вачыма сталасці
Даўніх летуценняў міражы.
Сталасць — гэта прага дасканаласці.
У якой няма ў жыцці мяжы.

ЗДЫМКІ

Злавіў імгненне фотаапарат.
Успышка бліца.
Здымкі.
Здымкі.
Здымкі.
Кароль і блазен, фюрэр і пірат
Спяшаюцца да вечнасці ў абдымкі.
Дзівіцеся, нашчадкі,— любата!
Як твары іх аздоблены старанна:
У позірку забойцы — дабрата,
Замілаванасць — у вачах тырана...
Адбітак дум на зморшчаных ілбах.
З палянамі пралысін. З валасамі.
З цыгарай або з люлькай у зубах.
З бародкай мудраватаю. З вусамі.
Над глобусам. Над картаю зямлі.
То ўспыхваюць,
то гаснуць зрэнкі-джальцы.
І вось, нібыта крабы, папаўзлі
Па кантынентах і краінах пальцы.

Ківок — і ад жалезнага рыўка
Нізрынуць прахам гарады і вёскі,
І сунуцца гарачай магмай войскі...
Якая ўсемагутная рука!
Яшчэ адна хвіліна — і зграбе,
Нібы арэх, маленькую планету...
Гэй, пераможца, на руінах свету
Хто там у ладкі пляскае табе?
Застракаціць ізноўку фотастужка,
Калі ўзмахне ўладарнаю рукой
Гісторыя — руплівая пастушка
Мізэрнасці і велічы людской.

* * *

Мы — галіны.
А вы — карэнні.
Мы — наследнікі.
Продкі — вы.
Вы маўчыце ў сваім сутарэнні,
Мы шумім шматгалоссем ліствы.
Лупіць нас то град, то залева.
Нас калоцяць крутыя вятры.
Мы хістаемся ўправа і ўлева,
Падпіраючы сонца ўгары.
І з-за ўласнага гоману дрэнна
Чуем мы ваш дакор нямы.
Два паверхі адзінага дрэва —
Вы і мы...
Пазіраем падчас звысоку
Мы, галіны,
На вас, карані.
Хоць і знаем, засохлі б без соку,
Што знаходзіце вы ў глыбіні.
Нам — святло,
А вам — сутарэнне.
Гэта дадзена лёсам самім;
Нас трымаеце вы, карэнні,
Вы маўчыце, а мы шумім.

КАЛАСЫ

Мы — галасы зямной красы,
Мы — кроплі ў жытнім моры.
Мы — каласы, мы галасы
У небывалым хоры.
Мы так спяшаліся даспець,
Цягнуліся да неба,
Каб на высокай ноце спець
Зямную песню хлеба.
Нас, што ад горкіх летніх страт,
Радзелі часта-часта,
Няміласці нябеснай град
Хацеў скасіць заўчасна.
Ці зналі мы, калі для мар
Прасілі ў сонца крылы,
Што ўласнай спеласці цяжар
Трымаць не хопіць сілы?
Век карацей або даўжэй,
Ды ўрэшце — лёс адзіны.
Чым мы цяжэй, тым мы бліжэй
Да жніўнае гадзіны.
Ахвярны лёс — жытнёвы лёс.
Ды іншага не трэба,
Калі ты ў гэты свет прынёс
Хаця б зярнятка хлеба.
Даспелі мы, паспелі мы
На свой рубеж апошні...
Хай рэжа плугам час нямы
Тугу асенняй пожні.

КАСТРЫ

З даўняй,
Амаль незапомнай пары
Гісторыю нам
Асвятляюць кастры.
На плошчах шматлюдных
Палілі начамі
Разумных —

А дурні былі гледачамі...
З-за чорнай заслоны сярэднявечча,
Дрогка рассунуўшы цемры сувой,
Перад вачыма стагоддзяў трапеча
Джардана Бруна
Свечкай жывой...
Бачыш,
Як полымя ўгору рыўкамі
Скача,
Нібыта стрыножаны конь.
А разявакі наўкол матылькамі
Так і ляцяць, і ляцяць
На агонь.
Да эшафота
Апошнія крокі
Суправаджае звонам
Касцёл.
У іншамысных
Выбар шырокі —
Або пакаяцца, або ў касцёр.
Перакасіўшыся ад хрышчэння,
Рукі ля вогнішча
Грэюць майстры.
Дзеля свяшчэннага ачышчэння
Ім бы ўвесь свет
Спапяліць на кастры.
Збор
Праз вякі
Інквізітары трубяць,
Яны
Відовішчы яркія
Любяць.

АДРАЧЭННЕ ГАЛІЛЕЯ

— Я зрабіў перад богам вялікі грэх,
Раскусіў забароненай праўды арэх.
Прызнаюся і ўголас каюся —
Адракаюся...

Адракаюся я ад таго, што люблю,
Ад святла, што сляпіла мне вочы,
Адракаюся я ад таго, што Зямлю
Вырваў з цемры сусветнае ночы.
У сабе назаўжды заглушу, задушу
Ерась тую, што вечна бунтуе.
Рот замкну на замок, замурую душу,
Крык яе нематой забінтую.
Мне раскаянне полымем скроні пячэ,
Кулаком сябе стукаю ў грудзі.
Дык чаго вам яшчэ?
Ну, чаго вам яшчэ,
Слугі боскія,— грозныя суддзі?
З вамі ў лад праклінаю ў пакутнай жальбе
Грэх знішчальны сумлення любога,
Адракаюся я ад самога сябе,—
У імя ўсемагутнага бога.
...І Зямлю пад удары царкоўных званоў
Пнуцца кінуць служакі з размаху
Тром кітам патрапаным на міласць ізноў,—
Ашуканству, прымусу і страху,
І чадзіць з-пад кадзілаў святая мана,
І ахутвае дымам планету.
Але — бачыце! — круціцца ўсё-ткі яна
У бясконцым сузор'і сусвету.
Хіба можна ўцячы ад таго, што ў душы
Прарастае з бунтарскага зерня,
Ад таго, што, знямеўшы цяпер у цішы,
Заўтра выбухам свет пераверне?!
— Хоць паказваў мне страх тапара вастрыё,
Я не стаў, я не ўпаў на калені.
І таму ад цябе, адрачэнне маё,
Адракаюся імем сумлення!

* * *

Ловяць вушы радыёантэн
Пазыўныя ўсіх шырот дрыготкіх.
Мы жывём у свеце тонкіх сцен —
На зямлі адлегласцей кароткіх.

І калі дае на тым баку
Трэшчыну маленькую планета,
Не хавайся ты ў сваім кутку
І не думай, што далёка гэта.
Перакрэсляць даль любую ўшчэнт
Вочы пранікнёных тэлекамер.
Па́дае заморскі прэзідэнт,
Грудзі засланяючы рукамі...
А забойц не могуць пакараць.
Студзім каву — град стукоча ў шыбы.
Перад нашым позіркам гараць
Ад напалму людзі і сялібы.
І калі сумленне на паверцы,
Сховішча не знойдзеш анідзе:
Агнявы мерыдыян вядзе
Да твайго аголенага сэрца...
Самая страшэнная бяда
З тых плацдармаў, дзе баі грукочуць,
Да твайго зацішнага гнязда
За адно імгненне пераскочыць.

ПОЛЕ

Хоць час трывожнага бяссоння
Ужо, здаецца, за табою,
Было і застаецца сёння
У полі зроку —
Поле бою.
Нас памяць, нібы кананада,
Не моўкнучы, дасюль калыша.
Адно за рысай далягляда
Сталіся спакой і ціша.
Ляціць арбітаю крывою
Зямля —
мы ўпарта поле полем.
Не толькі потам — і крывёю
Для ўздыму руні глебу поім.
Мы полем цэлы век заняты
І падаем ахвярна самі,

Як з пальцаў сейбіта зярняты,
Што прарастаюць каласамі.
Ступаючы ў раллі па пояс,
Расцём у ранішніх праменнях.
Ах, поле — прыцягнення полюс,
І дум,
І зор, што ў нашых жменях!

ТВАРЫ

На каменным тратуары —
Чалавечая рака.
Твары. Твары. Твары. Твары.
У руцэ плыве рука.
Гулка цокае абутак.
Незнаёмы друг, дазволь
Прачытаць на твары смутак,
Прачытаць на твары боль.
Прачытаць на твары радасць,
Гнеў, і злосць, і весялосць,
Прачытаць на твары градус
Цеплыні, што ў сэрцы ёсць.
Прачытаць на твары мару,
Страх, які душу шкрабе...
Безаблічнасць не да твару,
Чалавечы твар, табе!
Сонца цёплымі рукамі
Агалі і прасвятлі
Твар у дрэва, твар у камня,
Твар у неба і зямлі...
Нас глытае ў мерным гудзе,
Як канвеер, тратуар.
Не хавайце твараў, людзі,
А глядзіце твар у твар.

УПАЛА СЛЯЗІНА

Упала слязіна з вока ўдавы
І пакацілася ў мора.
Чуеце вы, бачыце вы,
Як вырастае гора?
Збіраецца веча —
                    слёз грамада,
І соллю вякі намоклі,
Свая доля,
          свая бяда
У кожнай гаручай кроплі.
Вянчаюць рэліквіі ў куфры тваім
Саюз пакаленняў брацкі:
Схавана будзёнаўка дзедава ў ім
Поруч з пілоткай бацькі...
На грэбні хваль,
                    на промні ляза
У сціснасці немагчымай
Кранула Першай Сусветнай сляза
Слязу Вялікай Айчыннай.
З розных краін ручаіны слязін
У акіян уцякаюць.
Чакаюць жанчыны сваіх мужчын,
Цэлую вечнасць чакаюць.
Жанчыны гэтак плачуць заўжды,
Што кроў у жылах стыне.
Аднолькава мова няўмольнай бяды
Гучыць у Сангмі і ў Хатыні.
Па рэках дзён,
                    па рэках гадоў
Бяжыць горкае гора.
Зліваюцца слёзы ўсіх удоў
У самае сумнае мора.
Хай б'е прыбоем яно ў берагі,
Б'е на зямлі трывогу.
Забойцам мора жаночай тугі
Перагародзіць дарогу.

* * *

Не бойся, што сум агорне,
Хмарамі бровы насупіць,
Не бойся, што комам у горле
Гора падчас падступіць...
Даверся таму неспакою,
Што не праходзіць з гадамі,
Што трапяткой ракою
Човен душы гайдае...
І стане ратункам страта:
Штодзённае далучэнне
Да хваляванняў брата —
Гаючае ачышчэнне...
Не бойся, што комам у горле
Чужая бяда падступіць.
Не бойся, што смутак агорне,
Хмарамі бровы насупіць...
Вядомага не разжоўвай,
Утульнай будзённасці бойся,
Здаволенасці ружовай
Бойся, як самазабойства.

* * *

Як хораша ступіць на тратуар,
Які блішчыць на золку адмыслова.
Абцасамі стукочаш, як друкар,
Што ў вольны вырай выпускае слова.

І водгулле таго, што я ў даўгу,
Нясе пустэльны горад, як пячора.
І на душы шчыміць: а ці змагу
Нагнаць усё, што не паспеў учора.

Ах, сонейка, як рупны дворнік, ты
Раней, чым я, ізноў сягоння ўстала.
І палавіну соннага квартала
Прабег ужо твой венік залаты.

* * *

— Вы адкуль?
— Мы — ад куль.
Мы — з вайны.
Мы — званы.
Мы — дамы́.
Мы — дымы.
Каміны.
Камяні.
Стукае боль у грудзі,
Ваўчыцай завея вые.
Ходзяць па свеце людзі,
Нібы званы жывыя.

Бухаюць зноўку і зноўку
У спёку, у дождж, у замець,
Торгае за вяроўку
Памяць.
— Мы — званы.
Мы — з вайны.

ПАРТЫЗАНСКІ ЛЕС

Прыпыніся, шалёны экспрэс:
Мы саскочым з цябе і пойдзем
У партызанскі лес,
У бяссонную памяць, у подзвіг.
...Перад карканнем крумкача
Абаронны накат зямлянкі
Падпіраюць плячо да пляча
Сосны дужыя — партызанкі.
Лес, вячыстасцю нас ахіні,
Далучы да святынь непадробных,
Дай ратунак ад мітусні,
Ад спакус і ад думак дробных.
Зноў за намі імкне наўздагон
Быту ўладнага шок машыны,

Калі душы бяруць у палон
Халадзільнікі і машыны.
Як нам цяжка прарваць з табой
Кола хатняга гарызонту.
Гэты ціхі бяскроўны бой —
Прадаўжэнне грымотнага фронту.
Перад націскам хітрай бяды,
Перад гвалтам яе наступлення
Непакорнаю будзь заўжды,
Партызанская зона сумлення.
Тут, на гэтым святым рубяжы,
Я баюся цябе запляміць
Хоць маленечкай кропляй ілжы,
Славы вечнае сховішча — памяць.
Вочы жмурачы ад святла,
Узыходжу з зямлі да сонца.
Небаскробы з бетону і шкла —
Жменя сонца ў маёй скарбонцы.

* * *

Бор,
Як роздум,
Глыбокі,
Неруш цёмную не прадзерці,
Мы ўцякаем сюды ад спёкі.
Мы ўцякалі сюды ад смерці.
Працягнуўшы ў свае іголкі
Ніткі яркіх праменняў,
сосны
Вышываюць узор дзівосны.
У траве іржавеюць асколкі
Ад снарадаў і мін, якія
Тут упалі ў гады́ цяжкія...
Пахне каскаю,
Пахне краскаю
З адмысловай мядовай назваю,
Пахне цёмнай таемнай казкаю,
Што спрадвеку гушчар расказвае...

Шматкалёрнасцю роснай вясёлкі
Зіхацяць у траве асколкі
Ад бутэлек,
                    якіх не лічылі,
Калі горла ад смагі лячылі.
Дрогкім шумам,
                              што ўторыць думам,
То з лагодай, то з лёгкім сумам.
Ты ўспаміны аб будучым будзіш,
Лес мой — дом мой!..
Ты быў. Ты будзеш.
Раптам грукае, як у дзверы,—
Скаланулася кронаў стрэха,
Можа, гэта — лёскат сякеры?
Можа, бітвы мінулай рэха?
Бор,
Як роздум,
Глыбокі,
Неруш пальцамі не прадзерці.
Уцякаем сюды не ад спёкі —
Уцякаем сюды ад смерці.

ГОЛАС ВЕЧНАГА ХЛОПЧЫКА

Я — з грознай былі,
Я — з гнеўнай песні.
Я — хлопчык вечны,
Я — ваш равеснік.

Мяне таксама
Бацькі любілі,
Але чужынцы
Мяне забілі.

Ляцелі ў дыме,
Ляцелі ў гуле
Наперагонкі
Са мною кулі!

Хоць бег я хутка,—
Аж дых займала,—
Усё-ткі куля
Мяне дагнала...

Вам пакідаю
І ўзлёт, і песні
Я, вечны хлопчык,
Я, ваш равеснік.

* * *

На спатканне з табой адтуль,
Выбачай, я не змог прыйсці.
Затрымала чарга куль
На парозе маіх дваццаці...
Як адзіную, што люблю,
Ад імя пралітай крыві
Прытуліў да грудзей зямлю
На парозе маёй любві.
За парогам вясна была,
Бэз, што квецень у сонцы купаў,
Даль, нагрэтая дабяла...
Але я на парозе ўпаў.
Пад шурпатай маёй рукой
Зарунелі, як рань, жыты.
Я — пясчынка зямлі, на якой
Няньчыш хлеб і цюльпаны ты.
А калі цябе ў збажыну
Завядзе салаўіная ноч,
Каласамі твой стан ахіну,
Ад цікаўных схаваю воч.
Давяраючы спелай цішы,
Таямніцу сваю, як дзіця,
Калышы, калышы, калышы
У жытнёвай калысцы жыцця.

* * *

Нас па галовах секлі зоркі
Чэргамі —
У чэрвені,
У вечаровым чэрвені...
Смерць хадзіла
Гаспадаром.
Быў крык.
Быў плач.
Быў гром.
Дом скаланаўся ад груку.
Уцякаючы ад пагонь,
Стрымгалоў праскакаў па бруку
Конь без конніка,
                    як агонь.
Неба,
Выючы нема,
Цэлілася здаля...
Няўжо ты мне здрадзіла, неба?
Дай мне ратунак,
                    зямля!
Неба —
            якое відовішча! —
Зеўрыла россыпам дзір.
Няма ад вайны сховішча.
Адно ад вайны сховішча —
Мір.
Мы ў цішыню
Вярнуліся,
            як дадому.
З крыку.
З агню.
З грому.
А званы маёй памяці зноўку
Торгае за вяроўку
Штодня
Цішыня.

ІНТЭРНАТ

> У цяперашнім студэнцкім інтэрнаце на Дунайскім узбярэжжы, дзе летам праходзяць міжнародныя семінары славістаў, адразу пасля вызвалення Браціславы размяшчаўся савецкі ваенны шпіталь.

Чаму вы не чуеце крыку?
Крычалі —
Першы і апошні раз:
— Ма-ма!
— А-а-а!
Дагэтуль не моўкне
Каменнае рэха сцен.
А вы не чуеце.
Шаноўныя знаўцы моў,
Можа, вам перакласці
Крык
        на вашы родныя мовы?
Крык гучыць аднолькава зразумела
Па-руску і па-англійску,
Па-польску і па-нямецку...
Выбухі смеху.
Чаму вы не чуеце крыку?
Я ў табе,
Ты ва мне,—
Інтэрнат —
Прытулак крыку,
Прытулак смеху.
Скалананаліся сцены ад выбухаў бомб,
Сцены дрыжаць ад выбухаў смеху.
Смех, як і крык,
Гучыць аднолькава зразумела
Па-руску і па-англійску,
Па-польску і па-нямецку...
Весялосці гуллівы вірус.
Звонкай радасці феерверк.
З крыку
Смех
Вырас,
Як з падмурка паверх.

СУТКІ

Сам па сабе смуткую.
Зраблю падарунак хуткі —
Падзялю і размяркую
Свае суткі.
Ні мала ні многа —
Восем гадзін сну начнога!
Гадзіна яды —
Асалоды кароткай,
Гадзіна бяды —
Язды дрыготкай.
Сем гадзін уссядаць
У крэсле службовым
За сталом —
                    непарушна дубовым...
Цісканіна ў чарзе —
                              паўгадзіны
(Танныя качкі ці апельсіны).
За гадзінай гадзіна
Ціна будзённасці
Наліпае...
І так не хапае,
І так не хапае
Гадзіны ласкі,
Гадзіны лагоды,
Гадзіны яднання
З тайнай прыроды,
З яе цішынёй грыбной і роснай,
З яе травой сенакоснай,
З яе прахалодаю,
З яе...
Гадзіны адной не стае!
Ды годзе —
Вячэра ўжо на стале.
...І зноў —
                    сон да світальнай пабудкі.
У мяне вясёлыя суткі.

ЦЁТКА

Я прыйшла да вас, як дадому.
З долі горкае, з голадам венчанай.
Я — дачка бліскавіцы і грому,
Я — сястра міласэрнасці вечнай.
Хоць я норавам цётка ціхуткая,
Мне ў хаўруснікі шторм абраны.
Верш мой, як дапамога хуткая,—
Там, дзе боль,
там, дзе крык
і раны.
Там, дзе воранам вораг каркае,
Я з зямлі паўстаю і бунтую,
Дабравольная санітарка,— я
Ласкай душы братоў бінтую.
Што пачуцці твае і думкі,
Калі ты іх з дыханнем знямелым
Унутры медыцынскай сумкі
Не прынёс да людзей пад абстрэлам!
Нас у сталасці,
як і змоладу,
Выпрабоўвае лёс без літасці.
Не памерла я там ад голаду,
Не памрыце вы тут ад сытасці.
Я свячу вам далёкаю зоркаю —
У бязбоязнай праўдзе чэрпайце
Слоў гаючых пілюлі горкія
Ад бяздушнасці і ад чэрствасці.
Будзь жа, муза, сястрой адвагі,
Каб чакала зямля твайго дотыку:
У акопе —
глытком з біклагі,
На рэцэпце — словамі доктара.
Дарагія мае пляменнікі!
Абдымаю сардэчна і цёпла,
Вас, аратыя і пісьменнікі...
Гэта — я,
Ваша Цётка.

ПАЯДЫНАК

Яшчэ твая вяршыня ў дрогкім дыме,
Яшчэ твой крок на ўздыме...
Стой!
Абвал...
Не прычакаўшы ласкі і пахвал,
Паэты паміраюць маладымі.
Забойца ў страху смерць бярэ на ўзвод
Рукою трапяткою і таропкай,
Каб абарваць цяжкой свінцовай кропкай
Тваіх непадуладных дум палёт.
Чакай —
Твой дух, твой нораў непакорны
У спрэчцы апярэдзіць бег гадоў.
І на галоўных плошчах гарадоў
Табе збудуюць помнік рукатворны.
І ўздыме крылы песня, што ў жудзе
Пабудку буры ў сэрцах
Пратрубіла,
І, як сцяна астрожная, ўпадзе
Улада гвалту,
Што цябе забіла:
У добрую з'яднаўшыся сям'ю,
Нашчадкі прынясуць у сонцах кветак
Гранітнаму — табе
любоў сваю,
Якой жывому не хапала гэтак...
Як забратаць сваёй душы ўзрыўчатку?
Да Чорнай рэчкі ў лютаўскую бель,
Самадзяржаўную кінуўшы пальчатку,
Паэт адзін выходзіць на дуэль...
Няўжо за подзвіг —
куля ўзнагарода?
Няўжо прагрэс —
дрымучы цёмны лес?
Паэт уласны ў кожнага народа,
І ў кожнага паэта свой Дантэс.
Гучыць заўжды аднолькава ўгавор:
Калі не ўкленчыш паслухмяна, падай...
Адных,— да сценкі ставячы,— ва ўпор;
Другіх —
марудна доўгаю асадай.

Каб прыручыць бунтаўшчыкоў пяра,
Глушылі ўпарта голас іх сумлення
То вязкімі абдымкамі цара,
То ўдушлівымі пасткамі ганення.
Надзею свету,
Будучыню свету,
Ахвярна засланяючы сабой,
З няпраўдай
У вяках
Вядуць паэты
Свой паядынак,
Свой няроўны бой.

* * *

Калі расстаешся з богам,
Шукай да людзей дарогі.
На змену былым маналогам
Прыходзяць цяпер дыялогі.
Гэта зусім не тое,
Што словы кідаць у залу,
Якая сваёй нематою
Ці рэхам табе адказала.
Напэўна, цяжэй, чым горы,
Сэрцы людскія рухаць.
Не слухацца ў ціхай пакоры —
Вучымся чуйна слухаць.
Вы зазубрылі мастацтва
Слацца кашуляй пад прасам.
А тут трэба пытацца
І трэба адказваць часам.
Тут мусіце кеміць з ходу,
Калі прыціскаюць партнёры.
Не падаспеюць заўсёды
Класікі, як суфлёры.
У вас адгукнецца спагадна
Суседская кардыяграма.
Пачуеце вы дакладна,
Пачуюць і вас таксама!

* * *

Я свой былы спакой раскалышу,
Я спакушу сябе прыходам свята.
Хай прымушае трапятаць душу
Чаканне свята, як чаканне свата.
Будзь благаславёны шчодры той парыў,
Разбег таго шчаслівага азарту.
Калі здаецца ўсё, што ты стварыў,
Не больш як пачатковы крок да старту.
Трыумфу шчасця непазбежны цуд
Ужо змятае з небасхілу хмары.
Не, на яго я не малюся тут —
Ляплю па ўзору чалавечай мары.
Маёй удачы птушка не ўцячэ,
І я пакутам палявання рады.
Усе мае ўрачыстыя парады
Наперадзе, наперадзе яшчэ.
Хіба не нам гадуюць свята будні?
Каб наталіць тугу па вышыні,
Ты па-зямному пакланіся студні,
Вядром з яе сузор'е зачарпні.
І лёс людзей, і рэчышча падзей
Акрэслівай натхнёна і чаканна
Сваім святлом, як добры чарадзей,
Высокае напружанне чакання.

АЗБУКА БЕГУ

Была зіма.
Зімы няма.
А на душы —
Старэчай тугі ледзяшы.
Маленькі раўчук —
Дзіця сонца і снегу,
Авалодваючы азбукай бегу,
На асфальце
Пявуча
Рукой свавольнай

Першыя літары
Піша,
Як вучань
На дошцы школьнай...
Жэўжык,
Які ў сумётах нямеў,
Якога не чулі ўчора,
Бач ты, як зашумеў:
Падавай яму мора!
У рыжаватай імжы
Струны наладжваюць капяжы.
Кроплі,
Пакінуўшы родны карніз
І не хаваючы свой адчай,
Ляцяць галовамі ўніз —
У ручай,
Які, пасваволіўшы трошку —
Годзе шумець дармова! —
На роўную выбег дарожку —
Да мора.
І вось ужо ў ім,
Як у басейне сваім,
Купаецца сонца,
Купаецца воблака,
Купаецца вышыня.
Лёгка плёхае цішыня,
Мару аб моры, ручай, калышы,
Хай спраўдзяцца ўсе спадзяванні тваe.
Старая туга, што асела ў душы,
Растае.

* * *

Заслужана ці не заслужана
Свавольніка дакараем,
Што вабіць яго лужына,
Здаецца, марскім раем.
За далягляд на палетак
Сцежкі бягуць сухія.

Чаму ж уладарна гэтак
Водная цягне стыхія?
Шторм уздымаюць вясёлы
(Ажно душа ў пяткі!)
Замурзаныя анёлы,
Мілыя чарцяняткі.
Цешацца, што адужана,
Хоць ледзь не акалелі,
Такая вялікая лужына —
Мора па калені!

АДЗІНЫ МОЙ ДОКТАР

Мне сябра даўно не звоніць,
І позніцца вестка ад брата...
Не ведаю, хто абароніць
Душу,
што журбою ўзята.
Я слухаю ў стоенай злосці,
Як у мяне за плячамі
Самота нязванай госцяй
Бязгучна звініць ключамі.
Цікуе ў замочным вочку,
Ахвяру крадком знаходзіць,
Мяне ў сваю адзіночку
Хоча яна праводзіць...
Ды я выбіраю кірунак:
(Не бразгай у дзверы, самота!)
Адзіны надзейны ратунак,
Адзіны мой доктар —
работа.
Забраўшы мяне да астачы,
Грэе ў сваім палоне,
Яна, нібы поціск гарачы
Вернай сяброўскай далоні.

НА ЗЫХОДЗЕ ДНЯ

На зыходзе дня ідзём дадому,
Несучы заслужаную стому.
Мітусню з'ядае цішыня
На зыходзе дня.
Белы дом. І белы дым з аселіц,
Сонца ліхаманіць уваччу,
Я схапіцца за прамень хачу,
Быццам за саломінку тапелец.
Дрэмлюць рухі — спачывайце, рукі,
Спіце, вочы — змрок такі густы,
На лістве бяроз замерлі гукі,
Слых, ці чуеш? Адпачні і ты!
Пагасцілі. А цяпер мы дома.
Супакой маю душу, спакой.
Цішыня халоднаю рукой
Атуляе грудзі нерухома.
Ноч, нібы замкнёная скарбонка,
Нематою топіцца прасцяг.
Каля весніц рыпнула сасёнка.
Хутка — ранак.
Хутка — дня працяг.

БЕЛЫ БЕРАГ

Дрогкай хвалі шаўковы шолах
Запрашае ў блакітны рай.
Белы бераг —
Краіна голых.
Белы бераг —
Янтарны край.
Белы бераг —
Краіна роўнасці.
Тут вяртаемся хоць на міг
Ад уяўнасці, ад умоўнасці,
Як дамоў, да сябе саміх.
Адчуваеш сваю падсуднасць
Перад морам — жыхар зямлі.

Тут не толькі мускулы, —
Сутнасць,
Як на споведзі, агалі.
Не ранячы гордай годнасці,
Мора просіць тваёй рукі.
Пакажыцеся ў першароднасці —
Прэч акрасы і парыкі!
Тут і дужыя, тут і кволыя
Пабраталіся сапраўды.
Каралі і прэм'еры — голыя! —
Перад шумнай уладай вады.
Хвалі падаюць, мякка сцелючы
Зіхатлівыя дываны.
Скіньце ўборы фальшывай велічы,
Скіньце смела мундзір маны!
Акуніцеся, дакраніцеся
Да бунтарнасці трапяткой,
І заб'ецца ў вас, як у віцязя,
Грыва вечнасці пад рукой.

* * *

Раптам чырвоным
Зялёнае стане —
І хвалявання
Схаваць я не ў стане.

Свеціцца, свеціцца клён
Ля аконца:
Чорная ножка —
Алае сонца.

Дом мой асветлены
Дзіўнай лампадаю.
Лісце іскрынкамі
Падае, падае.

Перад заходам
Святла свайго столькі

Ты аддаеш
Да апошняе долькі.

Клён, не згарай,
Пасвяці мне хоць трошку:
Сонца чырвонае —
Чорная ножка.

* * *

Трывогу журавы дарма
Трубілі — надрывалі глоткі.
Ступіўшы на зямлю, зіма
Застала ўсіх знянацку ўсё-ткі.
І паскараецца штодня,—
Як подых тысяч хваляванняў,
Паспешлівая сумятня
Запозненых прыгатаванняў.
Хаця дарогі не відно,
Таропка цягне, як ні цяжка,
Саломіну, як бервяно,
У мурашыны дом мурашка.
У натапыраным галлі
Асіплы вецер стогне глуха.
І белы світэр для зямлі
У спешцы вяжа завіруха.

* * *

Ужо туман заслону тчэ —
Завешвае зары акрасу.
А нам здаецца, што яшчэ
Да ночы гэтак многа часу.
І, пазіраючы з акна,

Мы добрую надзею спелім,
Што ўсё-ткі сёння дацямна
З галоўным справіцца паспеем.
Святла, мой дзень, не выключай.
Мы споўнім тое, што мяркуем,
Пакінем поўначы адчай.
Дасеем. Дойдзем. Дабрукуем.
І злучым мостам берагі
Ракі — вірлівай перашкоды
І аддадзім сябрам даўгі,
Якія так гнятуць заўсёды.
І таямніцы ўсіх глыбінь
Мы назавём уласным імем,
Сваіх лятункаў далячынь,
Як нарачоную, абдымем.
Ах, як туман заслону тчэ —
Завешвае зары акрасу...
А нам здаецца, што яшчэ
Да ночы гэтак многа часу.

* * *

Дзе сэнс маёй прысутнасці,
Падсуднасці ў жыцці?
Павінен я да сутнасці,
Да ісціны дайсці.
Свідруе думка суткамі —
Не там,
Не там,
Не там.
Трывожна сэрца стукае,
Шалее, як тамтам.
Ах, што там пад паверхняю,
Якая глыбіня?
Груваскімі паверхамі
Маўклівая браня.
Чаго вам, хлопцы, ў пошуку,
Чаго, чаго, чаго?

Ці пошуму ці пошчаку
Ад пошуку свайго?
Датупаю, дастукаю,
А тэрмін праміне,
Гукну:
— Сябры з наступнага,
Пазычце часу мне!

* * *

Перад тым
Як у мора бязмежнае выйсці,
Раку пачалі
Сумленні грызці,
Ахапіла
Шчымлівае пачуццё:
А ці так працякло
Жыццё?
Можа, буяніла ўвесну замнога,
Выходзячы з рамак улоння зямнога?
Там, дзе гушчар наступаў купчасты,
Шукала
Высечанага прагала.
Можа, віляла занадта часта,
Дарогі прамой пазбягала?
З крутога абрыву
Адчайна і смела
Кідацца ўніз галавой
Умела...
Наперадзе вір калышацца чорны,
Не ўспомніць ніяк, да яго ідучы,
Якія судны,
Якія чоўны
Несла на пругкім сваім плячы.

* * *

Пружыніць яшчэ хада,
І стома яшчэ не валіць.
І нават бяда не бяда,
Што лаюць часцей, чым хваляць.
Яшчэ я на ўліку людзей,
І нешта яшчэ важыць
Скарбонка маіх надзей
І спадзяванняў вашых.
А ці не моташна вам
Ад адыёзнага пошчаку,
Калі пры жыцці фіміям
Кураць, нібы нябожчыку?
Шалее літаўраў медзь:
Ты думаеш,
                    апяваюць,
Не могучы зразумець,
Што гэта цябе адпяваюць...
Не вешаю галаву.
Хай іншыя славу сядлаюць,
Я ведаю:
              я жыву,
Пакуль мяне хваляць і лаюць.

БАЛАДА ПРА ЛЯСНОЕ РЭХА

Не разлучаўся цар Вядзьмар
З драўлянаю аховай.
Любіў ён скаланаць гушчар
Прамовай выбуховай.
Ляцелі словы, як з трубы,
Гулі, як рой асіны.
Каменна слухалі дубы,
І трэсліся асіны.
Каціўся громам грозны бас.
І — прыкрая пацеха —
Яго нязменна кожны раз
Перакрыўляла рэха.

Ці не двайнік дражніў цара?
І гэта падабенства
Угневанага Ведзьмара
Прыводзіла ў шаленства.
І раптам ён патрос наўзгад
Сваёй чупрыны стрэху,
Лесавікам аддаў загад:
— Схапіць у момант рэха!
Звязаць, крамольнае, і рот
Заткнуць яму навекі,
Каб не дрыжаў лясны народ
Ад звонкай небяспекі!..
І ад зары і да зары
Вядзьмарскія служакі
Па непралазным гушчары
Снавалі, як вужакі.
І вось ужо лесавікі
Дакладваюць старанна,
Што рэха ўзята на штыкі
І смерцю пакарана.
Шчаслівы цар загаварыў
Баском нечалавечым,
Не ў сілах свой стрымаць парыў
Перад драўляным вечам:
— Таму, хто выканаў загад,
Узнагарода будзе!
Я прышпіліць героям рад
Дубовы ліст на грудзі...
Пачаў Вядзьмар чытаць указ
Лесавікам на ўцеху...
А воддаль грымнула ў адказ
Вясёлым шротам рэха.

* * *

Я жыву на граніцы —
На граніцы вёскі і горада,
Травы і бетону,
Цішы і грому...

Яшчэ шумяць
(Нібыта ў ракавінах мора!)
Ссечаныя сосны
У слыху тых,
Што іх саджалі тут.
Дзяцел,
Прыняўшы за дрэва жывое
Слуп,
Таропка застукаў:
— Тук-тук!..
На тэлеграфнай станцыі
Перапалох:
Не могуць расшыфраваць
Птушыную радыёграму.
Аўтобус на ўскраі зямлі
Апісвае крута дугу,
Яшчэ адзін паварот руля —
І выслізне
З-пад колаў Зямля...
Я жыву на граніцы.

* * *

Здаецца, вычарпаў сябе:
Па-вераснёўскаму парожні,
Нясу я ў стоенай журбе
Запыленае поле пожні.
І там, дзе сціх калоссяў шум,
Аголенае наваколле
Натоўпам вызваленых дум
Цяпер тапырыцца і коле.
І холадам спалох кране,
Што восень подыхам адзіным
Наглуха мне душу замкне
Ключом дрыготным жураўліным.
Лістоў паржаўленую медзь
На золкі дол раняюць кроны,
І карканнем сваім адпець
Мяне збіраюцца вароны.

І ім утораць груганы —
Крумкочуць блізка-блізка дзесьці,
Жалобнай рамкаю маны
Мяне спяшаюцца абвесці.
І хай цяжкая галава,
Употай уздыхну з палёгкай,
Як аратай пасля жніва
Перад сяўбою недалёкай.

ДУНАЙСКІЯ РУСАЛКІ

Рака, якая яднае,
Грызе граніту цвярдыні.
Выходзяць на бераг Дуная
Русалкі ў спаднічках міні.
Бяруць у палон жаночы.
Укралі іх круглыя плечы
Пукатасць зямлі, а вочы
У неба — бяздонне сінечы.
Паглядам кране такая —
Чарамі тайны акропіць,
І прорва вады трапяткая
Няўмольна цябе падхопіць.
Самага дужага, мабыць,
Не абміне небяспечнасць,
Русалка ў раку завабіць
І панясе ў вечнасць.
Гэта рака гайдае,
Гэта рака забірае,—
Такая маладая,
Такая, як свет, старая.
Д'ябал і бог у хаўрусе —
У вуснах мядовых — чарэшнях.
І я, бязбожнік, малюся
На гэтых красунь грэшных.
І нават святы апостал,
Што з фрэскі глядзеў посна,
З каменя раптам саскочыў,

Адчуўшы пагляд дзявочы...
І кідаюцца безвач,
Быццам у рай немагчымы,
Услед за русалкамі ў бездань
Апосталы і мужчыны.

* * *

Дзверы зачынены, як граніца.
Дом, зазірнуць у цябе дазволь.
У кожнага ключа — свая таямніца,
У кожнага ключа — свой пароль.
Хоць і на выгляд вельмі падобныя,
Але сваё бяруць без чаргі:
Адзін — гарбінкай на носе дробнаю,
Маленькай зазубрынкаю — другі...
Ломіцца хтосьці ў дзверы дрогка,
Цісне свінцовым цяжарам пляча,
А каб адкрыліся дзверы лёгка,
Патрэбен адзін паварот ключа.

* * *

Адчуем у грудзях біццё —
І задаём сабе загадку,
І ўжо гатовы ўсё жыццё
Перакрамсаць, пачаць з пачатку.

Але нікуды не падзенем
Той праўды горкай, той бяды,
Што мудрасць сталасці заўжды
Да нас прыходзіць са спазненнем.

А ці не ў тым, а ці не ў тым
Мы спасцігаем сэнс высокі,

Што да вяршынь кіруем крокі
На ўздыме цяжкім і крутым?

Вясновым днём на сад зірні,
Святлом пялёсткавым убраны:
Красуюць кроны ў вышыні,
А карані зямлёй схаваны.

Калі ты ў вечнасці ў гасцях,
Твой лёс — узлёт напятай хвалі.
Пачатак твой — заўжды працяг
Сябе і тых, што тут бывалі.

УДАЧА

Падалі ў бездань масты
Юнацкіх маіх разлікаў.
Чаму не прыходзіла ты,
Калі я цябе клікаў,
Калі я цябе чакаў,
Як любую на спатканне
Чакае юнак, рукаў
Цярэбячы ад хвалявання...
Як цяжка перамагчы
Чакання прыгнёт немагчымы.
Удачы, да нас ідучы,
Позняцца, як жанчыны.
А можа, на ўздыме крутым
Множачы нашы мукі,
Нас яны грэюць тым,
Што не даюцца ў рукі?
Спаліўшы ў душы трапяткой
Сваёй нецярплівасці порах,
Я ўжо махнуў рукой...
А ты — поруч!
Узятыя рубяжы
Я азіраю з журбою:
Удача мая, скажы,
Што мне рабіць з табою?

* * *

Што робяць у Ялце?
Купаюцца і загараюць.
Сноўдаюць па асфальце —
Падэшвы свае здзіраюць.

Куды падзецца людзям
З вызваленымі рукамі?
— Працавікі —
мы будзем
Часовымі лайдакамі...

Едуць збываць змору,
Глыток свабоды зведаць.
Едуць па сонца і мора,
І па каханне едуць.

Да вечнага хвалявання
Хочацца дакрануцца.
У бездань, стаіўшы дыханне,
Хочацца акунуцца.

Тых,
хто ад спёкі смягне
І ачышчэння прагне,
Мора ў трымценні дымкі
Прымае ў свае абдымкі.

І ні ўгавор,
ні змова
Не папярэдзяць фініш...
Цябе я пакіну, мора,
Ды ты ўжо мяне не пакінеш.

Я прыкладу на світанні
Ракавіну да вуха —
І зноўку тваё ракатанне
Пачуецца дрогка і глуха.

* * *

Таполям абсеклі рукі
І кажуць,
 што так і трэба.
Счарнелых галін абрубкі
У роспачы кратаюць неба.

Дрэва да дрэва туліцца,
Прагнучы цёплага дотыку,
Стоячы ў тлуме на вуліцы,
Як на прыём да доктара.

А тыя, што верхаводзяць
Іх тапалінай дзяржаваю,
Поруч цікуючы,
 ходзяць,
Точаць нажы іржавыя.

Сваё рамяство узносяць,
Як новы рубеж навукі,
Майстры падсякаць ногі,
Майстры выкручваць рукі.

Прарочую іх аксіёму
Пачуеш у кожным зацішку,
Нібы ўсяму жывому
Сніцца салдацкая стрыжка.

— Перагінай палку —
І спыніш галін хістанне.
Калі абламаеш змалку,
Дрэвам сапраўдным стане...

Таполям абсеклі рукі
І кажуць,
 што так і трэба.
Счарнелых галін абрубкі
У роспачы грозяць небу.

* * *

Выплавіць хацелі з медзі золата,
Зерне мары нецярплівай...
Дзе яно?
Жорнамі стагоддзяў перамолата,
Ветрам часу па зямлі развеяна.

Я гукаю
З болем чалавечым:
Вы не там, алхімікі,
Шукалі...
Апяразаных сярэднявеччам,
Вас не мары —
Сцежкі ашукалі.

Адкрываю вам свае падлікі:
Залатымі стануць рэчы тыя,
Да якіх,
як самы цуд вялікі,
Дакрануцца
Рукі залатыя.

* * *

Мы ўдваіх. Разгойданая лесвіца.
Узыходзім. Шоргат крокаў. Цень.
Ты — маёй паэзіі равесніца.
Вусны вуснам кажуць: — Добры дзень!

Лямпачкі насценныя адключаны.
Цемрыва, бяздомных прытулі,
Благаславі раптоўныя заручыны
Дня і ночы, неба і зямлі.

Дзверы, нібы камеры, зачынены.
Пад замком утульнасць і спакой.
Зыркаюць на нас з замочнай шчыліны
Зрэнкі бессаромнасці людской.

Нават дуб з рабінай ажаніліся
На вясельным скрыжаванні рэк.
І спаткацца толькі мы спазніліся —
Усяго на чалавечы век.

Узыходзім лесвіцаю стромкаю.
Стоены трымаюся ў журбе
За руку тваю, як за саломінку...
Як жыццё пражыў я без цябе!

* * *

Было —
Гуло.
Было —
Сплыло
На крыгах шумнаю ракою.
Як мы хацелі пад крыло
Выратавальнага спакою!
Вучыліся яго цаніць,
Схаваўшыся ў скляпы і нішы...
Паслухай зараз,
                    як звініць
Струна маёй напятай цішы.
У ёй —
Асіны посвіст куль,
Ваўчыны хрып шалёнай міны,
І енк параненых,—
Пакуль
Не абрываюцца ўспаміны.
...Лагодна пляскае вясло
Па гладзі хваль закалыханых.
І тое,
      што даўно было,
Гайдае лодку закаханых.

* * *

Вер ты мне аднаму —
Я цябе люблю!
Я цябе абдыму,
Цеплынёй атулю...
Што маўчыш у чаканні ты?
Як у боскім эдэме жыві
У далонях маёй дабраты,
У далонях маёй любві.
Хіба знойдзеш утульней кут,
Дзе так хораша быць удваіх?
Я пазбаўлю цябе ад пакут,
Ад турбот —
                    ад тваіх і маіх.
Занясу апаўночы ў сон,
Пацалункам на золку збуджу.
Я на вуліцы,
                    як парасон,
Уратую цябе ад дажджу.
Захіну ад залётных вятроў,
Засланю ад чужых вачэй,
І ад ворагаў, і ад сяброў...
Хіба мала? Заходзь хутчэй!
Ах, упартая пташка мая,
І куды толькі пырхнула ты?
Трапяткімі рукамі я
Абдымаю прастор пусты.

* * *

А спачатку была трава —
Па калені табе і мне.
І ад сена гула галава
У драўляным глухім гумне.
І калі раставала ноч,
Праз адтуліны, што ў сцяне,
Сонца кратала тысячай воч
Бессаромна цябе і мяне.
Хоць бяжы ад сябе саміх —

Так палохала нас святло.
Век травы — чалавечы міг.
Белым снегам зямлю замяло.
Як адолець мне снежны прастор?
Ах, сумёты — вяршыні гор —
Як пакласці, пакуль жыву,
Вас падушкамі пад галаву?
Паміж намі — зімою
Снягі.
Паміж намі — вясною
Снягі,
Паміж намі і ўлетку
Снягі,
Паміж намі і ўвосень
Снягі.
Дзе вы, росныя мурагі?
Дзе вы, сена стагі?

* * *

Росы на травы выпалі,
На вуснах агонь гаркавы
Ад ночы, якую мы выпілі,
Як кубак чорнай кавы.

У локанах змрок за спіною,
Ад воч трапяткіх світае.
Ступаеш поруч са мною,
Грэшная і святая.

Пясок пад нагамі, як порах.
Чаму нам насустрач выйшлі
У белых вясельных уборах,
За рукі пабраўшыся, вішні?

Чаму сярод зорных гронак,
Што ў рэчку зляцелі з кручы,
Як абручальны пярсцёнак,
Трымціць маладзік бліскучы?

У ранак, у свет жаночы
Сваіх дарагіх і любых
Пяшчотна выводзім з ночы,
Нібы з палацаў шлюбаў.

* * *

Як лёгка ты ідзеш па вуліцы
У плацці,
Пашытым з шаўковага воблака
І ганарыстасці,
Нібы робячы ласку
Зямлі
Кожным дотыкам басаножкі —
Пругкага дырыжабліка...
Як лёгка ты ідзеш,
Такая
Паветрана недасяжная,
Што нават свавольнік вецер,
Крануўшы плацце тваё,
Пашытае з воблака і ганарыстасці,
Напалохана
Сігануў у хмызняк...
Як лёгка ты ідзеш,
Схаваўшы ў маленькую сумку
Адну нецярплівую думку:
Дзе ж ён, той адзіны на зямлі,
Хто дапаможа табе
Зняць
Немагчымы гэты цяжар,
Пашыты з шаўковага воблака
І ганарыстасці?

* * *

Хвалю я подзвігі твае —
Адбіўшыся ў памытым люстры,
Якія скокі выдае
З табой на пару венік шустры.
Такі балет, што ахне свет.
І грацыёзна, і пявуча
Выконвае свой піруэт,
Па шыбе ходзячы, ануча.
Каго, скажыце, не кране
Вясёлае свавольства кія,
Што робіць рухі трапяткія,
Танцуючы па дыване...
З дзвярэй, і вокан, і паліц,
Што ўраз засвецяцца люстрана,
Зірне твой позірк, як з экрана,
Агнём гарэзных бліскавіц.
Усюды звонка паўстае
Стыхіі ачышчальнай хваля,—
Дзе пальцы бегаюць твае,
Нібы па клавішах раяля.
Хіба рука твая не ў тым
Свой сэнс адкрые таямнічы,
Што верне рэчам зноў абліччы,
Каб ззялі бляскам залатым?

* * *

Ты стаіш на рагу
Пад гадзіннікам вежавым
І няньчыш букет,
Спавіты газетай.
Сустракаюцца і разыходзяцца
Стрэлкі на цыферблаце
І чэрцяць свой адвечны круг.
Парачкі, абнімаючыся нецярпліва,
Спяшаюцца ў ноч —
У зацемнены дом свабоды.
Адзін галаvасты ліхтар —

8 Зак. 2167

Начны намеснік сонца —
Цябе заўважае
І трымае ў сваім гарызонце.
Вагаюцца тысячы ліхтароў —
Тысячы гарызонтаў.
А ты чакаеш.
Ён павінен прыйсці!
Некаторыя ж на спатканне
прыходзяць
Са спазненнем на чвэрць стагоддзя,
Вяртаючыся з вайны...
А букет белагаловы,
Які ты цярпліва няньчыш,
Мае ўжо трыццаць хвілін
Сіроцкага стажу.

ВЕЛАСІПЕД

Сыну Святаславу

Не вынаходзіў, а купіў яго —
Двухколага рамізніка свайго...
Цяпер націсну толькі на педаль —
Мяне, як пана, панясеш удаль.

Вядома, ты ракеце не раўня,
Ды пада мною крудішся штодня.
Бяры разгон, рабі свае кругі,
Веласіпед, я твой паверх другі!

Цябе за руль, нібы за рог быка,
Трымаю, каб не даў ты драпака.
Насі мяне, пакуль я не аслаб,
Мой паслухмяны і маўклівы раб.

Хай пазірае з зайздрасцю сусед,
Як гойсае мяне веласіпед...
Увесь вялізны кантынент двара
Я скалясіў — і ўжо дамоў пара.

Чарга і мне адчуць тваю вагу:
Я, гаспадар, цябе, майго слугу,
З натугай узваліўшы на руку,
На свой паверх апошні валаку.

* * *

Я, дапытлівае хлапчаня,
Ніяк зразумець не магу
Цудаў люстэрка:
Як усё-ткі ўмяшчаецца
У такім маленькім шкельцы
Мой двайнік?
І я круціў-вярцеў
Люстэрка,
Пакуль яно не выслізнула з пальцаў
І не разляцелася ўшчэнт,
І з кожнага асколка,
Нібы дражнячы,
На мяне пазіраў
Мой двайнік —
Паказваў язык...
А маці ў дадатак
Свавольніка
Адлупцавала.
Такою была
Плата
За прагу пазнання.

* * *

Як мару лепшую сваю,
З якою расстаюся зараз,
Я маладым перадаю
Рамантыкі ружовы парус.
Запрэжаны, нібы гняды,

Без паэтычнае аздобы
Я валаку свае гады,
Свае турботы і хваробы.
І неба тое, што калісь
Душу акрыленую стала
У зорную гукала высь,
Над галавою столлю стала.
І вецер той, з якім даўно
Мы бегалі наперагонкі,
Ускочыць раптам праз акно,
Адкрытае рукою жонкі.
І ўжо — мацней, вятрыска, дзьмі —
Трапечуць парусы, не шторы.
Я пераймаю зноў грудзьмі
Уздыбленай стыхіі штормы.
...Кручуся ў хатнім коле я,
Няўмольным, як абдымкі кобры.
Бывай, рамантыка мая!
Мая рамантыка, дзень добры...

* * *

Выратавальны круг
Пальцы шукаюць дарма.
Быў у мяне друг —
Друга ў мяне няма.
Палацаў паветраных друз
Чарнее ў рэчцы на дне.
Быў у мяне друг —
Друга няма ў мяне.
Воўчым выццём завірух
Вясну памінае зіма.
Быў у мяне друг —
Друга ў мяне няма.
Калі феерверк патух,
Бяда запаліла святло.
Быў у мяне друг...
А можа, яго не было?

* * *

Нам заўсёды даюцца ў знакі
Выклік ворана, карканне ворага.
...Не адказвай на брэх сабакі,
Калі цябе кліча ворыва.

Запражы свой парыў гарачы,
Загасі ваяўнічасці полымя.
...Не адказвай на брэх сабачы,
Калі цябе кліча поліва.

Перавяслам праменні звязвай,
Абдымаючы сноп цярпліва.
...На выццё сабак не адказвай,
Калі цябе кліча жніва.

ПРА СВЯТА

Святкуем ўсё часцей
Мы розныя дні ўрачыста:
Дзень абароны дзяцей,
Дзень спорту і Дзень чэкіста...
Планета — людскі інтэрнат,
Рад за тваіх жыхароў я:
У ліку чырвоных дат
Адзначан і Дзень здароўя.
Ажно гудзе ў галаве —
Грыміць пад фанфары ўрачыстыя
Вокліч:
— Няхай жыве
На свеце паветра чыстае!
Лозунгі,
　　　　　слаўце жэньшэнь
Ды малако кароўе!
Як гэта мала — дзень...
Дайце мне век здароўя!

ТАПОР

Тапор у руцэ зух.
Ён знае сваю справу.
Злева ў яго — абух.
І вастрыё — справа.
Калі ён ідзе ў гушчары,
Дранцвеюць дубы нерухома,
Асіны дрыжаць знутры:
Па кім секане, невядома...
Тапор атупеў, пастарэў,
Тапор адстаў ад прагрэсу —
З-за лесу не бачыць дрэў,
З-за дрэў не бачыць лесу.
Прагрэсу наперарэз
Робіць узмах рэзкі:
Калі сякуць лес,
Маўляў, ляцяць трэскі...
Ён ведае «грук» ды «трах» —
Тапорная мудрасць такая.
Затое наводзіць страх.
Затое абсякае.
Гуляе гаспадаром,
Сваё правіла славіць:
Высечаш тапаром,
Пяром ужо не паправіць.
Гакае: — Так!
Бух!
Бярэ страшэнна глыбока.
З аднаго боку — абух.
Лязо — з другога боку.

ПУДЗІЛА

З кудлатаю аправай пудзеля,
Гародняй публіцы вядомаю,
Узносіцца над градкай пудзіла,
Напакаванае саломаю.
Захутана — хоць спёка млявая —

У пашматаную ватоўку.
Трымае з грознаю паставаю
Крывы кіёк, нібы вінтоўку.
Яго каробка чарапная,
Набітая мякінай туга,
Варушыцца, як завадная,—
Каб трапятала ўся акруга!
Ляцяць узбоч адсюль, выдатна
Адчуўшы межы забароны,
Усе шпакі — на стрэл гарматны
І крышачку бліжэй — вароны.
Здаля даследуюць старанна
Сваім птушыным звонкім родам
Апруцянелага тырана,
Што валадарыць над гародам.
Бразготкамі нагрудных бляхаў
Яго шкляное вока ўсцешана.
Ах, колькі бляхаў,
Колькі страхаў
На гэта пудзіла навешана.
Надзьмуты ветразямі штонікі
Широкія — не ў лад з эпохаю,—
Надзетыя на дроцік тоненькі...
Але галоўнае — палохае!

ОДА ЕВЕ

Як жа не пакланіцца
За твой першародны грэх!
Вялікае таямніцы
Ты раскусіла арэх.
Без боязі боскага гневу
Адолеўшы райскі плот,
Адважна сарвала з дрэва
Той забаронены плод...
Ты мужнасці нас навучыла.
Пайшла ахвярна ты
У бога перад вачыма
На грэх, як на подзвіг святы.

Працягваецца, на шчасце,
У свеце людская сям'я.
Бо ў сэрцах маіх сучасніц —
Гарачая кроў твая!
І сёння спакус багіні,
Якіх натхніла ты,
З выклікам носяць міні,
Як фігавыя лісты.
Усё чалавецтва Ева
Вядзе па сваім шляху,
Хвала табе, каралева
Цнатлівасці і граху!

ДЫМ

Папярос агнявыя джальцы
Абуджаюць імгненны ўздым.
Прабіваючыся праз пальцы,
Сіняй змейкай віецца дым.
Ад п'янлівага тлуму ў застоллі
Сэрцы соладка растаюць:
І, пружынячы дрогка,
да столі
Змейкі кольцамі дастаюць.
Нібы куля ў ствале, нямею,
Удыхаючы з'едлівы чад:
Смокчуць змеі,
табачныя змеі
Вішні вуснаў і грудзі дзяўчат.
Не распушчана маладымі
Жоўкнуць твары і пачуццё.
Вочы ў дыме.
І думкі ў дыме.
Думы ў дыме. У дыме жыццё.
Як жа зараз прызнацца цяжка
Мне самому сабе цішком:
Пацалунак з табой —
як зацяжка
Папяросным крутым дымком.

Ты адольваеш небяспеку,
Каб не тыцкалі модніцы ўсе.
— Бач, адстала, адстала ад веку —
Тытунём ад яе не нясе...
I не ў сіле ўтаймоўваць злосці,
Грымну раптам у цішыні:
— Пойдзем з дыму! Да сонца ў госці!
Да паветра і чысціні...
Ці не лепей даверыцца квецені,
Зорнай свежасці і траве?
Каб ты пахла суніцаю, вецер
Плацце дыму з цябе сарве...
Я малюся, каб позірк дзявочы
Цыгарэтным агнём не згас...
Не пускайце нам дым у вочы,
I без дыму мы любім вас!

* * *

На спадарожнікаў побыту
Можам абапірацца:
Робаты,
Робаты,
Робаты
Нам памагаюць у працы.

Робат праводзь між рыфаў
Лайнер у час урагана.
Робат, падкінь рыфму,
Каб загучала арганна.

Гарласта крычыць афіша:
Ах, навіна якая!
Трапеча гросмайстар Фішар —
Робат на бой выклікае.

Ты робіш поспехі, робат —
Мой электронны лёкай.
Красой аздабляючы побыт,
Як ты зайшоў далёка!

Захоплены ўласнай сілаю
Ды кемлівасцю гарэзнаю,
Спрабуеш маю мілую
Схапіць у абдымкі жалезныя.

Акрэсліўшы абавязкі,
Стварыў я цябе для работы,
А ты захацеў ласкі,
А ты захацеў пяшчоты.

Споўняць рукой крутою
Робаты з норавам простым
Тое, што просім, і тое,
Чаго мы ў іх не просім.

Ганю з галавы стому —
На сэрцы каціны скробат...

Ды што мне думаць самому —
Няхай думае робат.

Дбаючы разам з векам
Аб электронным цудзе,
Памятай —
чалавекам
Ніхто за цябе не будзе.

* * *

Нашто з гарматы біць па вераб'ю?
Хай слых кранае гукавая гама —
Хвалю я ўсю птушыную сям'ю,
Дзе верабей чырыкае таксама.

Другім пярнатым падаюць руку,
Салоўку славяць, голуба галубяць,
Будуюць дом, каб падарыць шпаку,
І толькі вераб'я ніхто не любіць.

А я гляджу з любоўю кагадзе,
Як скача ён з гарэзным спрытам хвата,
Крупінкі хлеба ў голуба крадзе —
Лянівага і сытага сабрата.

Свавольніку малому, як і я,
Аддаць і вы належнае павінны.
Не адбірайце хлеба ў вераб'я —
Падданага паветранай краіны!..

БЛАЗЕН

Чаму святла не тушаць?
Чакання сверб, як ток.
За горла смага душыць:
Хутчэй — маны глыток!..
І —
      нецярплівы пошум
Вяслуе па радах.
І барабаніць пошчак
У зіхатлівы дах.
Рыўком, як шок, паспешным
Заслону торг ды торг.
Каму выходзіць першым,
Вядуць апошні торг.
Пакуль вачмі аблазім
Па ўсіх кутках,
У цэнтр арэны блазен
Выходзіць на руках.
Далоў на сметнік драму!
Да д'ябла праўды соль!
Камедыянт праграму
Вядзе, нібы кароль.
Паставы выгінастыя,
Чыгунныя ілбы...
Хвала табе, дынастыя
Хадульнае хады!
І выбухне фугаскай
Грымотнае «ура»,

Свішчы, вішчы і пляскай,
Вітай валадара.
Далоні, быццам рублікі,
Парукай кругавой:
На трон любімец публікі
Сядае галавой.
Кумір — метровы вырадак,
Кладоўкай цудаў — рот...
Ах, тут усё навыварат,
Усё — наадварот.
Замкнёнымі радамі
Кругі, кругі, кругі...
Ад радасці рыдаем,
Рагочам ад тугі.

* * *

Нечаканасць якая:
Адарвалася галава
Ад постаці,
Яна звысоку глядзіць
На ногі,
Якія заўжды на зямлі,
На рукі,
Што ў клопаце вечным,
На плечы,
Якія згінаюцца
Пад ношай турбот штодзённых...
Нечаканасць якая:
Адарвалася галава;
Цяпер яна сама па сабе...
Ногі,
Рукі
І плечы
Набылі незалежнасць
Ад галавы...
Ногі
Гудуць ад футбольнага пала,
Б'юць каму папала;

Рукі,
Сціскаючыся ў кулакі.
Дорaць баксёрскія сінякі,—
Бяруць на сябе
Плечы
Цяжар нечалавечы,
Адтуль,
Дзе рукі не жнуць і не косяць,
Выносяць, выносяць, выносяць...
І хтосьці ўжо бухае ў звон трывогі —
Хіба не чуеце вы? —
Плечы, рукі і ногі
Набылі незалежнасць ад галавы!..
Усе ў разгубленасці нямеюць.
Тут бы
Прыдумаць нешта, дарэчы,
Толькі думаць не ўмеюць
Ногі,
Рукі
І плечы.

* * *

У гэтай ношы —
яблыкі, і хлеб,
і малако, і перац, і цукеркі...
У гэтай ношы —
слодыч пацалунка
і келіх смутку,
што цярпліва п'еш
пасля расстання...
У гэтай ношы —
успамін палынны
аб горы,
смак якога на губах
пячэ дасюль.
Аб дыме
ад галавешак роднае сялібы,
якія тлеюць у душы дасюль.

У гэтай ношы —
май, і лістапад,
і снежань, што па пояс у сумётах,
і дождж, і град —
у падкаваных ботах.
І зеляніна першае травы,
і бель парошы,
якой прыпудраны зямля і вы —
У гэтай ношы...
Яна то абуджае, нібы кава,
то спавівае пеляной імжы.
Калі стамлюся, папрашу ласкава,
гукну лагодна:
— Сыне, памажы!

* * *

І я стаяў на галаве,
І я хлапечымі рукамі
Хадзіў па ранішняй траве —
Амаль метровымі рыўкамі.

Прастуючы па дзірване,
У тым шукаў я суцяшэння,
Каб нехта, ўбачыўшы мяне,
Уголас ахаў ад здзіўлення.

Я сёння зноў на ногі стаў,
Адчуўшы востры дотык шчасця.
Чаму ж спяшаўся без падстаў
Зямлю ў сваіх падэшваў красці?

А ўсё ж, відаць, у нейкі міг
Зрабіць такую стойку трэба,
Каб месцамі ў вачах тваіх
Мяняліся зямля і неба...

Свой добры цуд нясе гульня,
Парыў буянства непаўторны,

Калі і дол і вышыня
Табе, чараўніку, пакорны.

І ты свавольніка не лай,
Калі пабачыш, як падлетак
На галаве ідзе — няхай
Ён да пары паходзіць гэтак.

* * *

Вітаюся з табою
На адлегласці,
Паціскаючы не руку,
А тэлефонную трубку.
Цалуюся з табой
На слове,
Якое адчайна вянчае
Паштоўкі мае.
Пацалункі мае папяровыя —
Папяровыя ружы.
Якія не пахнуць.
Ты ад мяне далёка,
Як зямля,
Якую адчуць не магу
На дотык,
Бо на яе гвалтоўна
Надзелі
Кашулю з бетону...
Мы гэтак далёка
З табою зайшлі,
Што на зямлі
Шукаю зямлі,
Хоць з векам маторным
Ужо не расстацца,
А трэба вяртацца...
Калодзеж, дай мне
Дзённых зор вядзерца:
Вяртаюся да рук,
Вяртаюся да губ,
Вяртаюся да сэрца.

СМАГА

І я тут быў. І я таксама піў
З той невычэрпнай і чароўнай чашы,
Дзе ўцехі ўсе і ўсе нягоды нашы...
А смагу ў гэтай чашы не ўтапіў.
Няўтольная, яна нідзе-нідзе
І сну мне, і спакою не давала.
Здаралася,
                    цякло па барадзе,
Але і ў рот часамі пападала.
І перш як упушчу з рукі біклагу,
Наступнік мой —
                              шчаслівы чалавек,
Я перадам табе не скарб,
                                        а смагу,
Якой хапіла б мне яшчэ на век.

* * *

Нашто ва ўсю трубу трубіць
Аб тым, як іншых судзіш строга.
Ты хочаш свет перарабіць?
Дык пачынай з сябе самога!

З кніг
«ПЕРШЫ СЛЕД»
«ВЯТРАМ НАСУСТРАЧ»
«ВЕЧНЫ АГОНЬ»

(1950—1954), (1955—1957), (1958—1960)

КАБ ЗБЫЛІСЯ СНЫ

Спіць
Пад снежнай коўдраю палетак,
Сніць,
Напэўна,
                залатое лета:
Карагод бясконцы каласоў,
Небасхіл бясхмарны,
                                сінь лясоў,
А з будынка дальняга,
                                з-за лесу,
Далятае гулкі стук жалеза;
Там куюць нястомна кавалі,
Каб збыліся сны маёй зямлі.

ГАМОНЯЦЬ КАЛОССІ

Гамоняць калоссі,
Шугаючы хвалямі,
З блакітнымі высямі,
З сінімі далямі.

Нясу я вітанне
Ураджаям нябачаным,

І зімам, і вёснам,
І лету гарачаму.

Пагляну —
І плуг той на міг уваскрэсне,
Што ўвосень тут межы
Навек перакрэсліў.

Прыгадваю зерне,
Што з сеялак новых
У глебу лілося,
Як дождкык вясновы.

Каб рунь,
На марозе не стынучы,
Спала,
Зіма яе пухам сваім
Пакрывала.

Каб жыта
Гаючай набралася сілы,
Вясной яго
Хмарка
Дажджамі паіла.
Улетку
Праменнае шчодрае сонца
Дарыла святло сваё
Нівам бясконца.

Ад ранку да вечара
Сонца глядзела,
Каб жыта
Бурштынавым зернем
Паўнела.

То ўстане высока,
То схіліцца нізка,
Як маці
Над роднай дзіцячай калыскай.
А ветрык
Духмянаю свежасцю дыша,
Як нянька старанная,
Ніву калыша...

Гамоняць калоссі,
Шугаючы хвалямі,
З блакітнымі высямі,
З сінімі далямі.

ЛЕТА

Сонца на ніву
Глядзіць і глядзіць,
Яно разгарэлася гэтак,
Што нават не хоча на міг адпачыць:
У нас — гарачае лета!
Зазыўна шумяць
Каласы з вецярком,
І поўніцца гулам палетак;
Камбайнер спацелы
Сядзіць за рулём:
У нас — працавітае лета.
Мігцяць за жняяркай касынкі дзяўчат.
Красуюць узорамі кветак,
І следам — снапы залацістыя ў рад:
У нас — ураджайнае лета.
А піянеры
Старанна ў мяшкі
Збіраюць на ржышчы густым каласкі,
І сэрцы іх
Шчасцем сагрэты:
У нас — шчаслівае лета.
Машына са збожжам
Гасцінцам бяжыць —
І лісце сустрэчных бяроз аж дрыжыць,
І вецер разносіць над светам:
У нас — зайздроснае лета.
І рапарты
Перадае тэлефон
Ад ранку да позняе ночы ў раён
Па правадах
З сельсавета:
У нас — багатае лета!

НЕЗАБЫЎНЫ РАНАК

Я помню,
Ранкам грукат незнаёмы
Збудзіў мяне, малога хлапчука.
І я ў адной кашулі выбег з дому —
Валіла ўсё сяло да бальшака
Аселіцаю скошанаю, полем,
Разлогамі калючых мокрых траў.
А холад рос абпальваў ногі болем,
Якога я тады не адчуваў.

На бальшаку
Праз гоман шматгалосы
Пачуў я словы аднаго з байцоў:
— Цяпер ужо не будзеш, хлопча, босы
Хадзіць у час асенніх халадоў.

Пакуль жыву, той дзень я помніць буду,
Што рукі двух братоў навек злучыў.
Пакуль жыву, той дзень я не забуду,
Які мяне і ўвесь мой край збудзіў.

ДОМ

Яшчэ пустыр не абуджалі гукі,
Яшчэ маторы кранаў не гулі —
А ты ўжо рос. Цябе ўзнімалі рукі
Майстроў ва ўсіх кутках маёй зямлі.

Там,
Дзе ў мартэнах ярасна шугала,
Нібы віхура, полымя метала;
Там,
Дзе ў бары ўгрызалася піла
Ў тугі камель сасновага ствала;
Там,
Дзе ў пячах абпальвалася цэгла,
Якая зараз шчыльна ў сцены легла,—

Ты нараджаўся, дом, у добры час
I з чарцяжоў ужо глядзеў на нас.
...З дзвярэй тваіх сцяжынкі выбягаюць
I разыходзяцца ва ўсе бакі
Па нашым родным па бязмежным краі,
Дзе ўсе майстры,
Дзе ўсе будаўнікі.

ШКОЛА

Дзесь грымнуў стрэл...
I ў бліндажы сваім
Заціх салдат,
Снарадам пахаваны...
Прайшлі гады.
Цяпер на пляцы тым
Шматпавярховы дом пабудаваны.

I воклічы, і шум з акон чутны,
Разносіцца
Дзяцей вясёлы гоман.
Смяротны жах знішчальнае вайны
Па кнігах толькі многім з іх знаёмы.

Малы хлапчук у новы сшытак свой
Запісвае стараннаю рукою:
«Змяркальнаю, сцюдзёнаю парой
Замоўк салдат, заснуў на полі бою...»

Будынка гмах,
што тут узняўся ўвысь,
На ўласныя прыняў гвардзеец плечы:
На гэтым месцы ён упаў калісь,
Каб у падмурак будучыні легчы.

ДАЛЁКА АД НЁМАНА ЦІСА

Далёка, далёка
Ад сіняга Нёмана Ціса...
Паток яе мутны шырока
У нізіне разліўся.

Гляджу я на хвалі,
Што з шумам бягуць несціхана.
Нясуць на сабе яны ў далі
Плытоў караваны.
А далі —
                не ў шэрым тумане:
Яны прад вачамі
Рачнымі плацінамі стануць,
Засвецяць агнямі...

Вось гэткія ж думы
Мяне і тады хвалявалі,
Калі пазіраў я, задумны,
На Нёмана хвалі.

І зараз я, пэўна б, забыўся,
Што я ў Закарпацці у горным,
І ўбачыў бы, пэўна, не Цісу,
А Нёман свой зорны,

Каб толькі не гэтыя воды,
Пакрытыя пенай,
Каб толькі не горы,
                                што воддаль
Паўсталі, як сцены;
І каб не трэмбітныя гукі,
Якія няспынна,
Калышучы лісце на буках,
Плывуць у нізіну.

СУСТРЭЧА З БРАТАМ

Я к вам прыехаў, горы і даліны,
Як госць да самай блізкае радні.
Застаўся тут ваеннаю часінай
Мой родны брат
На энскай вышыні.
Яго ўзялі любоўна закарпатцы
На мармурную белую пліту.
У касцы,
У паходнай плашч-палатцы
І дзень і ноч стаіць ён на пасту.
Стаіць з геройскай зоркай залатою...
І да яго з гурбой таварышоў
Я сцежкай узбіраюся крутою,
Якую ён пад кулямі прайшоў.
А там, унізе,—
Шыр палёў вясновых,
Рады зялёных вінаградных лоз,
Якім мой брат у дні вайны суровай
Сваёй рукой жыццё і мір прынёс.
Я прад героем галаву схіляю,
Са мной — сябры:
Паклон табе, мой брат! —
Ад гэтага квітнеючага краю
І ад далёкіх гродзенскіх прысад.
А ён рукой нас прывітаць не можа:
Трымае зброю воіна рука,
Бо чуе ён
За морам брэх варожы
І палец не адводзіць ад курка.

НА ГРАНІЦЫ З РУМЫНІЯЙ

Не вал і не рубеж, умацаваны
Бетоннаю ці каменнай сцяной,—
А стужка парыжэлага паркана
Уецца па-над Цісаю-ракой.

На тым баку па цаліне вясновай
Ідуць выдатнай маркі трактары.
Закрэслівае межы плуг сталёвы,
А з межамі — гаротны дзень стары.
Плывуць барозны ў даль ад пералеску
І зараўноўваюць акоп былы,
З якога некалі фашысты Антанеску
Нацэльвалі гарматныя ствалы.

Сваім гудзеннем трактарны матор
Шум пагранічнай Цісы заглушае.
Я слухаю і ўсёй душой вітаю
Свежаўзаранае зямлі прастор.

САНАТОРЫЙ

Ля возера,
На дне даліны,
Свой шпіль узняўшы аж да зор,
Палац, спавіты зелянінай,
Стаіць, нібы вяршыня гор.

Сюды курортнікі з паўсвета
І ўлетку едуць і ўзіму.
Была ж калісь вяршыня гэта
Даступна графу аднаму.

Маўчаць Карпаты задумённа,
На схілах слухаюць лясы
Не ўздыхі графаў ці баронаў,
А моў братэрскіх галасы,

Якія тут, ля горных высяў,
У гэтай дальняй старане,
У песню дружную спляліся,
Што несціхана ўдаль імкне.

У БУКАВЫХ ЛЯСАХ

У букавых лясах
Стаіць нямая ціша:
Не чуцен птушак спеў і вецярок не дыша.

Ступі — і пад нагой
Зашэпчуць скаргу лісці,
Што восень іх страсла з галін на дол калісьці.

А дрэвы тут ствалы ўзнялі да гэткіх высяў,
Што вецці з сінявой нябеснаю спляліся.
Нам добры цень дае
З ліствы шацёр бясконцы.
Ён толькі дзе-нідзе прышыт праменнем сонца.

У букавых лясах
Стаіць нямая ціша,
Мы пах гаючы п'ём —
Лясным паветрам дышам.
І хоць вачам маім усё тут незнаёма,
А дыхаць лёгка так,
Як у бацькоўскім доме.

З ДУМКАЙ АБ ТАБЕ

Выйду жыта жаць і адчуваю,
Быццам нехта мне дапамагае.
Адпачыць прылягу ўвечар дома —
Мроіцца мне воблік твой знаёмы...
Я жыву заўжды адной табою,
Нават думкай аб табе сагрэт.
Але ўсё ж няпраўда, што сабою
Ты мне заслапіла цэлы свет.
Можа, як ніхто, нідзе, ніколі
Чую я, калі з табой іду,
Над ракою кожны шорах голля,
Што глядзіцца ў ясную ваду.
Хмарыцца,

А ў нас перад вачыма
Паўстаюць такія далячыні,
Што, расшыты зорамі,
Яны
Толькі закаханаму відны.
З думкай аб табе, што сэрцу міла,
Мне лягчэй пракладваць плугам след.
Цаліну ўздымаць...
Не засланіла,
А адкрыла ты мне цэлы свет!

Я І ТЫ

Я і ты. Ды лісцяў шум лагодны...
Каб цябе, вясна мая, знайсці,
Трэба мне было агні, і воды,
І драты калючыя прайсці.
У дарогу камандзіравала
Нас тады няўмольная вайна,
І камандзіроўку адзначала
Мне на целе кулямі яна.
Можа, сотні раз на полі бою
Падаў, ды не ўпаў я назусім.
Зноўку, узнімаемы табою,
Я вяртаўся ў строй, к сябрам сваім.
І таму мне так бясконца родны
Гэты вечар, што пяе кругом,
Маладзік і лісцяў шум лагодны
Над тваім расчыненым акном.

ЗАБЛУДЗІЛАСЯ СЦЕЖКА

Мо таму, што плыў вячэрні морак
І хаваўся ў веццях кучаравых,
Мо таму, што не свяцілі зоры,—
Сцежка заблудзілася у травах.

І пакуль яна сабе блукае,
І пятляе, і шукае выйсця,
Хлопец і дзяўчына маладая
На бальшак ніяк не могуць выйсці.
Памаўчаць хвіліну, пагавораць,
Пастаяць — ды зноўку два-тры крокі;
А ўгары даўно ўжо свецяць зоры
І святлее небакрай далёкі...
Ад світальных росаў гнуцца лісці,
Каласы схіляе долу збожжа,
Ну, а сцежка ўсё шукае выйсця
І ніяк яго знайсці не можа.

ЯК РОЙ, СНЯЖЫНКІ

Як рой, сняжынкі кружацца, лятаюць
І на яе гарачых вуснах таюць...
Ўдваіх ідзём мы. Цішыня над намі.
Я ёй усхвалявана гавару,
Як я люблю свой горад вечарамі
У зімнюю, марозную пару.
Я гавару... А ў памяці яе
Вясна ў сяле далёкім паўстае.
...У цвеце сад — краса вясновай вёскі.
Бялеюць не сняжынкі, а пялёсткі,
І падаюць на бераг ручая,
Дзе, заглушыўшы ціхіх вод усплёскі,
Ёй першае «люблю» сказаў не я.

МАЯ ПЕСНЯ

Сама ты не прыходзіш да мяне,
Цябе штодзень я па радку збіраю,—
Там, дзе праходзіць плуг па цаліне,
Там, дзе жняярка у жытах нырае.

Там, дзе дваіх світанне застае,
Дзе салавей рассыпаў спеў срабрысты.
Бясконцыя сааўтары мае —
Садоўнікі, прарабы, трактарысты.

Без вас не змог бы пець і дыхаць я.
Вы гэтым вершам шлях у свет адкрылі.
Вам прывітанне песня шле мая,
Якой далі вы для палёту крыллі.

З ВЯРШЫНЬ КАЎКАЗА

Спавіты горы сіняй павалокай
Снег на вяршынях. І на нейкі міг
Здалося мне — я ў Індыі далёкай,
А не сярод Каўказскіх гор сівых.

Ды раптам скалыхнулася узлессе —
Прарэзваючы ранішні туман,
Данеслася ка мне з даліны песня —
Знаёмая,
Пра нашых партызан.

Я ўбачыў праз радзеючую дымку
Той край, дзе па-над Нёманам-ракой
Ідуць бярозы з соснамі ў абдымку
Зялёнаю, шумлівай талакой;

Той край, дзе калыханку мне спявалі
Галінамі дрымотныя бары,
Дзе час майго дзяцінства саграванлі
Начныя партызанскія кастры;

Дзе быў лясны гушчар маёй калыскай...
З вяршынь Каўказа, як ніколі, я
Такою роднай і такою блізкай
Цябе убачыў, Беларусь мая!

НА ДАЛЁКІМ ПАЎСТАНКУ

Паравоз пракрычаў і заціх,
І ў вялізным людскім карагодзе
Незнаёмка твая знікла ўміг,
Ад якой ты вачэй не адводзіў.

З тваім позіркам позірк яе
Першы раз сустракаўся сягоння,
А ўжо мары і думкі твае
Паляцелі за ёю ў пагоню.

Ты зайздросціш праезджым усім,
Шлях жа твой —
у зваротным напрамку.
Мо навек ты са шчасцем сваім
Размінуўся на гэтым паўстанку?

Дождж халодны па твары сячэ,
Але ты ўсё не сходзіш з перона,
Бо ўдалі не згубіўся яшчэ
Аганёк за апошнім вагонам.

МАЁ МАЛЕНСТВА

З'яўляешся ты часам прада мною,
Але не звонкім смехам хлапчука,
А ўсхліпамі трубы берасцяное
І плачам пастуховага ражка.
Загонам, што цягнуўся каля гаю,
Нагадваўшы сабою шнур вузкі,
І стужкаю шырокаю, якая
Вяла з бацькоўскай хаты ў батракі;
Лучынкай, што вячэрняю парою
Мне на падручнік кідала святло...
Маё дзяцінства, як сцяной, мяжою
Ад сонца адгароджана было.

СВЯТЛО

Запаліць святло патрэбна ў хаце:
Цені наваколле спавілі,
Пасылае да суседа маці
Хлапчука з бляшанкай па вуглі.
І з вуглёў агонь мы выдзьмувалі,
Нібы ў нейкі старажытны час,
Бо запалкі і не начавалі
На закураным камінку ў нас.
Браў старэйшы брат працёрты томік
Пра усходніх дарагіх братоў,
І святлела ўраз не толькі ў доме,
А і на душы у хлапчукоў.
Той агонь не гасне прад вачыма,
Хоць ужо нямала дзён прайшло.
Змалку нас само жыццё вучыла,
Як нялёгка здабываць святло.

УСКРАІНА

Я да цябе, ускраіна, калісь
Прыходзіў што ні дзень з будаўнікамі.
Звінела кельма, і няспынна ўвысь
Расла сцяна цаглянымі радкамі.
Я адчуваў, як пад маёй рукой
Будынак светлы распрамляе плечы.
І ты пераставала быць глухой
Ад кожнай нашай новае сустрэчы.
Паўсталі гмахаў стройныя рады,
Фабрычны комін неба падпірае...
З завулка вырас горад малады,
Які мяне гудкамі сустракае.
І хоць у мур кладзе рука мая
Цагліны не на вуліцы цэнтральнай,—
Ды сцежка, па якой ступаю я,
Становіцца
Дарогай магістральнай.

ЯБЛЫНЯ

Пасадзіў калісьці на світанку
Яблыньку малую каля ганку.
— Хай расце.

Працаваць мне хмара памагала —
Клапатліва глебу палівала.
— Хай расце.

Я і сонца ў зімнюю часінку
Саграналі кволую сцяблінку.
— Хай расце.

Хутка я з кватэры пераеду.
А ўраджай знімаць майму суседу.
— Хай расце.

Пэўна, недзе ля другога дому
Садзіць дрэўца друг мой незнаёмы...
— Хай расце.

У СТРАІ

Даліны, пералескі і узгоркі
Вітаюць шчыра кожны крок байца.
Ад пылу пасівелі гімнасцёркі,
А шляху не прадбачыцца канца.

Мурожныя лугі, жыты густыя
Навокал перад зрокам паўстаюць.
Застылі сосны, быццам вартавыя,—
Маўкліва чэсць салдатам аддаюць.

Напэўна, ўжо твае самлелі б ногі,
Калі б адзін ты столькі вёрст прайшоў.
Напэўна, ўжо зваліўся б ад знямогі,
Каб поруч не было таварышоў.

Хай спёка ўлетку, хай мяцель зімою,
Не стомішся ў дарозе ні на міг,
Пакуль сваёй салдацкаю рукою
Ты адчуваеш цвёрды локаць іх.

НА ГОРНЫМ СХІЛЕ

Пасля вялікай і цяжкой дарогі,
Што абвіла мо сотні горных скал,
Калі самлець ужо гатовы ногі,
Якой здаецца радасцю прывал!
У засені, пад веццямі густымі,
Што засланілі ўвесь блакіт сабой,
Пазвоньваючы флягамі пустымі,
Прысаджваемся шумнаю гурбой.
Выходзіць з хаты юная гуцулка,
З вадою збан яна падносіць нам.
Чаму ў мяне так сэрца б'ецца гулка,
Я разабрацца не магу і сам.
Яна мне ў флягу срэбра налівае.
Як жар, гарыць яе квяцісты ўбор.
Усёй душой юнацкай адчуваю
Я ў гэты міг красу Карпацкіх гор...
Нямала дзён, як прамінула лета,
Але ўспаміны ўсё жывуць аб ім.
Як я хацеў бы зноў стаміцца гэтак
І адпачыць на горным схіле тым!

* * *

Не трэба зацішных сцяжын для мяне —
Няхай сушыць вецер на мне гімнасцёрку.
На гэтай дарозе, што ўдалеч імкне,
Хай будуць даліны, хай будуць пагоркі.
Хай сонца змяняецца хмарай густой...

Дарога ж іншая мне не патрэбна.
Стаміўшыся толькі
на сцежцы крутой,
Магу адпачыць
на вяршыні паднебнай.

СЦЯГ ПАЛКА

Прад урачыстым строем сцяг палка
Нясе салдат — яшчэ зусім юнак.
Сто раз самлець гатова ўжо рука,
Ды пальцаў не расшчэміць ён, аднак.

Суцішыўшы дыханне нездарма,
Глядзяць салдаты,
Стаўшыя ў рады,—
Усе, хто ёсць,
І ўсе, каго няма,—
Хто затаіў дыханне назаўжды.

У ПАХОД

І крыллі згорнуты ў палатцы,
І на драўляны ложак мой
Лісты пажоўклыя лажацца,
Каб адпачыць на ім зімой.
А мой спачын далёка недзе —
За многа вёрст,
за многа дзён.
Трубач трывожным клічам медзі
У строй збірае батальён.
Схапіў мяне за плечы ранец,
Уссеў, як хлопчык, на спіне.
Бягу — спрачаюся з вятрамі,
І ўсё бяжыць насустрач мне.

9 Зак. 2167

Не, не ад ранца прыліпае
Кашуля да плячэй маіх.
Сягоння цэлы свет, я знаю,
Абапіраецца на іх.

БОР

Зусім як у маленстве...
Лес з грыбамі,
Што з-пад зямлі прабіліся гарбамі.
Не бор,
А хор:
Ты толькі слова скажаш —
І стогалоссем ён табе адкажа.
Тут ціш,
Якая сярод хвой задумных
Схавалася ад магістраляў шумных.
А мы ідзём у гэтакім уборы.
Што не прыкмеціш паміж шатаў бору.
Мы не бяром грыбоў, бо рукі ў нас заняты.
Не кошыкі трымаем — аўтаматы.
Не можам мы спыніцца, каб навокал
Зірнуць прыветным улюбёным вокам...
І ўсё-ткі не ў маленстве, а сягоння,
З сябрамі поплеч ідучы ў страю,
Убачыў я, мой добры друг зялёны,
Усю красу тваю!

У МІРНЫМ СУСЕДСТВЕ

Дымна сягоння
На палігоне.
Крычаць
Гарматы.
Маўчаць
Салдаты.

Усё афарбована ў колер зялёны.
І неба, і травы, і нашы пагоны,
І дым, і нават гармата сама.
Як быццам і фарбаў іншых няма!
Дрыжаць у суседніх бярозак вецці:
Грукат, напэўна, палохае іх.
А я ў хвіліну гэту на свеце
Не ўяўляю гукаў другіх.
Спакой мы пакінулі нівам і хатам,
Забыліся ж самі пра ўласны спакой.
Здаецца, што я нарадзіўся салдатам
І стаў адразу ў паходны строй.
А службу закончу —
не пройдзе і года,
І ўсё гэта сном прыгадаецца мне,
Калі ў навальнічную часам пагоду
Маланка па небе нажом скрабане.
На палігоне пахне порахам,
А ў полі —
водарам спелых зярнят.
Побач з ціхім жытнёвым шорахам —
У мірным суседстве гамонка гармат.

НЕЗНАЁМЫЯ СЯБРЫ

Усюды месца для прывалу,
Калі ты ўжо не чуеш ног.
З дарогі рухнеш дзе папала
На першы ўзгорак, на мурог.
Мы з дружбаком замест пасцелі
Пад бок паслалі шынялі,
Ляжым, прыліпшы потным целам
Да мокрай восеньскай зямлі.
І раптам голас над палямі,
Як напамін, гучыць здаля...
І мы адчулі, што пад намі,—
Як лёд, халодная зямля...
Мы азірнуліся міжвольна
Удвух — таварыш мой і я.

Узбоч дарогі сцежкай польнай
Ішла спяшаючы жняя.
Стаім маўкліва ля дарогі,
Глядзім услед жанчыне той.
А ранак сыпле ёй пад ногі
Расінкі жменяй залатой.
І хочацца глядзець да стомы
На гэты край, дзе ты не госць,
На свет, дзе столькі незнаёмых
Ў цябе сяброў усюды ёсць.

КАБ ЧЫСТЫМ БЫЛО НЕБА

Ноч палоскамі святла — расколата,
Быццам нехта дужы з сілай волата
Венікам махае прамяністым,
Каб было начное неба чыстым.
Паглядзіш — і ў памяці паўстане
Ненарокам той мінулы час,
Калі неба і агнём, і сталлю
Рушылася з грукатам на нас.
Праз гады пачуецца, як рэха,
Плач малой дзяўчынкі, што дарма
Клікала сваю матулю ехаць —
Дзе нябёс няма...
Хоць начная цемра мной расколата,
Не падобны я зусім на волата...
Б'е святлом пражэктар мой.
Юнак я просты,
Да таго ж і невялікі ростам.
Я мячом махаю прамяністым,—
Каб было начное неба чыстым
І ні дзецям, і ні ўнукам нашым
Не здавалася ніколі страшным.

НА ПРЫВАЛЕ

Калі ішоў, не адчуваў ён стомы,
Здавалася, ісці бясконца мог,
А лёг, дык дзіўна стала і самому:
Паварушыць не ў сіле ўласных ног.
Расінкі поту з твару штохвілінна
Спіраў рукой нябачнай вецярок.
Заснуў салдат.
І што яму пярына?
Ён цэлы ўзгорак палажыў пад бок.

З ВЫПАДКУ СВЯТА

На стале віно з выпадку свята,
І гасцей змяшчае ледзьве хата.
Толькі, дружа, твой бакал пусты.
Гарнітур, які нядаўна ты
На палучку першую прыпас,
Спісаны на тры гады ў запас.
Тры гады ні ўвечар і ні ў ранне
Ты не выйдзеш к любай на спатканне.
Ты пакінуў дом, сяброў па школе,
Ты —
Каб закаханыя жылі
Без разлук, пасля якіх ніколі
Не бывае стрэчы на зямлі...
Пільна я прыглядваюся ў далі
І не зводжу зроку ні на міг
З тых, што столькі радасцей укралі
У мяне і ў дружбакоў маіх.
І пакуль з-за мора — брэх шалёны,
Не здыму я з плеч сваіх пагоны.
І сягоння я
З выпадку свята
Не спяшу прылегчы адпачыць,
Я прачышчу ствол у аўтамата —
Хай блішчыць!

У ВАГОНЕ

Дождж вясенні несціхана лье,
Кроплямі на шкле аконным скача,
У вагоне гучна хлопчык плача
І заснуць суседзям не дае.
Суцяшае маці штохвілінна
Двухгадовага грамадзяніна
І на пасажыраў, што навокал,
Пазірае вінаватым вокам.
Люба мне глядзець на клопат матчын:
Недзе дома і ў мяне сям'я,
Сын, які мяне ў жыцці не бачыў,
Гэтак, як яго не бачыў я.
І рукой салдацкай, агрубелай,
Што прывыкла лашчыць сталь штыка,
Асцярожна і зусім няўмела
Пачынаю гладзіць хлапчука.
І суседзі дзівяцца ў вагоне:
Не ад матчыных пяшчотных рук,
Ад маёй шурпатае далоні
Раптам супімаецца хлапчук.
Мо напомніў я малому бацьку,
Што яму ўяўляўся як праз сон,
Ну, а можа, ў постаці салдацкай
Проста моц адчуў і сілу ён.
І, напэўна, каб не хваля гэта,
Мне было б самому неўздагад,
Колькі ласкі і пяшчоты светлай
У тваёй суровасці, салдат.

ДОМА

Здзіўленымі вочкамі малая
З хатняга закутка паглядае.
Не было ніколі гэтак дома:
Дзверы расчыніліся ў пакой,
І вайсковец нейкі незнаёмы
Туліць маму да грудзей рукой.

Пэўна, роднай, ёй балюча надта:
У вачах заззялі кроплі слёз.
Пэўна, штось нярадаснае ў хату
Гэты чалавек чужы прынёс...
Паглядзела дзеўчынка і гушкаць
У калысцы ляльку пачала,
І на ветлы голас мой: «Дачушка...»
Нават і вачэй не падняла.
Я прывык валодаць аўтаматам,
Бездакорна па мішэнях біць.
Кажуць, што нядрэнным быў салдатам...
Ці ж змагу я добрым бацькам быць?

З МАЛЕНСТВА

Мяне не пускалі на вуліцу з дома —
Да краю акна даставаў я ледзь-ледзь,
І мне, малышу, аж карцела, вядома,
А што там за шыбаю — паглядзець.

З паленняў я ўзводзіў старанна падмосткі,
Каб толькі спазнаць гэты дзіўны сакрэт...
Змяілася ціхая вуліца вёскі,
Сабою увесь замыкаючы свет.

І ўсё. Не, не ўсё...
Каля згорбленай хаткі
Прыгожы палац узнімаецца ўвысь.
Чаму гэта так? —
І не здолеў у таткі
Цікаўны хлапчук дапытацца калісь.

Жыццё я не зблытаю з сонечным ззяннем,
Бо гэтулькі колераў мае яно!
З маленства яно прада мною пытаннем
Паўстала праз яснае тое акно.

КАЛЯІНЫ

Сінеюць дарожныя каляіны,
Зрабіла з іх восень сабе ручаіны.
Якія цяжары калёсы тут неслі,
Каб гэтыя вось каляіны накрэсліць?
Насенне,
Каб поле засеяць старанна?
Салдата,
Які задыхаўся ад раны?
Ці, можа, турыста,
Што ў жніўнае лета
Шукаў для дзяўчыны каханае кветак?
Калі ты ў люстэрка зірнеш і на твары
Убачыш дарожкі маршчынак сваіх,
Згадай да драбніцы,
Якія цяжары,
Якія турботы
Пакінулі іх.

РУЧАЙ

Пакліканы сонцам,
Прабіўся праз снег
І вось пачынае паволі
Разбег.
На выгляд
Яго не адрозніш ад ніткі,
І голас нядужны,
І сам шчэ не пруткі.
Ды раптам
Ён сябра ў дарозе спаткаў.
Сышліся —
Спляліся
У блакітны рукаў.
І ўжо не маленькі ручай,
А рачулка
Бяжыць,
І гурчыць,

І паплёсквае гулка.
Вада ў ёй
Нястрымным патокам
Віруе,
Як свердзел,
Скарынку са снегу
Свідруе.
І стрэчным крычыць
Ганарыста і строга:
— Я ў мора спяшаюся —
Дайце дарогу!

Я ПАСЯЛІЎСЯ Б...

Я пасяліўся б ля Каўказскіх гор,
Каб слухаць век прыбояў морскіх гоман,
Калі б не чуў, як грае родны Нёман
І як шуміць над ім сасновы бор.

НОВЫ ЖЫХАР

З радзільнага дома
З бацькамі ў «Пабедзе»
Ён з крыкам
Па вуліцы горада
Едзе.
Машына гудзе
Урачыста і строга:
Гэй, новаму грамадзяніну —
Дарогу!
Прахожыя ўбок адступаюць міжвольна —
Рассунуўся крышачку свет навакольны.
Зямля ўся абсыпана
Квеценню мая...

Свае чалавек уладанні
Прымае.
Прымае калоны будынкаў бясконцых,
Бясхмарнае неба і яснае сонца,
Ды стромкія сцежкі,
Што ўперадзе недзе...
Ён з крыкам,
Як з дзіўнаю песняю,
Едзе.
Крычыць ён,
Каб мела зямля на прыкмеце,
Што новы жыхар
Пасяляецца ў свеце.

* * *

Пачую, як жаўрук спявае,—
І я хлапчук вясковы зноў.
Мая сцяжынка палявая
Рассоўвае сцяну житоў.

Дзесь бацька плугам рэжа глебу,
Ідзе па свежай баразне.
Нясу яму акраец хлеба
І крыху малака ў збане.

Пясок гарачы, быццам прысак,
Хоць бульбу ты пячы на ім.
На гарызонце хвой абрысы
Трымцяць у марыве сівым.

Свае праменні сонца топіць
У неспакойнай збажыне.
Здаецца, што вось-вось падхопіць
Зялёны акіян мяне.

І забаюкае вятрыска,
Што сціхнуць не дае жытам.
Чакай! Ужо і татка блізка,
Я толькі торбу перадам...

СНЯЖЫНКА

Калі дарога скончыцца мая
І знікну я,
Сняжынкай стану я,
Я аб адным малю,—
Няхай сняжынка тая
Ад цеплыні дзявочых губ растане.

АКНО

Малюсенькае чыстае аконца,
А глянеш з хаты — як дзівосна ў ім
Змяшчаюцца прысады, людзі, сонца,
Што ажно слепіць зрок святлом сваім.

Калі пішу, я дбаю пра адно,—
Каб верш мой быў, як гэтае акно.

* * *

Сваёй тугой не засмучу нікога.
Мой боль — са мной. І я аб ім маўчу.
З сябе цяжкую ношу на другога
Ў дарозе перакладваць не хачу.

А стане сэрцу радасна ізноўку,
Мне хочацца, каб ты была са мной,
Каб перадаць табе, мая сяброўка,
Хаця б іскрынку радасці сваёй.

ПАРАЎНАННЕ

Я думай заняты
З відна да змяркання:
Шукаю, сяброўка,
Табе параўнання.

Цябе велічаў бы я
Яснай заранкай,
Ды ўсім яна дорыць
Цяпло сваё ўранку.

Цябе я назваў бы
Чыстай крыніцай,
Ды кожны, хто хоча,
Ў ёй можа напіцца.

Цябе параўнаў бы я
З польнаю кветкай,
Ды першы сустрэчны
Сарве яе ўлетку...

Усе мае, пэўна, дарэмны
Шуканні,—
На свеце табе не знайсці
Параўнання.

ПІСЬМО

Яно ад часу стала рыжым,
Дзве лініі працёртых дзір
На ім пралеглі ўздоўж і ўшыр,
Прасцерліся няўмольным крыжам.

Я ў немагчымае не веру
І ўсё ж нашу заўжды з сабой
Кавалкі выцвілай паперы
Пісьма, забытага табой.

Здаецца, паспрабуй іх скласці —
І зноў дыхне вясна мая,
І зноў у дзверы грукне шчасце,
Што не ўтрымаў калісьці я.

НЯЎЛОЎНАЕ РЭХА

Гады няўмольна паскараюць бег,
Мільгаюць, быццам кадры на экране.
Зямлю пабеліць і растане снег,
І толькі ў нас на скронях не растане.
Мы не сатрэм яго,— ні ты, ні я...
Чаму ж дасюль павінны мы, як дзеці,
Гуляць з табою ў хованку на свеце,
Друг друга не знаходзячы ніяк?
А помніш, як з табою мы ў бары
Хадзілі ўлетку, каб набраць арэхаў...
Гукала ты ў дрымотным гушчары —
Няўлоўнае гучыць дагэтуль рэха.
З тае пары яго і дні, і ночы
Шукаю ў кожным голасе дзявочым.

БУДУЧАЙ ЖОНЦЫ

Даруй мне, што парушыў этыкет,
Змянілася маё чаканне стомай.
І праз няхітры рупар —
Свой санет —
Я гавару з табою, незнаёмай.

Хоць назавеш сваім, але да рэшты
Мяне ўсяго адна не забярэш ты:
Я частку цеплыні сваёй аддам
Садам
І нерасплаўленым ільдам.

Ты будзеш раўнаваць мяне да кніг,
І да гудкоў, што клічуць у дарогу,
І нават да сумётаў снегавых,
Што затрымаць мяне ў вандроўцы могуць.

Ты слухаеш і моршчышся?
Тады
Лепш будучай застанься назаўжды!

Я НЕ ЗАБЫЎ

Я не забыў той непаўторны час,
Калі спяшаў да любай першы раз
І стукаў потым асцярожна ў шкло,
Каб ад спалоху шчасце не ўцякло.
З тае пары прайшло нямала дзён,
Вяртаюся з дарогі ў позні час
Да родных, да нягаснучых акон,
Куды ўжо стукаў незлічона раз,
Дзе свой і шум, і цішыня свая
І дзе не госць, а муж і бацька я.
І ўсё ж, як падыходжу да дзвярэй,
Заб'ецца сэрца нехаця мацней.
Затоіш подых, насцярожыш слых,
Сябе адчуеш юнаком на міг
І стук такі ж амаль нячутны ў шкло,
А гэта значыць, шчасце не ўцякло.

РОЗДУМ

Няхай штодзень
Кранае ціха скроні,
Нібы зазімак,
Белы холадок,
Ды сэрца па-юначаму і сёння
Стукоча,

Як у краты малаток.
Ні кроплі я не пастарэў з узростам,
Адно смуга перад вачмі растала.
І што было складаным,
Стала простым,
І простае
Складаным раптам стала.
Той час цяпер,
здаецца, за сцяной,
Калі пры самай ветранай пагодзе
Сто раз імя гарэзніцы адной
Каньком выпісваў на бліскучым лёдзе.
І хоць не летуценнямі жыву,
Ды крыл для ўзлёту пазычаць не трэба.
Сягоння я не ў марах, наяву
Магу дастаць для любай зорку з неба.
Я пакланіцца кожнай красцы рад,
Але не так,
як той гарэза хлопча,
Што ў кветнік
Уварвецца, як пірат,
Адну сарве, а паўграды растопча.

ШАХТА
Ў САЛОТВІНЕ

Нібы з крышталю,
Сцены серабрацца,
І ледзь убачыш столь над галавой.
І вабяць зрок падземныя палацы
Сівою шматвяковаю красой.
Але ніколі ў гэтыя харомы
Не прагнулі сяліцца каралі.
Сюды калісь спускаўся люд бяздомны,
Што не знаходзіў месца на зямлі.

МЕЛОДЫЯ

1

Хутчэй, хутчэй!
У поле, за аколіцу.
Наўпрост
Па золкіх росах басанож.
Мурожны луг то сцелецца, то колецца,
І кожная травінка —
Быццам нож.

Стрываю.
Сілы ў ветрыка пазычу я.
І дабягу,
Каб глянуць хоць здаля:
А што за тою рысай таямнічаю,
Дзе змітавана неба і зямля?

З надрэчча цягне сіняй прахалодаю.
На небе ранак
З хмар карункі тчэ.
І я лаўлю
Нячутную мелодыю,
Якая не народжана яшчэ.

2

Скаціўшыся ў раку
Са Шляха Млечнага,
Гарэць агні,
Не гаснучы ў вадзе.
Ідзём удвух сцяжынаю надрэчнаю,
Якая аж за небакрай вядзе.

Ідзём,
І гэтак лёгка нам ступаецца,
Што ледзьве крокі ў цішыні чутны.
І ўжо сцяна прад намі расступаецца
З густой і непраходнай збажыны.

Ды раптам —
Гром у раніцу пагодную.

Але не дождж —
Агонь зямлю сячэ.
І глушыць выбух
Чыстую мелодыю,
Што не паспела загучаць яшчэ.

3

Ні ўдзень ні ўноч
Не ведаем адбою мы.
Хрумсцяць пясчынкі пылу на зубах.
Агонь і дым —
І чорныя прабоіны
Нясуць чужыя танкі на гарбах.

Мы крочым —
І варушыцца пад ботамі,
І вось, здаецца, выслізне з-пад ног
Зямля, нібы клубок,
Які абмотаны
Заблытанымі ніткамі дарог.

Наўкол заскачуць
Дрэвы карагодамі,
Калі мне куля
Грудзі апячэ...
І абарвецца назаўжды мелодыя,
Якая не спявалася яшчэ.

4

І я засну каля вярбы пахілае.
І больш расплюшчыць не змагу вачэй...
Глынуў на ўсіх дарогах
Столькі пылу я,
Што сёння людзям
Дышацца лягчэй.

Пачуўшы гул дарожны,
За аколіцу
Шыбуе хлопчык, топчучы мурог.
І росы не пякуць,
Трава не колецца.

Убок сцяжына
Не бяжыць з-пад ног.

Дыміцца парай
Раніца халодная.
Сінее росны след на мураве.
І ў свеце нараджаецца мелодыя,
Якую ўжо нішто не абарве.

КАЛІ МУДРЫЯ РУКІ Ў ЦЯБЕ

Не ўзыходзіць,
А чэзне і гіне насенне,
Калі кідае сейбіт яго
На каменне.
Гэта знаді стагоддзямі голыя скалы,
І прырода нічога ад іх не чакала.
І фарсілі камённі
Зімой і вясною
Бассаромнай жабрацкай сваёй галізною.
Але толькі мы самі
Не гэткай пароды,
Каб маўкліва глядзець на галечу прыроды.
Калі мудрыя рукі ў цябе —
Пад рукамі
Згубіць цвёрдасць сваю,
Памякчэе і камень.
І на дзіва парода бясплодная ўродзіць.
Цеплыня твая хмелем у гронках забродзіць,
Стане подых твой ветрам,
Які закалыша
У садах вінаградных
Зялёную цішу...
Мы сагрэем планету
Сваімі рукамі,
Каб наступнікам нашым
Паднесці, як дар,
Не зямлю, што хавае за пазухай камень,—
У неўвядальную зелень апрануты шар!

* * *

Самы высокі будынак у свеце
Той, што не ўзведзены,
Самая лепшая сцежка,
Якая няходжана,
Самая смачная вішня,
Якая не з'едзена,
Самае звонкае слова
Яшчэ не народжана —
Вось найвялікшая сіла,
Што сэрцамі рухае.
Ну, а інакш
Амярцвела б у момант жыццё,
Захлынуўшыся скрухаю.

КРОПЛЯ ДАЖДЖУ

Я — дажджавая кропля.
Я лячу.
Я напаіць сабою зямлю хачу.
Хачу ў абдымкі свежай баразны.
Хачу наліцца зернем збажыны.
Бо адчуваю,
Бачу я здаля:
Засмягнула без вільгаці зямля.

Калі ў пустыню траплю я —
Мяне
Уміг пясок няўтольны праглыне.
І хай згару ў пясчаных хвалях я,
Аросіць рунь наступніца мая!

Я — дажджавая кропля.
Я імчу.
Я бруд і смецце змыць з зямлі хачу.
Калі ў мяне адной не хопіць сіл,
Пашле мільёны кропель небасхіл!
Я, дажджавая кропля, грукачу.

Я вас,
Хто дрэмле,
Разбудзіць хачу.
Я патрывожу ваш штодзённы сон,
Нібыта куля,
Стукну ў шкло акон.
І задрыжыць
Ад кропель ваш пакой
І пабяжыць,
Як дэзерцір, спакой.
Няхай усюды чуюць крок дажджу.
Я сэрцы, што заснулі, разбуджу!

МОРА

Навек пахаваўшы ў глыбінях спакой,
Плюскочаш, не знаючы зморы,—
Каменні варочаеш хваляй цяжкой,
Мора.

Якую вялізную ношу ні ўскінь
На плечы табе, непакора,
Нясеш, як пушынку, яе ўдалячынь,
Мора.

Хіба ж толькі сілай магутнае ты? —
Штохвілю змяняеш калёры...
Я ведаю добра твой нораў круты,
Мора.

Ты ласкай умееш прывабіць усіх,
І нават высокія зоры
Спускаюцца ўночы да хваляў тваіх,
Мора.

Ды раптам вятры штармавыя дыхнуць,
Усходзіцца пенай прастора —
Усё ты гатова тады паглынуць,
Мора.

З трывогай гляджу ў непагоду здаля:
Грувасцяцца хвалі, як горы,
І кропкай здаецца мне гмах карабля —
Ў моры.
Ды кропку паставілі людзі... Яе
Ужо не сатрэп і не скорыш!
Іх воля магутней, чым хвалі твае,
Мора.

У ДОЖДЖ

Стаю на схаваным між хвой пагорку.
Нястомна пальцы грэюць аўтамат.
А дождж прашыў
І плашч, і гімнасцёрку,
Прашыў мяне
Ад галавы да пят.
Я не магу схавацца пад страхою,
Хоць за каўнер цурком вада цячэ.
Хоць дождж, нібы стралок на полі бою,
Як з аўтамата,
Па плашчы сячэ...
Ды недзе друг мой
Сушыць плашч ля печы
І ў патранташ
Абойму куль кладзе...
І веру я:
Маёй зямлі на плечы,
Апроч дажджу,
Нічога не ўпадзе.
Рассуну морак сілаю сваёю —
І змоўкне гром,
І знікне ноч,
Як сон.
І я ўзніму над цэлаю зямлёю
Нябёс блакітных вечны парасон.

ПОЖНЯ

Яшчэ сняжком
Зямлю не замяло,
Ды халадком дыхнулі ўжо
Абшары.
Над пожняй хвоя,
Быццам памяло,
Гайдаецца і размятае хмары.

А сонца,
Нахіліўшы галаву,
Ваду ляніва цягне з сотаў пожні,
І сняць лугі ўжо
Новую траву,
І новую лістоту —
Гай парожні.

* * *

Колькі б ты ні калясіў па свеце,
Зноў сюды сцяжынка прывядзе,
Дзе, за рукі ўзяўшыся, як дзеці,
Карагодзяць вольхі па вадзе;
Дзе вятры —
нядрэмныя гарністы —
Раніцою гоняць сон з зямлі;
Дзе рамонкі,
Як парашутысты,
Узбярэжжа рэчкі занялі;
Дзе ўначы,
Пахрумстваючы глуха,
Ліжуць цемру языкі кастра,
Ля якога да світання слухай
Казку пра музыку-гусляра;
Дзе, здаецца, толькі клікні ўголас —
І з глыбінь далёкае пары
Галасамі дружнымі наўкола
Адгукнуцца ўсе твае сябры.

* * *

Пасварымся часам
З-за нейкай драбніцы мы,
Усходзімся,
Нібыта пад навальніцамі.
Павее ў душы ледзяной прахалодаю —
І кожны ўжо болей сабой не валодае.
Зацята глядзім,
Нібы вораг на ворага.
І топчацца ўсё, што нам блізка і дорага.
Блукаем панура з цяжкімі галовамі,
Набітымі рознымі
                грознымі словамі.
Хістаемся,
Нібы пад грузнаю ношаю,
На сцежцы, якой і канца не відно.
Як цяжка нам вымавіць слова харошае,
Лагоднае, добрае слова адно,
Якога абодвум якраз не хапае нам,
Разлучаным словамі,
Сэрцамі спаяным.
Бываюць падобнымі словы да пораху.
Не кідай адразу —
Прыцэлься спярша.
Схавай выбуховае слова
                        на ворага.
А другу хай будзе адкрытай душа!

ГАРЫ, МАЁ СВЯТЛО

Калі я доўга засяджуся дома,
І пасварыцца можам мы, вядома.
Куплю білет у шлях — як індульгенцыю
На ўсё, што нас да лаянкі вяло.
Зірну з трывожным сумам на акенца:
— Гары, дрыготкае святло.
Хай самая найгоршая вандроўка,
Са мною ты — найлепшая сяброўка.

Заблытаўшыся ў снезе, вецер енчыць.
Сумётамі дарогу замяло.
Як мне цяпер патрэбен твой агеньчык!
  — Гары, жаданае святло.
Падумаю — і зашчыміць ад болю:
Маглі ж і размінуцца мы з табою.
Мне сёння свет — вясёлка шматкалёрная.
Я не ўяўлю,
А што б тады было.
Няўжо ён мне здаваўся б толькі чорным?
  — Гары, маё адзінае святло!
Калі з табой скіруемся ў вандроўку,
З якой ужо не вернемся ізноўку,
Нясмела недзе ўвечар грукнуць дзверцы,
Заззяе і пагасне ў вокнах шкло...
А можа, гэта ўспыхнуць нашы сэрцы?
  — Гары, маё святло!

* * *

Пахне раніца парай,
Якая над лугам дыміцца.
Пахне хмарай,
З якой зашуміць навальніца.
Пахне золкай расою,
Якую не выпілі травы;
Пахне вострай касою,
Якая спацела ад справы;
Пахне тупатам ног,
Што спяшаюць да гулкіх дарог;
Пахне шоргатам шын,
Хоць яшчэ і не чутна машын...
Растаюць туманы.
Золак шчодра святло рассыпае.
Пахне раніца поўднем,
Які ўслед за ёй наступае.

ЗМЕСТ

Абсягі сучаснасці. *Прадмова Ул. Гніламёдава* . . 3

З кнігі «Круглы стол»

*** Мае радкі... 13
Адбітак пальцаў 14
Радасць 15
Круглы стол 15
Дарога да зор 16
Пчаліныя соты 17
У лесе 18
Плата 19
*** Зямля, як ад сухотаў, сохла... 20
*** Які цырульнік — сонца... 20
Зямля 21
Паветра 21
Вязні 22
Ля абеліска перамогі 23
Сікейрас 24
Кубінскі танец 25
Плошча Маякоўскага 27
Перад канцэртам 28
Сустрэча з Бахам 29
*** Трэшчына зноў... 30
*** Ад зябкасці золкай... 31
Дом без гаспадара 32
Абутнікі 33
Футбол 34
Хатні рай 35
Салат «Сямейная ідылія» 36
Гімн цвярозасці 37
Жалезны Адам 38
Юбілейнае 38
Сябру-паэту 39
Рабы 40
Бусел 41
Навыперадкі 41

З кнігі «Акно»

*** У пафасным уступе... 43
*** Здаецца, загоены раны... 43
*** Яснасці, яснасці... 44
Дваццаты год 45
Граніца 46
Мой лес 47
*** Поле, поле... 48
Цырк 49
*** Дайце, харэі і ямбы... 49
Ранак, дзень і вечар 50
Рознакаляровы Брэст 51
Родная мова 52
Рахунак 53
Вар'ят і вайна 54
*** Грузчык я... 55
*** Юнацтва туманныя рэбусы... 56
*** А лета не канула... 57
Мера 58
Асеннія барвы 59
Няма часу... 59
*** Кажуць, даволі... 61
Запрашэнне к здароўю 61
Вячэра 62
*** Хвала напятай хвалі... 63
*** Хоць клалі сосны ў зруб... 63
Балгарскія памідоры 64
Да запатрабавання 65
Прыпяць 66
*** Няма на зямлі адзіноты... 67
Акно 67
Афіцыянтка 68
Вірусны грып 69
*** Ад тармазоў — сіпаты, дымны віск... 70
Пенсіянеры 71
Экспанат 72
Пра адзіноту 73
Гульня 74
Маналог акіяна 75
Паланянка 76
Крыло і пяро 77
Малако 78
*** Суседка мая — вуліца... 79
*** Сысці мы паспеем... 80
Вілія 80
*** Берагі ваду бяруць... 81
У дзеда Талаша 82
*** За тыдзень... 83
Нафта 83
*** Адкажы мне... 85
*** Быў у зялёным загсе... 85
*** І я калісь лавіў... 86
*** Ахрысцяць вусны... 87

*** Так праблытаны... 87
*** Чаму ты плойме... 88
*** Хоць у мой зрок... 89
Перагаворы 89
*** Тут мы ўдваіх... 90
Дарожнае 91
Крыніца 92
Пад дажджом 93
*** Якіх адборных зорак... 94
*** Пацеў прафесар... 94
*** Не мне і не табе... 95
*** Тупаў дождж... 96
*** Сам ад цябе... 97
Рукі любых 97
Душ 98
*** Выходзячы ў дарогу... 99
Сябру, які спяшаецца 100
Два кубкі 101
Бот 102
Пра вернасць 102
Антэна 102
Святло і гук 102
Што такое мора 103
Ода горлу 104
Скарга цвіка 105
*** Сцены мембранамі... 105
Зімовы эцюд 106
*** Уваходзяць, як законныя... 107
*** Не кожны ў крытыкі здатны... 108
*** І звяры сябруюць... 108
Бомба 109
Перад пачаткам сеанса 110

З кнігі «Дотык да зямлі»

*** Ёсць словы... 111
Сцягі 112
*** Бацькі дзяцей дамоў гукаюць... 112
Дотык да зямлі 113
Плата за вышыню 114
*** Май прынёс... 115
*** Забіўшы бога... 116
Куля і чалавек 117
*** Да раніцы з дум... 118
Вянок любві народа 119
Абедзенны перапынак 119
*** За буднямі нядзеля... 120
Табе, бацькоўская зямля 121
Яшчэ раз пра зоркі 122
*** Дапамога павінна быць хуткай... 123
*** Я заўжды з асалодай... 123
Піраты 124
*** Перад дажджом... 125
*** Хочацца... 126

*** І раптам снег... 127
Лёс народа — Купала 128
*** Вучылі мяне з маленства... 129
*** У травы... 129
Дрэва 130
*** Прырода і сёння... 131
*** Ты маўчаў... 132
*** Трубілі гучна... 133
Я з вёскі 134
*** Ураджай, ураджай... 134
Працуй, разец святла 135
*** А я па бяду... 136
Выхадны 136
*** Ці многа ў маленстве трэба?.. 137
*** Ракеты і аўтамабілі... 138
Міны 139
Бяроза 140
*** На берагах былінных... 141
*** На вішнях — цвет... 142
*** Мяняю... 143
*** На моры — бура... 143
*** Хаця насення меней... 144
*** Выбачай, што не знаю... 145
*** Ні подыхуналёў... 145
Дом сяброў 146
*** Шуфляда мая... 147
*** Кожная сцежка... 148
*** Прыйшоў я з ночы... 149
*** На зямлі заселеных лясоў... 149
Паветраныя замкі 150
Рамонт 151
Уступ у цырк 152
*** Вышыні нам даюцца... 152
*** Нібыта наўздагон... 153
*** Тут ахнуў бы... 153
*** Чаму ў марудных муках... 154
*** Надыдзе хвіліна важная... 155
*** Баішся, што мяжу... 155
Шторм 156
*** У жонкі — на твары... 156
*** То шоўкам касынак... 157
*** Я думаў, ты мая турбота... 158
*** Давай у гарэзным шаленстве... 158
Вада і бераг 159
Ружа 160
Ваза 160
*** Праходжу штодзень... 161
*** Калі сустракаюцца дзве рукі... 163
*** Размывала адна бяда... 163
*** Аб тым, куды я еду... 164
Двое на беразе 165
*** Без бою я здаю... 165
Наступаюць рэчы 166
Прас 167

Маналог сабакі 167
*** Графін зіхцеў... 168
*** Смакуюць на нюх... 169
Песня заваднога салдаціка 169
Гадзіннік 170
Кумір 171
Пласцінка 172
Як ліса ратавала зайца 173

З кнігі «Поле»

*** Век з рэактыўнай... 174
*** Забіраюць нас... 175
Зялёная антэна 176
Кола 176
*** Мы прагнем... 177
*** Давай не будзем... 178
*** Кастры не вінаваты... 179
Плуг 180
Доля мая жытняя 180
*** Вывучаю замежныя мовы... 181
Гонка 183
*** Адкрывалі мацерыкі... 183
*** Дацягнуцца... 184
Здымкі 185
*** Мы — галіны... 186
Каласы 187
Кастры 187
Адрачэнне Галілея 188
*** Ловяць вушы... 189
Поле 190
Твары 191
Упала слязіна 192
*** Не бойся, што сум... 193
*** Як хораша ступіць... 193
*** Вы адкуль?.. 194
Партызанскі лес 194
*** Бор, як роздум... 195
Голас вечнага хлопчыка 196
*** На спатканне з табой... 197
*** Нас па галовах... 198
Інтэрнат 199
Суткі 200
Цётка 201
Паядынак 202
*** Калі расстаешся... 203
*** Я свой быў спакой... 204
Азбука бегу 204
*** Заслужана ці незаслужана... 205
Адзіны мой доктар 206
На выходзе дня 207
Белы бераг 207
*** Раптам чырвоным... 208
*** Трывогу журавы... 209

*** Ужо туман... 209
*** Дзе сэнс маёй прысутнасці... 210
*** Перад тым як у мора... 211
*** Пружыніць яшчэ хада... 212
Балада пра лясное рэха 212
*** Я жыву на граніцы... 213
*** Здаецца, вычарпаў сябе... 214
Дунайскія русалкі 215
*** Дзверы зачынены... 216
*** Адчуем у грудзях... 216
Удача 217
*** Што робяць у Ялце?.. 218
*** Таполям абсеклі рукі... 219
*** Выплавіць хацелі... 220
*** Мы ўдваіх... 220
*** Было — гуло... 221
*** Вер ты мне... 222
*** А спачатку была трава... 222
*** Росы на травы выпалі... 223
*** Як лёгка ты ідзеш... 224
*** Хвалю я подзвігі твае... 225
*** Ты станеш на рагу... 225
Веласіпед 226
*** Я, дапытлівае хлапчаня... 227
*** Як мару лепшую сваю... 227
*** Выратавальны круг... 228
*** Нам заўсёды... 229
Пра святы 229
Тапор 230
Пудзіла 230
Ода Еве 231
Дым 232
*** На спадарожнікаў побыту... 233
*** Нашто з гарматы... 234
Блазен 235
*** Нечаканасць якая... 236
*** У гэтай ношы... 237
*** І я стаяў... 238
*** Вітаюся з табою... 239
Смага 240
*** Нашто ва ўсю трубу трубіць... 240

З кніг «Першы след», «Вятрам насустрач», «Вечны агонь»

Каб збыліся сны 241
Гамоняць калоссі 241
Лета 243
Незабыўны ранак 244
Дом 244
Школа 245
Далёка ад Нёмана Ціса 246
Сустрэча з братам 247
На граніцы з Румыніяй 247

Санаторый 248
У букавых лясах 249
З думкай аб табе 249
Я і ты 250
Заблудзілася сцежка 250
Як рой, сняжынкі 251
Мая песня 251
З вяршынь Каўказа 252
На далёкім паўстанку 253
Маё маленства 253
Святло 254
Ускраіна 254
Яблыня 255
У страі 255
На горным схіле 256
*** Не трэба зацішных сцяжын... 256
Сцяг палка 257
У паход 257
Бор 258
У мірным суседстве 258
Незнаёмыя сябры 259
Каб чыстым было неба 260
На прывале 261
З выпадку свята 261
У вагоне 262
Дома 262
З маленства 263
Каляіны 264
Ручай 264
Я пасяліўся б... 265
Новы жыхар 265
*** Пачую, як жаўрук спявае... 266
Сняжынка 267
Акно 267
*** Сваёй тугой... 267
Параўнанне 268
Пісьмо 268
Няўлоўнае рэха 269
Будучай жонцы 269
Я не забыў 270
Роздум 270
Шахта ў Салотвіне 271
Мелодыя 272
Калі мудрыя рукі ў цябе 274
*** Самы высокі будынак... 275
Кропля дажджу 275
Мора 276
У дождж 277
Пожня 278
*** Колькі б ты ні калясіў... 278
*** Пасварымся часам... 279
Гары, маё святло 279
*** Пахне раніца парай... 280

Макаль П.

М 15 Выбраныя творы. У 2-х т. Т. 1. Вершы.— Мн.: Маст. літ., 1982.— 287 с., 1 л. партр.

У пер.: 1 р. 80 к.

Пятрусь Макаль — вядомы беларускі паэт і драматург — звыш 30 год актыўна працуе на ніве роднай літаратуры.

Першы том склалі лепшыя вершы з раней выдадзеных зборнікаў паэзіі.

М $\frac{4702120200-108}{М 302(05)2-82}$ 113—82

ББК 84Бел7
Бел2

Петр Михайлович Макаль

Избранные произведения в двух томах

ТОМ 1

Стихи

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»

На белорусском языке



Рэдактар *Р. І. Барадулін.* Мастак *Л. Я. Прагін.* Мастацкі рэдактар *А. І. Труханава.* Тэхнічны рэдактар *Т. М. Сокал.* Карэктар *Т. В. Трубач.*

ІБ № 1417. Здадзена ў набор 02.12. 81. Падп. да друку 28.06.82. АТ 04424. Фармат 84×100$^1/_{32}$. Папера друк. № 1. Гарнітура звычайная новая. Высокі друк. Ум. друк. арк. 14,04+0,1 укл. Ум. фарб.-адб. 15,80. Ул.-выд. арк. 14,37. Тыраж 8000 экз. Зак. 2167. Цана 1 р. 80 к. Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11. Мінскае вытворчае паліграфічнае аб'яднанне імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.